№ 38 (492) 20 кастрычніка 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Зіма будзе вясёлая



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК



# у нумары

## люстра дзён

Павал Красоўскі: «Калі мяне пачалі падазраваць яшчэ ў двух забойствах, я крыху супакоіўся» ... 4
Нявеста Красоўскага: «Адразу пачалі зьбіраць грошы» ... 4
Гэта быў гаспадар ... 5
Нісьцюк хоча стаць Гайдукевічам. Або... ... 6
Уладзімер Нісьцюк: «Хіба Эўропа не прызнае Лукашэнкі»? ... 7
Саюзьнік, горшы за ворага ... 8
Расея скароціць пастаўкі электраэнэргіі ў Беларусь да мінімуму ... 8
Плян выконваецца ... 8
Праляскоўскі ад імя Лукашэнкі: «Гэта добрая царква, і ёй трэба дапамагчы» ... 9
Хроніка ... 14

## камэнтары

Віталь Тарас. Падстава для аптымізму ... 10
Павал Севярынец. Камэндант і страх сьмерці ... 14
Аляксандар Класкоўскі. Шматвежавы Крэмль і шматофісная Эўропа ... 24

## аб усім патроху

Нобэлі–2006 разабралі амэрыканцы й мусульмане .. 16
ААН: Ніякіх больш Byelorussia–ў ... 42
Беларускамоўны Windows: чакайце ў чэрвені ... 42

## левым вокам

Лёлік Ушкін. Як узяць сытуацыю пад жастачайшы кантроль ... 25

**50 РАДКОЎ АД РЭДАКЦЫІ**

# Зіма будзе вясёлая

Ціха-ціха, глуха-глуха ўсё, а такі растуць чаканьні пераменаў.

«Саюзьнік, горшы за ворага» — **старонка 8**. Выцек інфармацыі пра байкот беларускіх тавараў расейскімі дзяржаўнымі падрадчыкамі пацьвярджае, што Расея маніцца ўзімку ўзяць Беларусь за жабры. Гэта азначае фактычны правал ранейшага замежнапалітычнага курсу краіны. Адначасовы эканамічны ціск на розных кірунках можа прывесьці да пагаршэньня сацыяльна-эканамічнай сытуацыі ў Беларусі і росту пратэставых настрояў. У такім разе восеньскае ўзмацненьне рэпрэсій супраць апазыцыі можна патлумачыць жаданьнем запалохаць патэнцыйных лідэраў, здольных узначаліць пратэсты. Гутарка з Паўлам Красоўскім па выхадзе з турмы — **старонка 4**.

Пратэстанты з поўнаэвангельскай царквы «Новае жыцьцё» абвяргаюць стэрэатып, што, маўляў, найлепш ляжаць, не варушыцца і не высоўвацца. Яны пайшлі на прынцып, і зь імі ня ведаюць, што рабіць. **Старонка 9**.

З сэнсацыйным дакладам выступіў намесьнік старшыні БСДП(Г) Уладзімер Нісьцюк на сэмінары Парлямэнцкай асамблеі NATO. Ён прапяяў хвалу Лукашэнку і прапанаваў Захаду плян вываду Беларусі з дыпляматычнай блякады. Нісьцюк хоча стаць Гайдукевічам? Ці гэта лукашэнкаўцы падаюць сыгнал Захаду? Віленская прамова Нісьцюка і камэнтары аўтара да яе — **старонка 7**.

«Час зьмяняе людзей. Рамантыкі становяцца прагматыкамі, баязьліўцы — героямі, сьляпыя становяцца відушчымі. Улюбёныя вучні могуць неаднойчы здрадзіць, а потым даць грунт іншым для выратаваньня душы. Пасьля іх апраўдваюць у апокрыфах. Такое бывае ня толькі ў Эвангельльлі, але і ў жыцьці. Дзе мяжа маральнай прыстойнасьці?» Пра гэта ў эсэ «Кожнаму свая цыбуліна» нагадвае Пётра Садоўскі. **Старонка 34**.

І яшчэ пра перамены.Граждан і Сабака вярнуліся ў «Нашу Ніву». **Старонка 48**.

## Архан Памук у «НН»

Традыцыйна ў першым нумары пасьля абвяшчэньня імя новага Нобэлеўскага ляўрэата ў галіне літаратуры «Наша Ніва» зьмяшчае пераклад зь яго і артыкулы пра яго. У выпадку з турэцкім пісьменьнікам Арханам Памукам гэта першае перастварэньне тэкстаў ляўрэата па-беларуску. Прыемна, што «Нашай Ніве» ў тым не адмовіў выдатны знаўца ўсходніх моваў Сяргей Богдан. Рассмакуйцеся!

### Дашкевіча будуць судзіць 30 кастрычніка

Суд над Зьмітром Дашкевічам пачнецца 30 кастрычніка аб 11-й гадзіне ў судзе Кастрычніцкага раёну Менску. Суд месьціцца ў Доме правасудзьдзя на вуліцы Сямашкі, 33. Праезд аўтобусам 57, тралейбусамі 10, 38, 47. Маці юнакоў, якія праходзілі па «Справе Маладога Фронту» заклікалі ўсіх людзей прыйсьці на суд, каб маральна падтрымаць хлопца.

Рэд.

МЕХ
СЕТКАВЫ
ДЛЯ ГАРОДНІНЫ
т. 669-25-82





У свой час



Эдвард
Вайніловіч

Магдалена
Радзівіл

Васіль Быкаў

# ахвяравалі на «Нашу Ніву»

з пачатку 2006 году
газэта атрымала
7000 ахвяраваньняў
з усіх куткоў Беларусі.
Дзякуй!



# Павал Красоўскі: «Калі мяне пачалі падазраваць яшчэ ў двух забойствах, я трохі супакоіўся»

У нядзелю вечарам зь віцебскага ізалятару часовага ўтрыманьня быў вызвалены Павал Красоўскі. Нягледзячы на стомленасьць, у панядзелак зраніцы Красоўскі адказаў на пытаньні карэспандэнта «НН».

23-гадовы актывіст з Жодзіна ад 4 кастрычніка знаходзіўся за кратамі паводле неймаверных падазрэньняў: у арганізацыі леташніх віцебскіх выбухаў і двух забойстваў непаўналетніх дзяўчынак у 1999 годзе, калі Паўлу было толькі 16 гадоў.

**«Наша Ніва»: Павал, чым праваахоўнікі патлумачылі Ваша вызваленьне пасьля такіх страшных абвінавачаньняў?**

**Павал Красоўскі:** Для мяне гэта застаецца таксама загадкай. Скончыліся дзесяць дзён, якія яны маглі мяне ўтрымліваць за кратамі без называньня абвінавачаньня, далей утрымліваць мяне не маглі. Відавочна, што яны пабаяліся пачынаць супраць мяне працэс. Зь мяне не зьнялі канчаткова падозраньня, я мушу зьяўляцца на допыты, і зь мяне была ўзятая падпіска аб нявыезьдзе. Усіх падрабязнасьцяў сваёй справы я пакуль сам ня маю, бо яшчэ не сустракаўся з адвакатам Паўлам Сапелкам.

**«НН»: Ці было прадчуваньне, што вызваляць?**

**ПК:** Не, не было. Пра вызваленьне з турмы я даведаўся літаральна за некалькі хвілінаў да таго, як выйшаў з брамы ізалятару.

**«НН»: На якіх дакумэнтах грунтавалася абвінавачаньне супраць Вас?**

**ПК:** Адразу пасьля затрыманьня мне сказалі, што мая справа знаходзіцца пад кантролем Лукашэнкі. «Гэта зьвязана з тваёй палітычнай дзейнасьцю», — сказалі мне. Не было абсалютна ніякіх доказаў маёй віны. Існавала толькі адна папера, якая сьцьвярджала, што цягам апэратыўна-сьледчай дзейнасьці было высьветлена, што Красоўскі Павал мае дачыненьне да леташніх выбухаў у Віцебску. Быццам у мяне ў Віцебску ёсьць нейкія сувязі, нехта там мяне бачыў. Гэта была адзіная папера, на падставе якой вяліся допыты. Болей у сьледчых нічога не было.

**«НН»: Што адбывалася на допытах?**

**ПК:** Раней пра такое я чытаў толькі ў кніжках, цяпер перажыў гэта на сваёй скуры. Адбываўся жахлівы псыхалягічны ціск. Мяне адкрыта прымушалі прызнацца ў гэтых злачынствах. Тры пытаньні задавалі цягам дзьвюх гадзінаў. Ціск не спыняўся ні на хвіліну. Вытрымаць было вельмі цяжка і няпроста. Бралі нейкія аналізы крыві.

**«НН»: Павал, як рэагавалі Вы на такія абвінавачаньні, якія праваабаронцы тут, на волі, адразу сталі называць абсурднымі?**

**ПК:** Ад пачатку я ня ведаў за што мяне затрымалі, што інкрымінуюць, калі ж даведаўся, што абвінавачваюць у выбухах, што гэта «расстрэльны» артыкул, глеба паціху пачала выплываць у мяне з-пад ног. Я быў у самым сапраўдным шоку. Усё існавала для мяне ў нейкай прастрацыі, у тумане. Было вельмі цяжка, але трэ было трымацца, бо амаль штодзень доўжыліся допыты. На пятыя-шостыя суткі, калі мяне пачалі падазраваць яшчэ ў двух забойствах, я трохі супакоіўся, бо зразумеў, што ніякіх доказаў сьледзтва ня мае, а мяне проста спрабуюць зламіць.

**«НН»: Якімі былі ўмовы ўтрыманьня ў ізалятары?**

**ПК:** Вось крыху прастудзіўся. У камэры было халаднавата. Па падлозе бегалі пацукі. Спалі на драўляных нарах. Камэра разьлічаная на чатыры чалавекі, але звычайна ў ёй было меней людзей. Кармілі раз на дзень а чацьвёртай вечара.

**«НН»: Павал, допыты тычыліся толькі тых справаў, у якіх Вас падазравалі, ці пыталіся і пра іншае?**

**ПК:** Наўпрост пытаньняў пра «Малады фронт» не было, але можна было здагадацца, што тэма іх цікавіць. Неаднаразова пыталіся, ці ведаю я тых ці тых людзей.

**«НН»: За год гэта ня першая спроба прыцягнуць Вас да крымінальнай адказнасьці. Ці не было думкі кінуць грамадзкую дзейнасьць?**

**ПК:** Пра гэта рана казаць, за апошнія дні занадта усяго сабралося. Гэта стане вядома пасьля таго, як я крышачку адыду ад зьняволеньня.

**«НН»: Ці ёсьць пэўнасьць, што пасьля вызваленьня Вас пакінуць у спакоі?**

**ПК:** Ня ведаю. Я бачыў, як яны працуюць, якія ў іх мэтады, і быць у нечым упэўненым не выпадае.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

## Нявеста Красоўскага: «Адразу пачалі зьбіраць грошы»

У Паўла Красоўскага хутка мусіць зьявіцца дзіця. Гаворыць Паўлава нявеста Дар'я Пісарэнка:



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«Даведалася пра арышт, калі вярталася зь Менску з вучобы дадому. Спачатку падумала: нічога сур'ёзнага. Паўлюка ж ужо ня раз затрымлівалі. Я ўжо звыклася да такога. Пасьля, калі даведалася, што яго пачалі абвінавачваць у такіх нечалавечых злачынствах, стала страшнавата, але трымалася. Адразу пачалі зьбіраць грошы на перадачу Паўлу, на дарогу да Віцебску. Перажывала. Балазе, усё мінулася».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Павал Красоўскі: Раней пра такое я чытаў толькі ў кніжках.**

# Гэта быў гаспадар

Памяці Яўгена Лугіна.



Памёр Яўген Лугін. Чалавек, афіцэр, патрыёт. Адзін зь першых, хто стаў пад сьцягі дэмакратыі і незалежнасьці ў канцы 80-х. Нават раней, бо яшчэ на службе ў войску марыў пра грамадзтва свабоды і роўнасьці і пісаў праект Канстытуцыі вольнай краіны. За гэта і быў звольнены з войска, бо ня здолеў захаваць свой праект у таямніцы. Ён з радасьцю прыняў вестку аб стварэньні Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне». Быў дэлегатам яго Ўстаноўчага зьезду ў чэрвені 1989 г. А калі сталі ўтварацца партыі, стаў ініцыятарам і лідэрам Сялянскай партыі. Гэта было зусім натуральна, бо зьняўшы пагоны, ён заняўся сельскай гаспадаркай і стварыў адну зь першых у Беларусі прыватных фэрмаў на роднай глускай зямлі.

У ягоным характары палучыліся цьвёрдасьць і ўпартасьць з добразычлівасьцю і памяркоўнасьцю. Ён паклаў шмат сіл, каб аб’яднаць розныя партыі і плыні для супольнай справы. Браў удзел, здаецца, ва ўсіх Кангрэсах дэмсілаў, акрамя апошняга, куды прыйсьці яму перашкодзіла цяжкая хвароба. Бо ім заўсёды кіравала непадробная любоў да Бацькаўшчыны.

Разьвітваючыся з гэтым цудоўным чалавекам і грамадзянінам, пажадаем, каб была яму мяккаю родная беларуская зямля.

**Прафэсар Юры Хадыка**

**Рэдакцыя «НН»**

**смуткуе з нагоды сьмерці беларускага гаспадара, які таксама быў аўтарам нашай газэты — Яўгена Лугіна.**

# Беларуская апазыцыя адзначаная Ўзнагародай імя Сэржыё Віера дэ Мэля

Лідэр аб’яднаных дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч названы ляўрэатам Узнагароды імя Сэржыё Віера дэ Мэля, найвышэйшага камісара ААН па правах чалавека. Узнагарода даецца за дзеяньні на карысьць мірнага суіснаваньня і супрацоўніцтва супольнасьцяў, рэлігій і культур. У Кракаве адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэньня высокай узнагароды.

Мілінкевіч уганараваны за «асабісты ўнёсак у абарону годнасьці чалавека, яго права на свабоду, а таксама ў пабудову структур грамадзянскай супольнасьці і за дзейнасьць у імя разьвіцьця культуры і беларускай мовы», — адзначаецца ў камунікаце Капітулы Ўзнагароды імя Сэржыё Віера дэ Мэля.

Узнагарода ўручаецца ад 2004 года з ініцыятывы Асацыяцыі *Willa Decjusza*. Першым ляўрэатам быў першы прэм’ер посткамуністычнай Польшчы Тадэвуш Мазавецкі.

# Нісьцюк хоча стаць Гайдукевічам. Або...

## Ці гэта лукашэнкаўцы падаюць сыгнал Захаду?

З сэнсацыйным дакладам выступіў намесьнік старшыні БСДП(Г) Уладзімер Нісьцюк на сэмінары Парлямэнцкай асамблеі NATO па Беларусі, які праходзіў 13—14 кастрычніка ў Вільні. Прысутныя пачулі тэкст, нібы зрэдагаваны ў Адміністрацыі прэзыдэнта.

Нісьцюк заявіў: апазыцыя «ня мае падтрымкі ў народу», зь ёй «ня хоча мець справу намэнклятура», яе «разьдзіраюць унутраныя супярэчнасьці». Апазыцыі абы (цытуем) «рэалізоўваць лопаюшчыеся праекты кшталту апошняга: «Мілінкевіч — наш прэзыдэнт». Нам пашэнціла, што ён ім ня стаў, бо за ім — пустата».

Адначасова Нісьцюк не шкадаваў словаў захапленьня кіраўніком Беларусі. «А.Лукашэнка — гэта не Акаеў, ня Кучма, не Шэварднадзэ і нават не Саакашвілі. Гэта — моцны, валявы, самадастатковы і самастойны палітык. (...) Дастатковую вагу гэтаму лідэру прыдаюць нарастаючы эканамічны і палітычны альянс з Кітаем і шматлікімі краінамі Паўднёвага Ўсходу. (...) Сацыяльныя праекты, якія стала рэалізуюцца ці нават проста дэкляруюцца ў краіне, гарантуюць найвышэйшай беларускай уладзе на бліжэйшы час пастаянную падтрымку большасьці жыхароў, прычым ня толькі пэнсіянэраў і інвалідаў, але і пэўнай часткі іншых слаёў грамадзтва: кваліфікаваных рабочых, сярэдніх прадпрымальнікаў, творчай, навуковай і пэдагагічнай інтэлігенцыі. Ён умее дырыжыраваць настроямі лепш за любога постсавецкага лідэра».

З вуснаў Нісьцюка прагучала і звычайная для Лукашэнкі фраза аб тым, што кіраўнік дзяржавы «трымае ў руках заслон Эўропы ад нелегальнай міграцыі», бо праз Беларусь нібыта штогод праходзяць 150—200 тысячаў нелегалаў.

Нісьцюк кажа: галоўнай памылкай апазыцыі апошніх дванаццаці гадоў было «тупое жорсткае супрацьстаяньне ўладам у любых аспэктах». Ён за тое, каб палітыкі пачалі размаўляць з народам на «зразумелай мове, хай гэта нават сумесь беларускай і расейскай». А «падтрымка нацыяналістычнай апазыцыі супярэчыць мэнталітэту беларускай нацыі».

Нісьцюк ня верыць у масавы ўдзел грамадзянаў Беларусі ў палітыцы ў будучыні: «Запэўніваньні асобных прадстаўнікоў апазыцыі, што яны выведуць на плошчу сто тысяч чалавек, — абсалютны блеф. Ня гэтым трэба займацца».

А чым жа трэба? Сп.Нісьцюк раіць: супрацоўнічаць з уладамі: «Мы павінны паспрабаваць зь імі супрацоўнічаць. Расейскі эканамічны шантаж можа зблізіць пазыцыі ўлады і дэмакратычных сілаў». Нісьцюк загаварыў пра «канструктыўную апазыцыю», пад якой кіраўнік Беларусі звычайна мае на ўвазе палітыкаў кшталту Сяргея Гайдукевіча й Вольгі Абрамавай.

На думку Нісьцюка, эўрапейцам трэба весьці перамовы «не з радыкальнымі апазыцыянэрамі, а з уладай і канструктыўнай апазыцыяй». Тут У.Нісьцюк перайшоў да канкрэтных прапановаў.

## Нісьцюк прапануе па-ранейшаму ігнараваць наяўнасьць у Беларусі апазыцыі і альтэрнатыўнага грамадзтва.

Па-першае, намесьнік старшыні БСДП(Г) заклікаў скасаваць кропкавыя візавыя і эканамічныя санкцыі, супраць найвышэйшага кіраўніцтва Беларусі, як «бессэнсоўныя».

Пакрокавая нармалізацыя адносінаў ЭС зь Беларусьсю, на думку Нісьцюка, магла б адбыцца наступным чынам.

2) Беларусі вяртаюць статус спэцыяльна запрошанага ў Раду Эўропы ў абмен на «хай нават адзінкавыя зьмены ў выбарчае заканадаўства».

3) Эўразьвяз адкладае на год-два рашэньне аб пазбаўленьні Беларусі гандлёвых прэфэрэнцый, а Менск ідзе на зьмякчэньне прысуду Казуліну.

4) Эўрапейскія інстытуты адмаўляюцца ад фінансаваньня новых праграмаў радыё- і тэлевяшчаньня на Беларусь, а А.Лукашэнка вяртае «Народную волю» і «іншыя апазыцыйныя газэты» ў кіёскі і падпісныя каталёгі.

5) Узамен за зьмякчэньне заканадаўства пра масавыя акцыі і адмену некаторых нормаў Крымінальнага і Адміністрацыйнага кодэксаў Беларусь вяртаюць у Раду Эўропы, размарожваецца супраца з Эўрасаюзам, ухваляюцца адзін-два інвэстыцыйныя праекты.

Дыялёг з А.Лукашэнкам для рашэньня ўсіх гэтых пытаньняў, на думку Нісьцюка, мусяць весьці «знакавыя асобы, якія змогуць выступіць дастойнымі партнэрамі». Гэта, вядома ж, ня лідэры апазыцыі і не грамадзкія дзеячы, а экс-прэзыдэнт Літвы Альгірдас Бразаўскас і экс-прэзыдэнты Польшчы й Латвіі (маюцца на ўвазе хіба што не Валэнса, а Квасьнеўскі і Улманіс). Іх прапануецца надзяліць мандатам аднаго з эўрапейскіх інстытутаў, найлепей АБСЭ.

І праўда, як жа па БТ было б паказаць дыялёг А.Лукашэнкі з А.Мілінкевічам, акадэмікам Гарэцкім і Жаннай Літвіной? У нас жа няма апазыцыі, ёсьць кучка экстрэмістаў на датацыі Захаду. А Бразаўскас будзе глядзецца вельмі нават імпазантна: ізаляцыя прарваная.

Прапановы Нісьцюка ня ёсьць ніякім зрухам, бо яны па-ранейшаму прапануюць ігнараваць наяўнасьць у Беларусі апазыцыі і альтэрнатыўнага грамадзтва, без чаго дэмакратычны працэс застанецца імітацыяй, а правы чалавека не атрымаюць заканадаўчых гарантый. Але гэта адступленьне. Вернемся да прамовы Нісьцюка на натаўскім сэмінары.

Шостае і, здаецца, галоўнае, чаго, на думку Нісьцюка, чакае Менск: «Першым сыгналам можа стаць узгодненая пазыцыя эўрапейскіх краінаў у дачыненьні да расейскага газавага шантажу Беларусі. Трэба паказаць, што ня толькі Ўсход і Азія могуць стаць апорай нашай беларускай дзяржаве».

Калі зь першай часткай прамовы сп.Нісьцюк, напэўна, лёгка мог бы выступіць на якім Усебеларускім сходзе, дык другая частка, — як гаворыцца, ясны плян.

Пакуль такія прамовы не суправаджаюцца дзеяньнямі, яны мала што азначаюць. Аднак нешта яны ўсё-такі значаць: на расейскім кірунку безь пераменаў, і сёй-той чакае гарачанькай зімы.

**ЗП**

Тыя самыя думкі У.Нісьцюк выказаў у інтэрвію агенцтву «Маркетынг і кансалтынг». Поўны тэкст: www.iamik.ru/?op=full&what=content&ident=30459.

Камэнтар БСДП(Г) да выказваньняў У.Нісьцюка: http://bsdp.org/?q=be/node/1966.

# Уладзімер Нісьцюк:
# «Хіба Эўропа не прызнае Лукашэнкі?»

Каб паставіць усе кропкі над «і» датычна віленскіх заяваў намесьніка старшыні БСДП(Г) **Уладзімера Нісьцюка**, мы непасрэдна зьвярнуліся да аўтара гэтых словаў.

**«Наша Ніва»: Спадар Нісьцюк, Вашыя віленскія заявы наконт магчымага дыялёгу між беларускімі ўладамі і эўрапейскімі структурамі нарабілі многа шуму. Што менавіта Вы хацелі тады сказаць?**

**Уладзімер Нісьцюк:** Гэтая заява не зьявілася раптоўна. Яшчэ тры гады таму мы з Уладзімерам Падголам падрыхтавалі стратэгію, якая была разьлічаная на пакрокавае збліжэньне Беларусі з ЭС. Такая патрэба насьпела пасьля таго, як у Эўрасаюз уступілі краіны — суседкі Беларусі. Цяпер мы маем зусім іншую сытуацыю, мяняюцца геапалітычныя канфігурацыі. Гаворка ідзе нават пра страту незалежнасьці, таму такі дыялёг проста неабходны. Эўропа ўжо зрабіла першы крок да збліжэньня, калі адмовілася ўводзіць супраць Беларусі эканамічныя санкцыі. Лукашэнка ў адказ даў магчымасьць больш свабодна дыхаць прафсаюзам. Такая палітыка будзе на карысьць абодвум бакам.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**«НН»: Ці будзе месца ў такім дыялёгу апазыцыі?**

**УН:** А хто можа яе годна рэпрэзэнтаваць? Цяпер няма кандыдатуры, якая б задавальняла ўсіх. Калі перад выбарамі мы мелі два апазыцыйныя цэнтры, то цяпер такіх ужо чатыры ці нават болей. У апазыцыі нічога няма, яна страціла нават тое невялікае, што мела дагэтуль.

**«НН»: Такім чынам, Вы прапануеце, каб Эўропа афіцыйна прызнала легітымнасьць выбараў 2006 году?**

**УН:** А хіба яна не прызнае Лукашэнкі цяпер? Непрызнаньне ёсьць толькі ў заявах розных эўракамісараў, а насамрэч ідзе шчыльная праца дзелавых і фінансавых колаў Эўропы зь беларускімі ўладамі. І тое, што Пяткевіч з Кабяковым едуць на форум у Жэнэву, я лічу пазытыўным крокам у гэтым кірунку.

**«НН»: Чаму Вы заклікаеце Эўразьвяз спыніць фінансаваньне тэле- і радыёпраектаў, разьлічаных на Беларусь?**

**УН:** Мы добра ведаем, якія грошы атрымліваюць журналісты, што працуюць у Беластоку, Варшаве ці Бэрліне, і ведаем, як працуюць іхнія калегі на радзіме, калі часта яны знаходзяцца ў паўжабрацкім становішчы. Я выступаю за іншае разьмеркаваньне грошай, што ідуць з Эўропы. У Беларусі ёсьць людзі, якія па тры і болей гадоў сядзяць бяз працы, бо страцілі яе праз свае палітычныя перакананьні. У першую чаргу трэба дапамагаць менавіта ім. А то польскі бок выдзяляе трыста месцаў для студэнтаў, дык, прабачце, столькі блізка ня выгналі з ВНУ.

**«НН»: Вы кажаце, што, калі б апазыцыя прыйшла да ўлады, яна б не змагла кіраваць краінай. Чым Вы гэта абгрунтоўваеце?**

**УН:** Бо за апошнія гады апазыцыя роўным лікам нічога не зрабіла. Яна трымаецца яшчэ на тых здабытках, якіх у 1991 годзе дасягнуў Зянон Пазьняк са сваімі паплечнікамі. Новых дасягненьняў няма, адны няўдачы. За пяць гадоў ад часу прэзыдэнцкіх выбараў-2001 апазыцыя згубіла 10% сваіх прыхільнікаў, і не таму, што яны хочуць галасаваць за Лукашэнку, а таму, што ня хочуць — за апазыцыю.

**«НН»: Чаму Ваша партыя не падтрымала Вашых заяваў?**

**УН:** У нас ёсьць праграма «Шлях да годнага жыцьця», якая была зацьверджана, яшчэ калі Казулін быў на волі. Тая праграма ўтрымлівае амаль усе мае сёньняшнія пастуляты і заявы. Нічога новага я не казаў. Што да партыі, то ў нас поўны плюралізм, мы ж не КПСС, таму кожны мае права выказваць свае пазыцыі.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Саюзьнік, горшы за ворага

Узмацненьне рэпрэсій супраць апазыцыі можа тлумачыцца чаканьнем цяжкай зімы і расейскага ціску.

На паседжаньні сталага сэмінару для дэпутатаў парлямэнцкага сходу Беларусі і Расеі, якое праходзіла ў расейскім Растове 12 кастрычніка, дэпутат Думы ад Кампартыі Анатоль Локаць абнародаваў сакрэтны ліст Мінэканомразьвіцьця Расеі, які загадвае рэгіёнам Расеі абмежаваць гандаль таварамі беларускага імпарту нібы ў сувязі з дыскрымінацыяй расейскіх тавараў на рынках Беларусі.

Ліст, падпісаны намесьнікам міністра эканамічнага разьвіцьця і гандлю Расеі статс-сакратаром Андрэем Шаронавым яшчэ 14 ліпеня, паступіў у адміністрацыі суб’ектаў РФ. У лісьце зазначаецца: «Аналіз заканадаўства і нарматыўных актаў Беларусі выявіў, што да расейскіх пастаўшчыкоў прымяняюцца дыскрымінацыйныя захады пры разьмяшчэньні заказаў на пастаўкі тавараў, работ і паслуг. З мэтай усталяваньня ўмоваў допуску тавараў, якія паходзяць з Рэспублікі Беларусь, Мінэканомразьвіцьця прапануе не дапускаць беларускіх пастаўшчыкоў (выканаўцаў) пры разьмяшчэньні заказаў на пастаўку тавараў».

Да ліста прыкладзены сьпіс такіх тавараў: мэбля, сантэхніка, керамічная плітка, мясныя, садавінна-гароднінныя кансэрвы, сынтэтычныя мыйныя сродкі… Акрамя таго, Міністэрства просіць абладміністрацыі выказацца, якія яшчэ беларускія тавары можна вывесьці з ільготнага «нацыянальнага рэжыму» падаткаабкладаньня.

Дакумэнты выклікалі абурэньне прадстаўнікоў левых фракцыяў. Дэпутат Локаць расцаніў дзеяньні ўраду Расеі як эканамічны ціск на Беларусь: «Мы мардуем свайго саюзьніка, то па цэнах на энэрганосьбіты, то з таварамі».


WWW.SVABODA.ORG
Уладзімер Пуцін умее падабацца партнэрам.

Сп.Локаць лічыць ціск адным з крокаў, накіраваных на рэалізацыю жаданьня ўраду Расеі ўзяць пад кантроль «Белтрансгаз».

Фракцыя КПРФ у Думе, што мае цесныя сувязі з адміністрацыяй А.Лукашэнкі і лабіруе яе інтарэсы, мае ініцыяваць разгляд гэтых дзеяньняў Мінэканомразьвіцьця.

Прэс-сакратар МЗС Андрэй Папоў адмовіўся камэнтаваць: «МЗС пра гэта нічога не вядома. Камэнтаваць нейкія чуткі мы ня можам», — заявіў ён.

Каля вярстаўся нумар, з Расеі прыйшла інфармацыя, што намесьнік міністра эканамічнага разьвіцьця Шаронаў урэшце зьняпраўдзіў інфармацыю дэпутата Локаця. Зь ягоных словаў, гаворка ішла толькі пра закуп тавараў “на бюджэтныя сродкі”. «Ніякіх іншых абмежаваньняў няма. Любы ўдзельнік можа купляць тое, што купляў, ніякіх дадатковых абмежаванняў – ні мытных, ні квотных – няма», – сказаў ён.

**Мікола Бугай**

# Расея скароціць пастаўкі электраэнэргіі ў Беларусь да мінімуму

Чубайс таксама падцісьне суседзяў.

Кіраўнік расейскае электрычнае манаполіі РАО ЕЭС Анатоль Чубайс паведаміў, што ў зімовы пэрыяд Расея скароціць да мінімуму пастаўкі электраэнэргіі ў краіны СНД. Такое рашэньне прынята нібыта з-за недахопу электраэнэргіі для ўнутранага расейскага рынку. «У Расеі складваецца надзвычай цяжкая сытуацыя з дэфіцытам магутнасьцяў. Мы будзем мінімізаваць экспарт і максымізаваць імпарт», — заявіў журналістам А.Чубайс.

Што цікава, «у расейска-казахстанскім сэгмэнце маштабных зьменаў у экспарце й імпарце ня будзе», затое «сур’ёзныя зьмены будуць у расейска-ўкраінскіх, расейска-беларускіх, расейска-каўкаскіх, расейска-прыбалтыйскіх патоках», — удакладніў А.Чубайс.

Беларусь здольная абысьціся бязь імпарту электрычнасьці з Расеі і замяніць яго ўкраінскім. Аднак у зьвязцы з магчымым падаражэньнем газу гэткае абмежаваньне імпарту таксама здольнае папсаваць кроў беларускім энэргетыкам.

Раней А.Чубайс паведамляў пра зацікаўленасьць у прыватызацыі беларускіх электрастанцый, асабліва Бярозаўскай як прыдатнай для экспарту электрыкі ў Польшчу.

**МБ**

# Плян выконваецца

Яшчэ адну газэту выключылі з падпіснога каталёгу.

12 кастрычніка рэдакцыя недзяржаўнай газэты «Брестский курьер» атрымала ліст за подпісам дырэктара Берасьцейскага філіялу РУП «Белпошта» Георгія Цітова, у якім гаворыцца, што «дамова на распаўсюд і дастаўку «Брестского курьера» заканчваецца 31 сьнежня 2006 году і далей працягнутая ня будзе. Аб прычынах скасаваньня дамовы ў лісьце нічога не паведамляецца.

У 2005 годзе «Белпошта» таксама адмаўлялася ўключаць газэту ў каталёг і зрабіла гэта толькі за 5 дзён да заканчэньня падпісной кампаніі, тым самым абнізіўшы колькасьць падпісчыкаў. Цяпер жа надышоў час на наступны крок у здушэньні.

Атрымаўшы ліст ад «Белпошты», рэдактар кінуўся на прыём да старшыні аблвыканкаму Сумара, праседзеў дзень пад кабінэтам, ды той яго так і не прыняў.

**МБ**

# Праляскоўскі ад імя Лукашэнкі: «Гэта добрая царква, і ёй трэба дапамагчы»

Галадоўка–пост у падтрымку царквы «Новае жыцьцё» працягваецца другі тыдзень. Улады пайшлі на кантакт з галадоўнікамі.

Колькасьць удзельнікаў акцыі пратэсту паступова скарачаецца за кошт людзей сталага веку. Пры гэтым, аднак, шырыцца геаграфія падтрымкі беларускіх пратэстантаў. Да 17 кастрычніка ўлады дзейнічалі звыклымі мэтадамі: кампанія дыскрэдытацыі ў СМІ, ігнараваньне патрабаваньняў, рэкагнасцыроўка на мясцовасьці сіламі міліцыі.

Аднак 17 кастрычніка здарылася тое, на што ўлады раней ніколі не ішлі: пастара царквы запрасілі на сустрэчу з начальнікам галоўнага ідэалягічнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта Алегам Праляскоўскім. У сераду з гэтай нагоды адбылася прэс-канфэрэнцыя. Нагодай для яе былі вынікі перамоваў у Адміністрацыі прэзыдэнта ды сюжэты «Сталічнага тэлебачаньня» пра падзеі вакол царквы «Новае жыцьцё». Пастар Вячаслаў Ганчарэнка распавёў, што ён паінфармаваў А.Праляскоўскага аб усім, што дзеецца вакол «Новага жыцьця». На што ў адказ пачуў, што прэзыдэнт ужо азнаёмлены з сытуацыяй і выказаўся наконт царквы наступным чынам: «Гэта добрая царква, і ёй трэба дапамагчы. Але толькі ў прававых рамках».

А.Праляскоўскі настойліва параіў пастару царквы зьвярнуцца ў Гаспадарчы суд, а таксама прасіў вывесьці людзей з галадоўкі, спасылаючыся на тое, што справа разглядаецца на найвышэйшым узроўні.

В.Ганчарэнка кажа, што галадоўка-пост будзе працягвацца да таго, пакуль вернікі не атрымаюць канчатковы вынік: «Я не прыпомню выпадку, каб улады пазытыўна ацэньвалі такія вось ачагі неспакою. Да ўсяго, на працягу апошніх шасьці год мы ні разу не атрымалі станоўчага адказу на свае звароты».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ
Галадоўнікаў наведваюць мэдыкі-хрысьціяне з пратэстанцкіх суполак.

## СТБ падлівае алею

На мінулым тыдні на галадоўку зьвярнула ўвагу «Сталічнае тэлебачаньне». У тую пятніцу да царквы прыехала здымачная група СТБ, зь імі два чалавекі, якія назваліся чыноўнікамі з аддзелу культуры і аддзелу ў справах рэлігіі Маскоўскага раёну, і машына хуткай дапамогі з надпісам «рэанімацыя».

Даведаўшыся, што госьці прыехалі ня дзеля перамоваў, вернікі адмовіліся пускаць іх у храм. Размову з прыежджымі вёў юрыст «Новага жыцьця». Чыноўнікі сказалі на камэру, што прапаноўвалі царкве іншы ўчастак і іншы будынак, які не ў аварыйным стане. Юрыст назваў гэтыя словы хлусьнёй. Пасьля гэтага госьці яшчэ паўгадзіны хадзілі вакол будынку, спрабавалі здымаць праз шыбы.

Потым на канале СТБ быў паказаны сюжэт, паводле якога жыцьцю пратэстуючых нібыта пагражае небясьпека. Маўляў, будынак пажаранебясьпечны. Былі паказаныя дровы, складзеныя з тыльнага боку будынку, пры гэтым сьцьвярджалася, што адна кінутая запалка можа прывесьці да трагедыі. Раней там жа прагучала інфармацыя, што нібыта акцыя пратэсту мае палітычную скіраванасьць і шчодра фінансуецца Захадам.

На прэс-канфэрэнцыі ў сераду былі прадэманстраваныя два сюжэты: адзін зьняты СТБ і стужка, зробленая прадстаўніком царквы. Пры супастаўленьні робіцца відавочным мантаж СТБ стужкі, у выніку чаго сэнс словаў юрыста царквы цалкам скажоны.

## Лекары ня бачаць патрэбы

Колькасьць галадоўнікаў паступова скарачаецца. Спынілі пост старэйшыя. Лекары з 32-й паліклінікі перасталі аглядаць галадоўнікаў, нягледзячы на ранейшыя дамоўленасьці. Затое ад аўторка галадоўнікаў наведваюць мэдыкі-хрысьціяне з пратэстанцкіх суполак.

## Геаграфія галадоўкі

На сёньня ў акцыі пратэсту бяруць удзел вернікі з трох дзясяткаў гарадоў. Некаторыя грамады далучаюцца да акцыі сымбалічна. Так, менская царква «Благавешчаньне» поўным складам (450 чалавек) абвесьціла аднадзённы пост-малітву на знак салідарнасьці.

## Кірмаш, пасьля мітынг

Гарадзкія ўлады дазволілі правядзеньне заяўленага пратэстантамі на гэтую суботу мітынгу ў падтрымку «Новага жыцьця» на плошчы Бангалор. Аднак перанесьлі яго з 14–й гадзіны на вечар а 18-й. Перанос патлумачылі тым, што ў той жа дзень на Бангалоры адбудзецца восеньскі кірмаш.

На час мітынгу ў царкве застанецца 100 чалавек — тыя, хто пратэстуе, не пакідаючы памяшканьня, і ахова. На плошчы чакаюцца выступы пастараў і неабыякавых людзей.

**Сямён Печанко**

**Мітынг у падтрымку царквы «Новае жыцьцё»**

**пройдзе на плошчы Бангалор у суботу а 18–й.**

## Правадыры ўсіх краінаў

9 кастрычніка, у дзень першых ядравых выпрабаваньняў у КНДР, споўнілася 9 гадоў, як Кім Чэн Ір афіцыйна заняў пасаду кіраўніка Працоўнай партыі Карэі — найвышэйшы пост у дзяржаве. Пра гэта напісалі ўсе інфармацыйныя агенцыі сьвету. І мала хто перад тым зьвярнуў увагу на яшчэ адно супадзеньне датаў у гісторыі. У ліпені 1994 году сканаў «вялікі правадыр карэйскага народу», старшыня ППК таварыш Кім Ір Сэн, на зьмену якому прыйшоў ягоны сын — проста «любімы кіраўнік». Практычна аднначасова, акурат дванаццаць гадоў таму, прыйшоў да ўлады ў Беларусі яе першы прэзыдэнт.

# Падставы для аптымізму

*Апазыцыя — костка ад косткі свайго народу. Піша* **Віталь Тарас**.

Пра магічнае й псыхалягічнае значэньне лічбы дванаццаць сказана ўжо шмат, і тут амаль няма чаго дадаць. І ўсё ж.

Працэс перайманьня вышэйшай улады ў КНДР даволі складаны. Павінны былі мінуць некалькі гадоў нацыянальнай жалобы па Кім Ір Сэне, перш чым Кім-малодшы стаў паўнаўладным кіраўніком партыі і краіны, роўным у велічы свайму бацьку. У Беларусі павінен быў адбыцца лістападаўскі рэфэрэндум 1996-га году, перш чым зьмены ў Канстытуцыі надалі кіраўніку дзяржавы практычна неабмежаваныя ўладныя паўнамоцтвы.

На гэтым паралелі вычэрпваюцца. Беларусі не пагражае голад. Беларусі не пагражае палітычная і эканамічная блякада. У Беларусі няма сваёй атамнай зброі.

Тым ня менш, пэўныя супадзеньні наводзяць на думку аб тым, што дыктатуры — нават калі паміж імі адлегласьці дзясяткі тысяч кілямэтраў і яны належаць да абсалютна розных рэгіёнаў сьвету, разьвіваюцца падобным чынам. Дыктатарскія рэжымы (калі яны сапраўды дыктатарскія, а не апэрэтковыя, кшталту «чорных палкоўнікаў») робяцца больш жорсткімі ды рэпрэсіўнымі, грамадзтва — дэградуе. Прычым адбываецца гэта ў значнай ступені незалежна ад эканамічнага складніка. Трэці Райх пры Гітлеру дасягнуў эканамічных посьпехаў яшчэ да пачатку агрэсіўных войнаў — нягледзячы на фашысцкую дыктатуру, у краіне працягвалі дзейнічаць рынкавыя мэханізмы.

У Паўднёвай Карэі эканамічны рост пачаўся яшчэ пры дыктатарскіх рэжымах.

Камуністычны Кітай разьвіваецца ня менш дынамічна, чым самая вялікая паводле насельніцтва дэмакратыя ў сьвеце — Індыя. (Праўда, і ў Кітаі ўлада вымушаная была разьняволіць прыватную ініцыятыву.) Цяпер абедзьве гэтыя дзяржавы пачынае даганяць Іран. З другога боку, дэмакратычныя краіны не заўсёды могуць пахваліцца посьпехамі ў эканоміцы — напрыклад, Аргентына даволі доўга ня можа ачомацца пасьля шэрагу эканамічных крызісаў. Але ўявіць сабе вяртаньня хунты там ужо немажліва. Дзясяткі тысяч людзей, у якіх падчас дыктатуры зьніклі сваякі, пратэстуюць супраць амністыі былым афіцэрам, датычным да масавых зьнікненьняў.

### «Потым яны прыйшлі за мной»

Самае галоўнае, што адбываецца пры ўсіх без вынятку дыктатарскіх рэжымах, — гэта падзеньне чалавечага духу. На гэта зьвярнуў увагу ў адным з сваіх інтэрвію філёзаф Уладзімер Мацкевіч. На ягоную думку, у параўнаньні з гітлераўскім Райхам, які праіснаваў 12 гадоў, у Беларусі не адбылося яшчэ такога глыбокага маральнага распаду. Усё-ткі, тут не было вайны, татальнага вынішчэньня «неарыйцаў» і іншадумцаў, няма лягераў сьмерці.

Але ж колькасьць палітзьняволеных расьце. Растуць тэрміны іхняга пакараньня. Калі раней размова ішла галоўным чынам пра «хімію» за хуліганства, дык цяпер пачалі абвінавачваць у «тэрарызьме». А ў якасьці гіпатэтычнай (пакуль яшчэ) магчымасьці пакараньня пачалі фігураваць і «расстрэльныя» артыкулы.

Але галоўнае нават ня ў гэтым. Галоўнае — у нежаданьні большасьці людзей не заўважаць ні праяваў грамадзянскага супраціву, ні судоў, ні арыштаў, нічога такога, што непасрэдным чынам не закранае іхняга асабістага дабрабыту. Усё адбываецца паводле ўзору, аб якім гаварыў некалі нямецкі пастар-антыфашыст. Спачатку яны прыйшлі за камуністамі. Я маўчаў, бо я не камуніст. Потым — за габрэямі. Але я не габрэй. Потым яны прыйшлі за мной. Крычаць не было сэнсу, бо ўжо не было каму пачуць мяне.

Галадоўка пратэстантаў у Менску, у якіх хочуць забраць храм, пабудаваны ўласнымі рукамі, большасьці менчукоў не хвалюе. Бо яны не пратэстанты.

## Пэрыяд пачатковага назапашваньня

Хоча гэтага ўлада ці не, у Беларусі, як і ў Расеі, як і ва Ўкраіне, ідзе пэрыяд пачатковага назапашваньня капіталу. У людзей зьявілася магчымасьць легальна або нелегальна — праз хітрыкі, падман, хабар, але з дапамогай уласных мазгоў і рук — зарабляць грошы і набываць больш-менш прыстойныя аўтамашыны, нерухомасьць, будаваць сваё прыватнае жыцьцё. Адарвацца ад гэтага захапляльнага занятку дзеля нейкай палітычнай абстракцыі, дзеля партыі, дзеля суседа, якога звольнілі з працы ці пасадзілі за палітыку? Ніколі. Гэта ёсьць пэўнага кшталту людажэрства, будаваньне свайго шчасьця на няшчасьці іншых людзей. Але так было і ёсьць заўсёды — амаль ва ўсіх грамадзтвах. Толькі ў дэмакратычных грамадзтвах ёсьць інстытуты права і свабодная прэса, якая фармуе грамадзкую думку. Там мярзотнікі паводзяць сябе больш сьціпла, бо на іх могуць паказаць пальцам. А тут на цябе пачынаюць паказваць пальцам ці круцяць ім ля скроні, калі чалавек раптам пачынае сябе паводзіць прыстойна.

Чаму апазыцыя доўгі час не патрапіць выпрацаваць эканамічную праграму, якая магла б захапіць выбарцаў? Ды таму, што большасьць цешыцца сёньняшнім станам. Чаму іх не прываблівае прыклад суседніх Польшчы або Літвы? Бо, на думку абываталя, можа, там і льга зарабіць больш, дык для гэтага трэба больш працаваць. А галоўнае — дзейнічаць у рамках закону і маральнай адказнасьці. Куды больш звыкла і зручна дзейнічаць не паводле закону й права, а паводле пратэкцыі, знаёмства, прынцыпу «паслуга за паслугу» і г.д.

За дванаццаць гадоў барацьбы з аўтарытарызмам апазыцыя і грамадзтва ў цэлым апынуліся ля разьбітага карыта. І ўсё тое ж пытаньне пэрыядычна хвалюе палітыкаў: ці трэба ўдзельнічаць у выбарах? Выбары — як улюбёная цацка ў дзіцяці. Можаш рабіць што хочаш — хоць у кут на калені саджай, але ж цацку не адбірай, бо заплача. Зразумела, разумныя «дарослыя дзядзькі» ўсяляк ухваляюць такія дзіцячыя паводзіны і нават стымулююць «дзетак» цукеркамі.

Калі гаварыць сур'ёзна, дык галоўная праблема не ў драконаўскім выбарчым заканадаўстве і не ў перашкодах,



У Беларусі ідзе пэрыяд пачатковага назапашваньня капіталу.

якія чыніць мясцовая адміністрацыя. А ў тым — хто выбірае, куды (у якія органы якой улады) і дзеля чаго? Для мільёнаў грамадзянаў выбары даўноператварыліся ў рытуал паслушэнства дзяржаве. Вазьмеце мой голас — толькі адчапіцеся, дайце займацца сваёй прыватнай справай. Удзел апазыцыі ў выбарах разглядаецца як нейкі артэфакт. Нешта накшталт сьмешнага абавязку галасаваць таемна — за заслонай...

## У чым яго праўда?

Зрэшты, апазыцыя ня зь Месяца звалілася, як часам пераконвае дзяржаўная прапаганда. Яна — костка ад косткі свайго народу. І для яе характэрныя тыя ж агульныя настроі і пабуджальныя матывы, што і для большасьці. Ёй хочацца ня толькі вырашаць нейкія тактычныя задачы, ці, кажучы прасьцей, спрабаваць выжыць на палітычным полі, якое з кожным днём звужаецца. Ёй хочацца выглядаць пры гэтым прыгожа. Як кажа мой калега — хочацца ўсьміхацца.

Успамінаю размову з адным апазыцыянэрам — вельмі інтэлігентным, мужным і прыстойным чалавекам. Ён выказаў думку, што нам, недзяржаўным журналістам, не стае аптымізму, калі мы пішам пра апазыцыю і яе дзеяньні. Шчыра кажучы, закід падаўся нечаканым. Здавалася б, апазыцыя як ніхто павінна быць зацікаўленая ў праўдзе. Тым больш што яна выстаўляе яе ў якасьці аднаго з асноўных сваіх лёзунгаў. У праўдзе, а не аптымізьме, якога хапае ў «Советской Белоруссии» і на БТ. Голас карэйскага дыктара, які паведамляе пра выпрабавальны ядравы выбух, таксама прасякнуты аптымізмам. Але размова не аб тым.

Сапраўды, нармальным людзям вельмі хочацца верыць у перамогу дабра й справядлівасьці. Адбяры ў чалавека веру, і што застанецца? Але ж дзеяньні вернікаў царквы «Новае жыцьцё» вось аб чым прымусілі задумацца: вера, відаць, толькі тады мае права называцца верай, калі яна пабуджае чалавека на нейкія дзеяньні. Аптымізм тут ні пры чым. Чалавек альбо скараецца абставінам, альбо прымае выклік — з усімі наступствамі, якія з гэтага вынікаюць.

Рэлігійная гэта вера ці проста вера ў справядлівасьць і чалавечнасьць — ня так ужо й важна.



WWW.SALIGORSK.ORG

**Акцыі салідарнасьці са Зьмітром Дашкевічам і Паўлам Красоўскім прайшлі ў розных гарадох краіны. На фота: лятучы пікет у Салігорску.**

# Апоўзень на Ваўкавышчыне: ёсьць ахвяры

На Ваўкавышчыне апоўзень у крэйдавым кар'еры накрыў калёну вялікагрузых аўтамабіляў і забіў аднаго чалавека. Трагедыя адбылася ў сераду ўвечары. У чаканьні пагрузкі ў кар'еры «Каляздічы-3», дзе здабывае крэйду прадпрыемства «Краснасельскбудматэрыялы», стаялі пяць самазвалаў МАЗ. Апоўзень крэйдавай масы абрынуўся на аўтамабілі нечакана. Чацьвёра кіроўцаў выбавіліся, пятага заваліла. Адкопвалі яго ўручную, каб не справакаваць новых абрынаньняў. Праз тры гадзіны яго дасталі нежывым. Кажуць, вінаватыя сёлетнія залевы. Сьледзтва разьбіраецца.

# Чалавек паставіў помнік

«Я шчасьлівы чалавек, бо збылася мая мара аднавіць памяць аб зьнішчаных фашыстамі маіх земляках», — сказаў у інтэрвію радыё «Свабода» Мікола Ільючык зь вёскі Багданаўка, што ў Лунінецкім раёне. Помнік забітым габрэям-аднавяскоўцам ён зрабіў сам з сынамі і сябрамі і на ўласныя сродкі.

Пра трагедыю шасьці габрэйскіх сем'яў, зьнішчаных фашыстамі ў часе вайны, Мікола Ільючык даведаўся яшчэ падлеткам ад бацькоў. Яго вельмі ўсхвалявала тое, што ніякіх памятных знакаў па забітых у іх роднай вёсцы людзях не засталося. Міколава гісторыя па-свойму тыповая: гэтае жаданьне яшчэ ўзмацнілася, калі выйшла кніга «Памяць» пра Лунінеччыну, у якой пра трагедыю ў Багданаўцы, як і пра многія іншыя «непажаданыя» старонкі нашай гісторыі, не было ні слова.

«Узьнікла пачуцьцё нейкае несправядлівасьці. Як жа так — жылі людзі, кожны са сваім сьветам, са сваёй нейкай марай, і вось яны проста зьніклі і ніхто аб гэтым ня ведае».

Свамі пачуцьцямі і думкамі Мікола Ільючык падзяліўся на старонках раённай газэты, аднак ніхто не адгукнуўся. І тады ён вырашыў сам зрабіць помнік. Удакладніў яшчэ раз у старэйшых жыхароў вёскі месца трагедыі і стаў адкладаць на помнік грошы з уласных заробкаў.

«Я параіўся з жонкай. Мы людзі веруючыя, і мы дзесяць адсоткаў нашых прыбыткаў заўсёды ахвяруем на нейкія такія справы, якія мы называем Божымі. А жонка кажа: давай, можа, тую дзесяціну зьбярэм на помнік, дый рабі», — кажа ён.

Сабраных грошай хапіла на набыцьцё патрэбных матар'ялаў, а зрабіць помнік дапамаглі спадару Міколу сябры і сыны, старэйшы зь якіх ходзіць у пятую клясу, а два меншыя — у трэцюю.

Дакладна высьветліць усе прозьвішчы і імёны забітых спадару Міколу не ўдалося, у памяці вяскоўцаў захаваліся толькі іх вулічныя мянушкі. Таму ён зрабіў на помніку агульны мэмарыяльны надпіс.

Лунінецкая раённая газэта гэтую падзею ў вёсцы Багданаўка абышла маўчаньнем.

Іншы раз думаецца: дзякуючы такім, як Мікола і ягоная жонка, яшчэ стаіць наш нібы выкляты Богам край.

**МБ; паводле радыё «Свабода»**




**Мікола Ільючык ля помніка забітым габрэям у вёсцы Багданаўка Лунінецкага раёну.**

# Літва шукае новую кандыдатуру пасла ў Менск

Міністэрства замежных справаў Літвы атрымала ясны сыгнал зь Менску, што Антанас Валёніс (**на фота**) будзе непажаданым на гэтай пасадзе. Літоўскае МЗС вырашыла не прасіць агрэмана кандыдатуры А.Валёніса, былога міністра замежных справаў, паколькі прадбачыць адмову і не жадае абвастраць дачыненьні зь Беларусьсю.




БТ у свой час абвінаваціла міністра Валёніса, што ён нібыта арганізоўваў масавыя пратэсты супраць парушэньняў у часе прэзыдэнцкіх выбараў у сакавіку. Пасьля зьмены ўраду ў Літве ён вярнуўся на дэпутацкую працу ў сойм.

У Літве паслоў прызначае і вызваляе з пасады прэзыдэнт паводле прапановы ўраду і пры пацьверджаньні кандыдатуры парлямэнцкім камітэтам замежных справаў.

**Радыё «Свабода»**

# Рэшткі палацу Чартарыйскіх прыстасавалі пад сьметнік

Калі мы дабраліся да Крыўлянаў, пачалі пытацца ў людзей, дзе ўрочышча Коранева, у якім колісь стаяў замак. Тры чалавекі прызналіся, што нядаўна пераехалі ў вёску (з Украіны і Гомельшчыны) і ўяўленьня пра гэта ня маюць. Толькі сталы мужчына паказаў дарогу.

І такі ўсё так і захавалася! Равы між насыпным валам і падмуркам замку зацягнуліся травой, але і сёньня ў іх ёсьць вада. Функцыянуе сыстэма водазабесьпячэньня.

Куды больш змрочна выглядае, калі пад'яжджаеш бліжэй: двор і равы заваленыя гурбамі сьмецьця. Выкінутыя памідоры шчэ не дагнілі, і над імі раіліся мухі.

І тое, што пясок на валах здабываецца ня першы дзень, бачна па шэрагу ямін. Сьляды зубцоў экскаватара яшчэ ня змытыя дажджом.

Мы зьвязаліся з адказнымі работнікамі Жабінкаўскага раёну. Старшыня райвыканкаму Мікалай Токар: «Старшыня сельсавету Леанід Ігнатчык за дапушчанае бязладзьдзе ды ігнараваньне рашэньняў райвыканкаму не працягне працу на сваёй пасадзе. Парадак будзе наведзены найбліжэйшымі днямі. Але што крыўдна, не было ж на замчышчы «афіцыйнай» звалкі. Сьмецьце вывозяць самі сяляне. І гарантаваць, што пустыя пляшкі там ня зьявяцца праз паўгоду, я не магу. Ну ня ставіць жа там міліцэйскі пост!»

**Паводле «Вечерний Брест»**

# Беларусь зближаецца з ЗША

Прэзыдэнцкі від спорту едзе падымаць амэрыканец.

Пасаду галоўнага трэнэра хакейнай зборнай заняў амэрыканскі спэцыяліст Курт Фрэйзэр (**на фота**), які замяніў ля стырна зборнай канадца Глена Хэнлана. Пры канадцу Хэнлану зборная нашай краіны дасягнула значных посьпехаў на міжнароднай арэне. На сёлетнім Чэмпіянаце сьвету ў Рызе беларусы былі шостыя, найлепшае дасягненьне за ўсе гады.

**Зьміцер Панкавец**



WWW.STLOUISBLUES.COM

# Беларускія сайты наведвае мільён чалавек

Дзяржаўная статыстыка паведамляе, што ў Беларусі 3 млн камputараў. У той жа час, база зьвестак РУП «Белтэлекам» утрымлівае 3,5 млн плацельшчыкаў рахункаў за карыстаньне беспарольным доступам у Інтэрнэт. Сыстэма «Акавіта» вызначае 1 млн карыстальнікаў, якія наведваюць беларускія сайты.

Узровень пранікненьня Інтэрнэту на Захадзе ацэньваецца у розных краінах у 53—83%. У Расеі — 17%.

Ступень інтэрнэтызацыі Беларусі, відаць, сувымерная. Красавіцкія зьвесткі дасьледніцкай кампаніі МАСМІ кажуць пра 33% жыхароў абласных цэнтраў у веку 16—64 гадоў, якія карыстаюцца Інтэрнэтам, тады як у вёсках ён практычна недаступны.

Лідэрам сярод айчынных рэсурсаў застаецца TUT.BY.

**Паводле BYBANNER.com**

# Мілінкевіч, Сурвілла і консульства РБ на сьвяткаваньні 50-годзьдзя «Нівы»




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

13—14 кастрычніка беластоцкая «Ніва» адзначала 50-годзьдзе. Сьвяткаваньні праходзілі ў рамках навукова-папулярнай канфэрэнцыі «Беларускія дні «Нівы». У іх узялі ўдзел вядомыя беларусы Польшчы (Сакрат Яновіч, Юры Туронак, Яўген Мірановіч, Алег Латышонак, Ян Чыквін), замежжа (Івонка Сурвілла, Вячка Станкевіч), пісьменьнікі, палітыкі і грамадзкія дзеячы зь Беларусі (Сяргей Чыгрын, Барыс Пятровіч, Вінцук Вячорка, Алесь Бяляцкі, Алена Макоўская).

У першы дзень канфэрэнцыі гатэль «Галэмбёўскі», дзе яна адбывалася, наведаў Аляксандар Мілінкевіч. Ён прыехаў у Беласток пасьля атрыманьня ў Кракаве ўзнагароды імя Сэржыё Віера дэ Мэля. Мілінкевіч павіншаваў калектыў «Нівы» зь юбілеем і падараваў дамавіка зь бел-чырвона-белым сьцягам.

14 кастрычніка пачаліся юбілейныя ўрачыстасьці. Зь вітаньнямі выступалі прадстаўнікі ўладаў Беласточчыны, праваслаўнай аўтакефальнай царквы ў Польшчы, беларускага консульства, старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла. Рэдактар газэты Яўген Вапа горача вітаў гасьцей і прымаў віншаваньні.

Да юбілею выйшаў альбом з архіўнымі здымкамі, прысьвечаны гісторыі «Нівы».

У мастацкай частцы імпрэзы вучні беластоцкай гімназіі №7 паказалі інсцэніроўку «Цацачная крама».

**Алесь Аркуш, Беласток**



АЛЕСЬ АРКУШ

**І.Сурвілла і А.Мілінкевіч спаткаліся ў Беластоку**

# Цудоўнае размнажэньне румынаў і баўгараў

Перад далучэньнем Румыніі і Баўгарыі да Эўразьвязу колькасьць жыхароў гэтых краінаў значна павялічыцца. Нават былы прэм’ер Македоніі адчуў сябе баўгарынам.

Тысячы малдаван і македонцаў не жадаюць чакаць, пакуль іх краіны ўвойдуць у ЭЗ. Яны вырашылі трапіць туды разам з румынамі і баўгарамі ўжо 1 студзеня.

Бухарэст абвесьціў, што за апошнія тры месяцы ажно 300 тыс. з 4,1 млн жыхароў Малдовы падалі на атрыманьне румынскага грамадзянства. Дагэтуль з 1991 г. на зьмену грамадзянства наважылася ўсяго 100 тыс.», — кажа Карына Вінтан, прадстаўніца румынскага МЗС.

Малдаване баяцца візаў, якія Бухарэст мае ўвесьці для іх пасьля далучэньня да ЭЗ.

Прывабным стала і грамадзянства 8-мільённай Баўгарыі. На сёньня ўлады ў Сафіі разглядаюць 50 тыс. заяваў на прызнаньне грамадзянства: удвая болей, чым летась. З 2001 г. баўгарамі запісаліся 20 тыс. замежнікаў. Палова зь іх — жыхары 2-мільённай Македоніі.

Баўгарскі пашпарт атрымаў і былы прэм’ер (1998—2002), дэпутат ад нацыяналістычнай партыі Любча Георгіеўскі. Гэта выклікала ў Македоніі скандал: Сафію ж вінавацяць у аспрэчваньні існаваньня македонскай нацыі.

**Вольга Данішэвіч**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

**ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ**

# Камэндант

Усе клічуць яго Камэндантам. Зрэдчасу пачуеш — «Цімафеіч», а так усё Камэндант ды Камэндант. Такое ўражаньне, што сапраўднага ягонага прозьвішча ў Алёшчы ня ведае ніхто. Калі ж запытаесься, ён уважліва прасьвідруе цябе пільным позіркам празрыста-шэрых вачэй з прымружанага змаршчыньня: «А навошта табе?»

Камэндант так і размаўляе — задае пытаньне й пранізьліва ўзіраецца, маўляў, я цябе наскрозь бачу. Ён амаль ніколі не падвышае голасу й ня лезе ў парожнія гутаркі. Трымаецца наводдаль. Назірае.

Камэндант, прынамсі афіцыйна, не зьвязаны ані са спэцкамэндатурай у Ветрына, ані з камэнданткай інтэрнату (хаця, пагадзецеся, замнога тут камэндантаў) і няўлоўна нагадвае хіба *камандантэ* Фідэля. Цімафеіч, праўда, маладзейшы, яму мо пад 65, і без барады, але вось гэты позірк, пільны й крыху шалёны, гэтая вайсковая пастава й манера *пытаць* суразмоўніка іх дужа прыпадабняе.

Ну і, вядома. Погляды.

Камэндант лічыць, што ён сумленна пражыў жыццё, служыў Радзіме, ахоўваючы зэкаў у «зоне» ў 1970—1980-я. Шчыра не даўмеецца, калі Сталіна назавуць тыранам, і скажа, што сёньняшняя ўлада слабаватая — «разбаўтаўся народ».

Чым займаецца Камэндант у Алёшчы, наўрад ці хто скажа пэўна. «Парадак наводзіць», — пацісьне плячыма брыгадзір. Нейкі час ён вастрыў сякеры, правіў вілы, рыдлёўкі й кручкі для адкаткі. Але як што снадзіва на эстакадзе ўвесь час кралі ды прапівалі (нат не заставалася чаго вастрыць і рамантаваць) — ён кінуў гэты занятак ды перабраўся за эстакаду, куды кранамі ў вялізныя горы адносяць вецьце ды сьмецьце.

І пачаў паліць вогнішчы.

Калі Камэндант утылізуе тое вецьце — усю Алёшчу, бы туманам, зацягвае дымам. Яловае гольле разгараецца, дае полымя на некалькі мэтраў і час ад часу трэскае агромністымі фаервэркамі — тады здаецца, што за эстакадай прарвала жарало невядомага вулькана.

Сам са Смаленшчыны, у 1960-х Цімафеіч скончыў школу; адслужыўшы на Ўрале, застаўся наглядчыкам у тамтэйшай калёніі, і з часам вырас да загадчыка ўчастку, дзе адбывала пакараньне 2,5 тысячы зэкаў. Выйшаў на пэнсію, пасяліўся у Алёшчы, і з тых пор ягоная прывідна-шэрая постаць за эстакадай — неад'емная частка тутэйшага краявіду.

## ХРОНІКА

**Галадоўка пратэстантаў**

12 кастрычніка быў шпіталізаваны адзін з удзельнікаў акцыі. У гэты ж дзень мэдыкі з раённай паліклінікі №2 Фрунзэнскага раёну адмовіліся ад штодзённых візытаў у будынак «Новага Жыцьця».

**10 кастрычніка**

Актывіст БСДП(Г) **Алег Воўчак** адмовіўся ехаць на допыт у Гарадзенскую рэгіянальную мытню, бо ў позьве не пазначана, чаму і на якой падставе яго выклікалі.

З дапамогі па беспрацоўі актывісткі **Натальлі Бордак** улады Сьветлагорску вылічваюць штраф. Спагнаньне было накладзенае падчас выбарчай кампаніі за раздачу матэрыялаў А.Мілінкевіча.

У Лунінцы супрацоўнікі райвыканкаму забаранілі прадаваць недзяржаўную газэту **«Информ-прогулка»** ў шапіку «Берасьцеаблсаюздруку», што стаіць у будынку самога выканкаму.

Адміністрацыйная камісія Наваполацкага гарвыканкаму аштрафавала на 5 базавых велічыняў **Валера Шаўчэнку** за «парушэньне правілаў добраўпарадкаваньня населеных пунктаў» і паркоўку на газоне. Нараканьняў на паркоўку не было, пакуль актывіст не абскардзіў у судзе дзеяньні кіраўніцтва гарвыканкаму.

**11 кастрычніка**

Стала вядома, што пры канцы верасьня ў Менску адбыўся суд над ксяндзом **Антоніем Кочкам**, якога аштрафавалі на 2 б.в.

У Салігорску адміністрацыйная камісія завочна аштрафавала на 3 б.в. **Уладзімера Шылу** — бацьку моладзевых актывістаў Івана й Ільлі. Пакараньне вынесенае за «віну» Івана, затрыманага падчас распаўсюду налепак.

**13 кастрычніка**

У менскім аэрапорце надгледзелі па вяртаньні з Прагі старшыню міжнароднай камісіі Партыі БНФ **Ігара Лялькова**.

Палітвязьню **Івану Круку**, актывісту АГП, адмовілі ў датэрміновым вызваленьні. Прычынай сталася тое, што напярэдадні судовага паседжаньня па вызваленьні ў камэры супрацоўнікі турмы знайшлі «забаронены прадмет».

**14 кастрычніка**

Па дарозе ў Магілёў міліцыянты затрымалі актывіста АГП **Ігара Шынкарыка**, які ехаў на мітынг за вызваленьне экс-кандыдата на прэзыдэнта А.Казуліна.

У Менску падчас расклейкі ўлётак у падтрымку Зьмітра Дашкевіча затрыманыя моладзевыя актывісты **Яня Русовіч**, **Слава Каранёў**, **Уладзімер Сяргееў**.

**16 кастрычніка**

З палітвязьнем **Мікалаем Астрэйкам** дазволілі сустрэцца адвакатцы **Валянціне Шаханцовай**, але адмовілі маці — **Яўгеніі Астрэйцы**.

На Дзень салідарнасьці ў Салігорску затрыманыя **Аляксей Валабуеў**, **Іван** і **Ільля Шылы**, **Дзяніс Карноў** і **Аліна Таранік**.

# і страх сьмерці

«Бачыш, які развал? — ківае Камэндант на алёшчынскі склад, дзе некалькі п'яных рабочых ужо каторую гадзіну «перакурваюць». — А ведаеш, чаму? — і не даючы сказаць *чаму*, адказвае сам. — Бо вашая дэмакратыя добрая ў іншым месцы. А нашаму чалавеку трэба пуга. Так-так, не матляй галавой, пуга. І страх сьмерці. Інакш працаваць ня будуць».

Камэндант спрытна цыркае сьлінай, уладным рухам рукі спыняе мае пярэчаньні й працягвае: «Галоўнае — абнесьці тэрыторыю калючым дротам. Стралкоў на вышкі. Страх сьмерці патрэбны, разумееш? Тады ты кантралюеш сытуацыю. А там, унутры, ужо справа тэхнікі. Падзяліць, каб не групаваліся самі, дзесьці пасварыць, асьведаміцеляў там... І парадак».

«Ага, парадак, — не вытрымлівае хтосьці з рабочых, — такім, як ты, дай волю, вы ўсю Беларусь па пэрымэтры абгародзіце».

Мне згадаліся гэтыя словы Камэнданта, калі пасьля выпадку зь сіратою Вікцяй Мароз, навучэнкай Вялейскага інтэрнату, сотням беларускіх дзетак было забаронена выяжджаць на аздараўленьне ў Італію.

Тая ж прамова Камэнданта пра страх сьмерці ўзьнікла ў памяці, калі аднаго зь лідэраў «Маладога фронту», Паўла Красоўскага, арыштавалі паводле падазрэньняў ва ўчыненьні віцебскіх выбухаў (маўляў, падобны да фатаробата): згодна з гэтым артыкулам Крымінальнага кодэксу ўжо можна асудзіць да пакараньня сьмерцю. Баючыся размаху маладафронтаўскай справы й *сьведкаў салідарнасьці* на судзе, рэжым падае сыгнал сапраўдным злачынцам, якіх так і не знайшлі: «Узрывайце далей — замест вас пасадзім палітычных!»

Вялізная постаць Камэнданта вырастае цяпер па-над сотнямі менскіх галадоўнікаў-хрысьціянаў з царквы «Новае Жыцьцё», якіх пазбаўляюць іхняга дому малітвы.

«Новае Жыцьцё» — назва тут зусім не выпадковая.

Але хрысьціяне не баяцца сьмерці. Яны баяцца толькі Бога, Які ўладны і над сьмерцю, і над жыцьцём. «*Новае Жыцьцё*» — назва тут зусім не выпадковая. Вось чаму страх сьмерці не ўратаваў ад краху ані Рымскую імпэрыю, ані Трэці Райх, ані Савецкі Саюз. Былі тыя, хто не баяўся сьмерці — і гэта азначала, што калючы дрот, стральцы на вышках і нават камэнданты бясьсільныя.

Для Цімафеіча такое непамысна.

А хрысьціяне й маладафронтаўцы ведаюць: працаваць, падтрымліваць парадак і жыць шчасьліва беларусам дасьць ня страх сьмерці, а нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

## ХРОНІКА

У Гомелі затрымалі каля дваццаці чалавек, у тым ліку **Вольгу Буранкову**, **Дзяніса Мінкова**, **Зьмітра Чалапа**, **Зьмітра Кутасава**.

У Менску падчас Дня салідарнасьці затрыманыя 16 чалавек, у тым ліку **Ян Давідовіч**, **Андрусь Ігнатчык**, **Алесь Карповіч**. Пасьля акцыі затрыманая моладзевая актывістка **Наста Палажанка**: яе падазравалі ў вывешваньні расьцяжкі ў сваім раёне. У яе патрабавалі інфармацыю пра незарэгістраваную арганізацыю «Малады фронт», пры затрыманьні ў яе разламалі тэлефон.

Са сьвечкамі ў руках у Берасьці былі затрыманыя **Ігар Дземідовіч**, **Андрэй Шаранда**, **Міхась Ільін**, **Дзяніс Прадун**, **Кацярына Бельская**, **Юлія Пашко**, **Віктар Клімус**, **Канстанцін Турчаняк**, **Віталь Коўш**, **Юрась Боўбац**, а таксама **Ганна** і **Анатоль**, прозьвішчаў якіх мы ня ведаем. За паўкілямэтра ад акцыі затрыманы рэдактар газэты «Царква» **Ігар Бараноўскі**: яго прымусілі напісаць тлумачальную запіску.

**АШ**



**Акцыя на Дзень салідарнасьці 16 кастрычніка ля беларускага консульства ў Беластоку.**

# Нобэлі-2006 разабралі амэрыканцы й мусульмане

Калі ў навуцы рэй вядуць амэрыканцы, у гуманітарных і літаратурных справах найбольшыя чыны зьдзяйсьняюцца ў іншых пунктах сьвету. Беларус упершыню рэальна прэтэндаваў на Нобэлеўскую прэмію міру. Налета да ліку беларусаў—намінантаў могуць дадацца чатыры зьняволеныя маладафронтаўцы.

### Мэдыцына і фізіялёгія: за адкрыцьцё РНК-інтэрфэрэнцыі

Ляўрэатамі Нобэлеўскай прэміі ў галіне мэдыцыны і фізіялёгіі сталі амэрыканскія дасьледнікі: 47-гадовы Эндру Файр (Стэнфардзкі ўнівэрсытэт) і 45-гадовы Крэйг Мэлоў (Масачусэцкі ўнівэрсытэт) — за адкрыцьцё мэханізму РНК-інтэрфэрэнцыі. Дасьледаваньні былі зробленыя вучонымі яшчэ ў 1997 годзе ў лябараторыі факультэту эмбрыялёгіі Інстытуту Карнэгі ў Балтыморы. Падчас гэтых досьледаў яны зрабілі адкрыцьцё, якое прывяло да расшыфроўкі мэханізму «геннай цэнзуры». Навукоўцы адкрылі мэханізм прыдушэньня экспрэсіі генаў двухланцуговай РНК, якая прыводзіць да таго, што пэўныя прыкметы, закадаваныя ў спадчынным матэрыяле, не праяўляюцца ў арганізьме жывой істоты. Адкрыцьцё амэрыканцаў паспрыяе вывядзеньню новых гатункаў расьлінаў, а таксама можа дапамагчы ў барацьбе з ракам.



AP

Адкрыцьцё Эндру Файра (зьлева) і Крэйга Мэлоў можа дапамагчы ў барацьбе з ракам

### Фізыка: за абсалютна чорнае цела

У галіне фізыкі ляўрэатамі сталі таксама амэрыканцы Джон Мэзэр (супрацоўнік амэрыканскай касьмічнай праграмы *NASA*) і Джордж Смут (Каліфарнійскі ўнівэрсытэт). Узнагарода прысуджаная за вывучэньне ў галіне «формы «чорнага цела» і анізатрапіі касьмічнага мікрахвалевага фонавага выпраменьваньня». Гэтыя дасьледаваньні дапамагаюць прасунуцца ў вывучэньні ўзьнікненьня сусьвету і разуменьні ўзьнікненьня галяктык і зорак. Праца вучоных была заснаваная на зьвестках, атрыманых з дапамогай спадарожніка *NASA* ў 1989 годзе. Вынікі пацьвярджаюць тэорыю ўтварэньня Сусьвету шляхам «вялікага выбуху».


REUTERS

AFP

Джон Мэзэр і Джордж Смут атрымалі Нобэля за касмагонію.

### Хімія: за перадачу генэтычнай інфармацыі

Нобэлеўскую прэмію за хімічныя дасягненьні атрымаў яшчэ адзін амэрыканскі вучоны, Роджэр Корнбэрг (Стэнфардзкі ўнівэрсытэт) за вывучэньне малекулярнай асновы эўкарыётнай транскрыпцыі, першага этапу сынтэзу бялка. Корнбэргу першаму ўдалося стварыць рэальную карціну прагрэсу транскрыпцыі і капіяваньня спадчынных рысаў у так званых эўкарыётах — арганізмах, клеткі якіх маюць ядро — ад жывёлаў да звычайных дрождж аў. Гэтае адкрыцьцё зьяўляецца надзвычай важным для лячэньня рака, сардэчна-судзінных захворваньняў, а таксама для распрацоўкі новых антыбіётыкаў. Бацька сёлетняга Нобэлеўскага ляўрэата Артур Корнбэрг таксама некалі атрымліваў гэтую ўзнагароду, праўда, у галіне мэдыцыны.


AP

Роджэр Корнбэрг — другі набэліст у сям'і.

### Эканоміка: за прагназаваньне інфляцыі

Нобэлеўскую прэмію ў галіне эканомікі атрымаў зноў амэрыканец, 73-гадовы Эдмунд Фэлпс (Калюмбійскі ўнівэрсытэт Нью-Ёрку). Ён атрымаў прэмію за дасьледаваньне ўзаемасувязяў паміж каротка і доўгачасовымі эфэктамі ў макраэканамічнай палітыцы. Фэлпс займаецца вывучэньнем узаемасувязяў такіх зьяў, як інфляцыя і яе прагназаваньне. Паводле Фэлпса, узровень інфляцыі залежыць ня толькі ад узроўню беспрацоўя, але і ад інфляцыйных чаканьняў насельніцтва. Дарэчы, апошнія гады «Нобэля» ў эканоміцы атрымліваюць амаль выключна амэрыканскія навукоўцы.


AP

Эдмунд Фэлпс: узровень інфляцыі залежыць ня толькі ад узроўню беспрацоўя.

### Літаратура: уганараваны ўсходнеэўрапеец

Літаратурным Нобэлем адзначаны Архан Памук, 54-гадовы турэцкі пісьменьнік-постмадэрніст.

Ён нарадзіўся ў багатай стамбульскай сям'і 7 чэрвеня 1952 году. Скон-

чыў стамбульскі амэрыканскі каледж *Robert College*. Пасьля — факультэт журналістыкі. Пэўны час жыў у ЗША. Ягоны першы раман «Джэўдэт-бэй і ягоныя сыны» атрымаў прэстыжную турэцкую прэмію выдавецтва «Міліет прэс». Сусьветную вядомасьць Памуку прынесла кніга «Белая крэпасьць» (1985). А раман «Чорная кніга» стаўся адным з самых папулярных у турэцкай літаратуры. У 2003 годзе Памук атрымаў адну з самых прэстыжных сусьветных літаратурных прэміяў — Міжнародную дублінскую прэмію IMPAC.

Раманы Архана Памука маюць папулярнасьць як у інтэлектуальнага, так і ў масавага чытача. Творы сёлетняга Нобэлеўскага ляўрэата перакладаліся на 40 моваў сьвету. Асноўнай тэмай творчасьці Памука зьяўляецца супрацьстаяньне: паміж захадам і ўсходам, ісламам і хрысьціянствам. І, вядома, ён чэрпае натхненьне ў сваім родным, спрадвечным Стамбуле-Канстантынопалі-Царгорадзе-Бізантыі, месьце, дзе зьмяшаліся ўсе расы і ўсе культуры.

Некаторыя нават мяркуюць, што Памук — пісьменьнік стамбульскі ў большай ступені, чым турэцкі. А Стамбул — гэта не Турэччына, кажа турэцкая прымаўка.

Памук вядомы таксама актыўнай грамадзянскай пазыцыяй. Памука ў Турэччыне досыць шарпалі нацыяналісты й органы правасудзьдзя. Шмат хто на радзіме лічаць Памука здраднікам. Нядаўна ён мусіў устаць перад судом за выказваньне салідарнасьці з курдзкім нацыянальным рухам. Ён таксама не пабаяўся адкрыта прызнаць армянскі генацыд.



WWW.GRAMEEN-INFO.ORG

**Махамэд Юнус (у цэнтры) стварыў унікальны банк для дапамогі беднякам.**

Узнагарода Памуку — гэта і ўзнагарода ўсёй сучаснай турэцкай культуры, самабытнай, багатай і сьмелай. Напрыклад, на сёньня Турцыя — адна з самых багатых на чытачоў краінаў Усходняй Эўропы.

На беларускую творы Памука дагэтуль не перакладаліся. «Наша Ніва» рыхтуе першы пераклад з новага Нобэлеўскага ляўрэата ў наступны выпуск тыднёвіка.

У сьпісе намінантаў на літаратурнага Нобэля былі й беларусы — Рыгор Барадулін і расейскамоўная пісьменьніца, што працуе ў жанры «літаратуры сьведчаньняў», Сьвятлана Алексіевіч.

## Мір: за эканамічнае разьвіццё бедных краінаў

Нобэлеўская прэмія міру ў Осла ў пятніцу 13 кастрычніка была прысуджаная грамадзяніну Бангладэшу Махамэду Юнусу. Ён разьдзяліў прэмію з заснаваным ім жа *Grameen Bank*.

Юнус атрымаў «Нобэля» за вялізарны ўклад у сацыяльнае і эканамічнае разьвіцьцё адной з найбяднейшых краінаў сьвету. Унікальны банк нобэлеўскага ляўрэата выдае беднякам мікракрэдыты, не патрабуючы ніякіх фінансавых гарантыяў.

Нобэлеўская прэмія міру складае 1,1 млн эўра і будзе ўручаная 10 сьнежня.

Махамэд Юнус — адзін з тых людзей, якія ахвярна займаюцца справаю дзеля дабра іншых людзей. Такім, мусіць, і павінна дастававацца найбольшая гуманітарная прэмія сьвету.

Сёлета ўпершыню сярод намінантаў на Нобэлеўскую прэмію міру быў і беларус — праваабаронца і літаратар Алесь Бяляцкі. Ягоныя шанцы ацэньваліся высока і, напэўна, ён застанецца ў сьпісе прэтэндэнтаў і на наступныя гады. Паводле нашай інфармацыі з крыніцаў у нарвэскіх праваабарончых арганізацыях, налета ў сьпісе намінантаў на Нобэлеўскую прэмію міру могуць зьявіцца таксама чатыры беларускія палітвязьні, што належалі да незарэгістраванага «Маладога фронту»: Севярынец, Дашкевіч, Фінькевіч і Красоўскі.

**Зьміцер Панкавец**




REUTERS

**Архан Памук — твар Турцыі.**

# Раман-цывілізацыя, альбо

Барыс Дубін піша пра Архана Памука.

«Чаму людзі прагнуць жыць не сваім, а нечым чужым жыцьцём?» — пытаў герой памукоўскай «Чорнай кнігі» (патурэцку яе назва гучыць яшчэ лепш — «Кара кітап»), на самай справе, задаючы пытаньне — так ужо ўладжаная ўсякая кніга! — нам, яе чытачам. Кожны з раманаў Архана Памука прачыталі сотні тысяч людзей ня толькі ў яго на радзіме, але і ў большасьці краінаў Захаду. Памук — мусіць, галоўнае адкрыцьцё ў сусьветнай літаратуры 90-х (разам зь ім падзеяй, здаецца, стала і ўся найноўшая турэцкая проза, улучаючы зусім не «жаночыя» раманы пісьменьніц Латыфэ Тэкін альбо Эмінэ Аздамар, у люстры якіх зь цікавасьцю ўзіралася Эўропа).

Архан Памук — прадстаўнік старой і заможнай сям'і выхадцаў з грэка-турэцкага гарадка Манісу (старадаўняя Магнэзія) непадалёк ад Ізьміру (Сьмірны). Навучаўся ў амэрыканскім Робэрт-каледжы, найлепшай стамбульскай спэцшколе, тры гады стажаваўся ў ЗША, цяпер жыве ў Стамбуле.

Дэбютаваў у 1979 годзе, 27-гадовым. На пачатку 90-х італьянскі пісьменьнік Мар'ё Б'ёндзі назваў Памука турэцкім Умбэртам Эка. «Вялікі турэцкі раман» — прэзэнтоўваў «Чорную кнігу» гішпанскамоўным і францускім чытачам ў 1996 годзе Хуан Гайтысола. «Калі казаць словамі Борхэса і Памука...» — сканчвалася рэцэнзія на амэрыканскае выданьне «Кара кітап» (1995) у газэце «Нэйшн». Дар уяўленьня, плястычную сілу і пераканаўчасьць Памука параўноўвалі з энэргіяй фантазіі ў Германа Гэсэ і Італа Кальвіна, Джэймса Грэма Баларда, Ўільяма Гаса, Джанэт Ўінтэрсан. Мне ж ён нагадаў тых — ня раз і ня два згаданых Борхэсам — начных баюноў, confabulatores nocturni, якія слова за слова сплятаюць у стагодзьдзях бясконцую кнігу «Тысячы і адной ночы» і якіх клікаў да сябе з усходніх базараў скрасіць бессань легендарны Зу-л-Карнайн, Аляксандар Вялікі. З ткацкай выдумкай апавядальнікаў з гарадзкога гандлёвага люду Памук снуе шматслойную алегарычную мэтафорыку вучонай паэзіі суфіяў. Нездарма герой некалькіх «апавяданьняў у апавяданьні», што складаюць галавакружныя галерэі і лябірынты «Кара кітап», — аўтар знакамітай і бязьмежнай «Кнігі аб схаваным сэнсе», легендарны пэрсамоўны паэт-містык XIII ст. Джаляль ад-дын Румі.

Раман Памука «Чорная кніга» быў напісаны ў 1985—1989 гадох, апублікаваны ў 1990-м. Пазьней выйшлі Памукавы раманы «Новае жыцьцё» (1994) і «Мяне называюць Чырвоны» (1998), якія сталі ў Турэччыне ўнікальнымі паводле папулярнасьці бэстсэлерамі. Паколькі «Чорная кніга» — калі браць толькі *адзін* з узроўняў апавяданьня — дэтэктыў («першы турэцкі дэтэктыўны раман», як адзначана ў самым ягоным канцы), то я ня стану выкладаць сюжэту, прасочваць паваротак заблытанай інтрыгі і апярэджваць крымінальнай разьвязкі. Скажу толькі, што перад чытачамі — клясычны, родавы ўзор раманнага жанру, «раман пошуку». Прычым пошук гэты вядзецца ізноў-ткі ў некалькіх кірунках і некалькіх сэнсавых плянах. Памук — пісьменьнік-сымфаніст, майстар вялікай формы; аднаму з рэцэнзэнтаў ягоны раман нагадаў гіганцкі крышталь Дантавай «Камэдыі». Герой раману Галіп (Шэйх Галіп — гэтая меркаваная пераклічка важная! — найбуйнейшы турэцкі паэт-суфі XVIII ст., сябра брацтва пасьлядоўнікаў Румі) некалькі дзён шукае ў вялізным Стамбуле раптоўна зьніклага стрыечнага брата, вядомага журналіста, містыфікатара, дасьледніка чужых сакрэтаў і аматара галаваломных псэўданімаў Джаляля Саліка і сваю, таксама зьніклую, жонку, аматарку замежных дэтэктываў Рую (па кудзелі яна, дарэчы, належыць да роду прарока Мугамэта, а яе імя азначае «мара, мроя»). Разам з тым Галіп, ідучы сьлядамі брата, знаходзіць празь ягоныя старыя зацемках і помныя для іх абодвух зь дзяцінства куточкі гораду *самога сябе*, зьліваючыся з вобразам брата, больш за тое — як бы займаючы ягонае месца і становячыся пісьменьнікам. «Адзіны спосаб для чалавека стаць сабой, — заключае ён у канцы кнігі, — гэта стаць іншым, заблукаць у гісторыях іншых».

Джаляль жа ў сваіх карэспандэнцыях — імі перамяжаюцца сюжэтныя падразьдзелы раману — спрабаваў, сярод іншага, разгадаць таямніцу Румі: зразумець загадкавую фігуру ягонага духоўнага каханага-двайніка і настаўніка-мюрыда, «люстра ягонага твару і душы» Шэмса Тэбрызі, разабрацца ў падрабязнасьцях і сэнсе таямнічага забойства Тэбрызі — з тугі па памерлым сябры і нарадзілася ў Румі ягоная вялікая «Мэснэві». Акрамя таго, журналіст, відаць, стаўся небясьпечным сьведкам палітычных гульняў вярхоў. З вобразамі закуліснае змовы й таемнай суполкі ў раман уваходзіць далёкая і блізкая гісторыя Турэччыны ў яе ўзаемінах зь мілітарызаваным Захадам: тэма схаванага збаўцы-махдзі і лжэмэсіі зь ягонымі лжэпрарокамі, матыў рыхтаванага прышэсьця Антыхрыста (пераклічка зь «Легендай пра Вялікага інквізытара»), шэраг гістарычных ростаняў і новага выбару шляху ў зьменлівых спробах жорсткай мадэрнізацыі зьверху і кансэрватыўнага супрацьстаяньня ім зьнізу аж да кемалісцкай рэвалюцыі першай чвэрці XX ст., левага падполь-

**Барыс Дубін**

**сацыёляг, перакладчык, навуковы супрацоўнік Аналітычнага цэнтру Юр'я Лявады (Масква). Гэты тэкст перакладзены на беларускую з ласкавае згоды аўтара паводле часопісу «Иностранная литература».**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Як Вы ацэньваеце выбар Архана Памука нобэлеўскім ляўрэатам у галіне літаратуры?**

| | |
|---|---|
| Упершыню за доўгія гады — слушны | 22 (24,4%) |
| Ізноў спудлавалі | 6 (6,7%) |
| Шкада, што не беларусу | 47 (52,2%) |
| Памука не чытаў, але ўхваляю | 15 (16,7%) |

Усяго прагаласавала на 14.30 17 кастрычніка: 90.

# Вернутае мастацтва Шахеразады

ля 1940—1950-х і ваеннага путчу на пачатку 1980-х гадоў. Раманны quest набывае яшчэ больш абагульнены, глыбінны сэнс. Нарэшце, празь біяграфіі героя ў у «Чорную кнігу» ўплятаюцца матывы рэлігійнай гарэзіі і двайніцтва. Рэч у тым, што брацтвы-ордэны хуруфітаў і бэкташы заснаваныя на суфійскай філязофіі, якая падсілкоўвае сюжэтныя пэрыпэтыі раману.

Віртуозна аркестраванае апавяданьне, то адрываючыся ўбок і нібы схамянаючыся толькі празь некалькі падраздзелаў, то робячы падманныя хады і адразу падсьмейваючыся само зь сябе, блікуючы з другой часткі ў першую і наадварот, эпізод за эпізодам набірае шырыню і моц. Аповед аб некалькіх днях з жыцьця трох чалавек, нарошчваючы пласты як аўтабіяграфічнага, так і гістарычнага матэрыялу, якія да таго ж пераклікаюцца адзін з адным, становіцца пэўнага кшталту хартыяй блізкаўсходняга жыцьцёвага ўкладу — старой цывілізацыі, дзе спалучаюцца паганства і хрысьціянства, прававерны ісламі рухі і сэкты, што зь імі канкуруюць, сівая старадаўнасьць і навамодная аднадзёнка; так у знаходках на дне Басфо-

Працяг на старонцы 20.


WWW.SVABODA.ORG

**Архан Памук** — турэцкі пісьменьнік. Нарадзіўся ў Стамбуле ў 1952. Аўтар раманаў «Джэўдэт-бэй і ягоныя сыны» (1979), «Ціхі дом» (1984), «Белая крэпасьць» (1985), «Чорная кніга» (1990), «Новае жыцьцё» (1994), «Мяне зваць Чырвоны» (1998), «Сьнег» (2002).

# «Беларус ня можа атрымаць Нобэля, бо нашыя пісьменьнікі адсталі ад рэальнасьці»

Імкнучыся перакінуць мост паміж Усходам і Захадам, Памук аказаўся пасярод гэтага мосту, стаўшы чужым і для ўсіх.

На думку літаратурнага крытыка Паўла Абрамовіча, Архан Памук — годны кандыдат, бо ляўрэат «ня толькі вырашае мастацкія задачы, але і мае адкрытую грамадзянскую пазыцыю, рэальна ўплывае на сусьветны літаратурны працэс, карыстаецца вядомасьцю ў шырокага кола чытачоў, нарэшце, упэўнена выглядае і заўсёды ўсьміхаецца».

Крытык мяркуе, што на сёньняшні момант беларус ня можа атрымаць Нобэля, бо нашыя пісьменьнікі адсталі ад рэальнасьці. «Гары Потэр больш рэальны за іх, — уздыхае Павал. — Яны не крэатыўныя, не пазытыўныя, ня стыльныя». Абрамовіч кажа, што пакуль айчынных пісьменьнікаў не пачнуць перакладаць суседзі, то гаварыць пра літаратурнага Нобэля для Беларусі нясвоечасова.

Выкладчыца БДУ Ганна Бутырчык мяркуе, што Архан Памук сапраўды заслужыў узнагароду. Разам з тым яна кажа, што шанцы на атрыманьне прэміі меў і Рыгор Барадулін. «Можа, налета Дзядзьку Рыгору пашанцуе», — кажа Г.Бутырчык.

«Беларусы ў сьпісах кандыдатаў выглядалі ня з горшага, — гаворыць перакладчык Лявон Баршчэўскі, — але Памук сапраўды вылучаўся. Скажам, у Польшчы, натуральна, ня ведалі, каго выберуць Нобэлеўскім ляўрэатам, але яны за гэты год пераклалі тры кнігі Памука. Гэта літаратура высокага ўзроўню — я не кажу пра палітычны падтэкст, які прысутнічае ў ягоных творах, а без палітыкі Нобэляў не даюць. Асноўная тэма ягонай творчасьці — узаемадачыненьні між Захадам і Ўсходам, пры гэтым Памук дае іх у чытэльнай форме».

Перакладчык згадвае, што некалі Архан Памук быў адзіным літаратарам з мусульманскага сьвету, які заступіўся за творчасьць Салмана Рушдзі.

«Памука чытаю з задавальньнем, але чыста інтэлектуальным, а не мастацкім, раскідваючы ягоныя вобразы і стылі: "гэта Борхэс", "гэта Эка", "гэта «Тысяча і адна ноч»", "гэта Гэмінгуэй", а "гэта Каран" — кажа Аляксандра Дынько, рэдактарка літаратурнае часткі часопісу «ARCHE». — Мабыць, толькі «Белая крэпасьць» (раман Памука, напісаны ў 1985. — **Рэд.**) цяпер выклікае ў мяне павагу і любоў да аўтара, які хоча быць суфіем у XXI стагодзьдзі. Памук мае вялікі талент апавядальніка, але прынцыпы і сымбалі мусульманскага сьвету, гульня зь якімі прынесла яму папулярнасьць, не дазваляюць яму стварыць больш-менш пераканаўчыя вобразы ў межах упадабанай ім заходняй традыцыі. Імкнучыся перакінуць мост паміж Усходам і Захадам, ён аказаўся пасярод гэтага мосту, стаўшы чужым і для ўсіх. Не сумняюся, што ягоная актыўная грамадзянская пазыцыя шчырая, але бачу ў ягоных рэзкіх і рызыкоўных выказваньнях адчайную спробу знайсьці сябе», — заўважае літаратуразнаўца.

**Зьміцер Панкавец**

# Раман-цывілізацыя, альбо Вернутае мастацтва Шахеразады

Працяг са старонкі 19.

ру з зацемкі Джаляля суіснуюць алімпійскія бізантыйскія манэты і накрыўкі ад газіроўкі «Алімпас». У бок адзначу: відаць, вялікую раманную форму — прынамсі, у XX ст. — не падняць і не ўтрымаць, не сынтэзаваўшы карпатлівай рэальнасьці прыватнага часу і месца з унівэрсальным даляглядам сымбаляў і ідэяў, не злучыўшы старадаўнасьці пачаткаў і вышыні арыенціраў. Дарэчы, ня часты, але і не такі ўжо рэдкі ў XX ст. усёахопны раман-цывілізацыя, раман-хартыя (правобраз іх усіх, джойсаўскі «Уліс», не ўявіць ні без гамэраўскай архаікі, ні без каталіцкай літургіі і лацінскай патрыстыкі, ні бяз дублінскага новага Бабілёну, але далёка ня кожная нават з прыпозьненых літаратур можа падобным жанравым монстрам пахваліцца) — па-мойму, адна з пэрспэктыўных разнастайнасьцяў буйной празаічнай формы менавіта ў апошнія дзесяцігодзьдзі: для прыкладу назаву хаця б «Хазарскі слоўнік» Мілорада Павіча і «Лэмпрыраўскі слоўнік» Лорэнса Норфалка, «Энцыкляпэдыю мёртвых» Данілы Кіша, «Палінура з Мэхіка» Фэрнанда дэль Паса і «Дух продкаў, альбо Сьвяточную мітусьню на Іванаву ноч» Хуліяна Рыяса. Прычым падобная выніковая «хартыя» ня толькі набрыньвае мінулым, паводле звычнай нам формулы Бялінскага аб энцыкляпэдычным зводзе гістарычнага і будзённага жыцьця нацыі (Памукаў раман — невычэрпная калекцыя пабытовых рэчаў, уменьняў і імёнаў, прыкметаў свайго часу, цацак, што былі страчаныя, забытыя, патанулі альбо запалі ў шчыліну), але загадвае і будучыню. У стэрэаскапічнай гульні «таемнай сымэтрыі» — Гайтысола гаворыць пра «прызматычнае бачаньне» Памука — раман увесь час адсылае ня толькі да мінулага, але і да прышлага часу, а ў адным з падразьдзелаў першай часткі, у чарговым устаўным аповедзе аднаго з напаўканспірацыйных пэрсанажаў разгортваецца карціна ўтапічнай дзяржавы заўтрашняга дня.

Мэтафары таемнага скарбу і неадступнага — то ўтоенага, то відавочнага, а то і падманнага — двайніка, пераклічка абліча і адлюстраваньня, гораду і карты, гульня сноў і люстэрак, а ўрэшце, жыцьця і мастацтваў у зьмене іх падабенстваў і адрозьненьняў («Усе забойствы, як і ўсе кнігі, паўтараюць адно аднаго», — кажа Джаляль) — скразныя матывы «Чорнай кнігі». Так, адно з навязьлівых бачаньняў Джаляля — трэцяе вока («...вока — гэта чалавек, якім я хацеў бы быць»). Гэтая вобразная нітка — Гайтысола згадвае ў сувязі з Памукам ілюзіяністцкую архітэктуру борхэсаўскіх навэляў і сэрвантэсаўскага раману — дае і чыста сюжэтныя вузлы (скажам, прэзэнтаваны легкаверным журналістам зь Бі-Бі-Сі макабрычны тэатар гістарычных манэкенаў у заключных главах першай часткі альбо падпольны публічны дом, дзе кожная з жыхарак удае турэцкую кіназорку, якая, адпаведна, выступала некалі ў нашумелым кінагіце ў ролі дзяўчыны лёгкіх паводзінаў). Але разьвіваюцца гэтыя мэтафары і ў больш агульным пляне — як свайго роду філязофія раманнага пісьма. Тут Памук апавядальнымі сродкамі разыгрывае, даводзячы да гратэску, некаторыя ідэі хуруфізму, свайго роду ісламскай кабалістыкі зь ейнай ідэяй адпаведнасьцяў паміж рысамі вонкавага абліча (абрысам месца, тварам чалавека), літарамі арабскага альфабэту і боскім уладкаваньнем сьвету ў ягоным прасторавым і часавым цэлым. У главе «Тайна літараў і забытая таямніца» сымбалічная значнасьць кожнага прадмету, імя, жэсту, учынку вырастае перад героем да цыкляпічнага насланьня, пагражаючы яму стратай розуму.

Верагодна, самая бліскучая знаходка Памука тут — цудоўна ўзноўлены ім у храналягічнай і сацыяльнай паліфаніі вобраз Стамбулу. Гайтысола слушна адзначае: праўдзівы галоўны герой памукоўскага раману — горад. Які! Горад-сымбаль, разарваны, як усялякі сымбаль, на два паміж Эўропай і Азіяй. Палімпсэст трох тысячагодзьдзяў. Сталіца чатырох імпэрыяў ад Рымскай да Асманскай, уключаючы сярэднявечную Лацінскую, заснаваную крыжакамі. Бадзяньні герояў цераз прасторы стамбульскіх кварталаў, цераз стагодзьдзі гісторыі, этапы ўласнага жыцьця, гадзіны зьменлівага дня — асабліва і найцікавейшае вымярэньне «Чорнай кнігі». Перакананы, яе будучыя выдаўцы яшчэ забясьпечаць асобным атлясам і даведнікам, але ўжо і для сёньняшніх чытачоў памукаўскі Стамбул увайшоў у асаблівую літаратурна-гістарычную геаграфію разам з гамсунаўскай Хрыстыяніяй і Парыжам Пруста, Брэтона альбо Картасара, борхэсаўскім Буэнас-Айрэсам, бэньямінаўскім альбо набокаўскім Бэрлінам і мілашаўскай Вільняй. Не выпадкова адна зь фінальных, сымбалічна нагружаных сцэнаў раману — конкурс на найлепшую выяву цікавостак і прыгостваў Стамбулу, іранічна разьлічаны зноў-такі на вока замежніка. Карціны разьмешчаныя ў залі гарадзкой забаўляльнай установы. Першую прэмію атрымлівае ўдзельнік, які прыдумаў павесіць на супрацьлеглай сьцяне гіганцкае люстра. І вельмі хутка гледачы заўважаюць, што вобразы ў люстры жывуць сваім жыцьцём — складаным, непрадказальным і грозным...

**Памук — мусіць, галоўнае адкрыцьцё ў сусьветнай літаратуры 90–х. Разам зь ім падзеяй, здаецца, стала і ўся найноўшая турэцкая проза, улучаючы зусім не «жаночыя» раманы пісьменьніц Латыфэ Тэкін альбо Эмінэ Аздамар, у люстры якіх зь цікавасьцю ўзіралася Эўропа.**

**Ён нагадвае тых начных баюноў, якія слова за слова сплятаюць у стагодзьдзях бясконцую кнігу «Тысячы і адной ночы». З ткацкай выдумкай апавядальнікаў з гарадзкога гандлёвага люду Памук снуе шматслойную алегарычную мэтафорыку вучонай паэзіі суфіяў.**

**Праўдзівы галоўны герой памукоўскай «Чорнай кнігі» — горад. Які! Горад–сымбаль, разарваны, як усялякі сымбаль, на два паміж Эўропай і Азіяй. Палімпсэст трох тысячагодзьдзяў. Сталіца чатырох імпэрыяў ад Рымскай да Асманскай, уключаючы сярэднявечную Лацінскую, заснаваную крыжакамі. Бадзяньні герояў цераз прасторы стамбульскіх кварталаў, цераз стагодзьдзі гісторыі, этапы ўласнага жыцьця, гадзіны зьменлівага дня — асабліва і найцікавейшае вымярэньне раману.**

**АРХАН ПАМУК**

# Сьнег

*Урывак з раману*

Ка выцягнуўся на ложку і аддаўся летуценьням, калі пачуўся грукат у дзьверы. Ён узьняўся — як быў, у паліто, — і адчыніў. За дзьвярыма стаяў Джавыт, парт'е, які прабавіў цэлы дзень ля печкі за тэлевізарам; ён сказаў: «Я быў забыўся: вас тэрмінова чакае Сэрдар-бэй».

Яны разам спусьціліся ў хол гатэлю. У той момант, калі Ка хацеў ужо выйсьці з гатэлю, ён спыніўся, аслупянелы: у дзьверы побач з рэцэпцыяй увайшла Іпэк; і яна была шмат прыгажэйшай, чым памятаў яе Ка. Яго раптам зноў уразіла, якая прыгожая яна была ў студэнцкія гады. Ён увесь расхваляваўся. Так, натуральна, яна была такая прыгожая.

Як два вэстэрнізаваныя буржуа з Стамбулу, яны спачатку падалі адно аднаму руку, а потым, пасьля моманту пэўнай нерашучасьці, схілілі галовы, абняліся і пацалаваліся ў шчокі, не дакранаючыся ніжнімі часткамі целаў.

Іпэк крыху адстаранілася і сказала з ашаламляльнай адкрытасьцю: «Я ведала, што ты прыедзеш. Танэр патэлефанаваў і сказаў мне пра тое». Яна дзівілася проста ў вочы Ка.

— Я прыехаў сюды на мясцовыя выбары і дзеля дзяўчат-самагубцаў.

— Колькі ты тут прабудзеш? — запытала Іпэк. — Побач з гатэлем «Асья» ёсьць цукерня «Новае жыцьцё». Цяпер мне трэба з бацькам разабрацца. Але а палове на другую мы маглі б сустрэцца і паразмаўляць там.

Ка адчуваў нязвыкласьць усёй гэтай сцэны, бо яна мела месца не ў Стамбуле — прыкладам, у квартале Бэйоглу* — але ў Карсе**. Ён таксама ня мог вызначыць, наколькі ягонае хваляваньне было выкліканае прыгажосьцю Іпэк. Выйшаўшы на двор і ідучы пад сьнегападам у кірунку рэдакцыі, ён падумаў: як добра, што я купіў гэты паліто.

* Шматэтнічны квартал у эўрапейскай частцы Стамбулу.

** Горад на паўночным усходзе Турцыі.

Дарогаю сэрца зь непахіснай пэўнасьцю пачуцьцяў падказала яму яшчэ дзьве рэчы, у якіх не прызнаваўся розум. Папершае: Ка прыехаў з Франкфурту ў Стамбул ня толькі на пахаваньне сваёй маці, але і каб пасьля дванаццаці самотных гадоў знайсьці турэцкую дзяўчыну, зь якой ён мог бы ажаніцца. Па-другое: Ка прыехаў з Стамбулу ў Карс, бо патаемна меркаваў, што гэтая дзяўчына — Іпэк.

Калі б нейкі сябра з добрым талентам да чытаньня чужых пачуцьцяў выказаў яму гэтую другую думку, Ка ня толькі ніколі б яму не дараваў, але і ўсё жыцьцё саромеўся і вінаваціў бы сябе ў слушнасьці гэтае здагадкі. Ка быў адным з тых маралістаў, якія пераканалі самі сябе, што найвялікшае шчасьце чалавека палягае ў тым, каб нічога не рабіць дзеля ўласнага шчасьця. Апроч таго, ён ня даў бы рады палагодзіць са сваёй элітарнай заходняй адукацыяй

**Працяг на старонцы 22.**











PERSO.WANADOO.FR

# Сьнег

Працяг са старонкі 21.

пошукі жанчыны, якую ён ледзьве знае, каб зь ёй ажаніцца. Нягледзячы на тое, калі ён падышоў да «Газэты памежнага месца», у яго былі неблагія адчуваньні, бо першая сустрэча з Іпэк прайшла лепш, чым ён уяўляў сабе ў аўтобусе, сам сабе ў тым не прызнаючыся.

«Газэта памежнага месца» месьцілася на адну вуліцу ніжэй ад гатэлю, дзе жыў Ка, на вуліцы Фаік-бэя; плошча, якую займалі супольна рэдакцыя і друкарня, была крыху большая за невялічкі нумар Ка. Пакой быў падзелены на дзьве часткі драўлянай пярэбаркай, на якой віселі выявы Ататурка, каляндар, узоры візытовак і вясельных запрашэньняў, фатаграфіі, якія Сэрдар-бэй здолеў зрабіць зь сябе самога разам з высокапастаўленымі ўладальнікамі дзяржаўных пасадаў і славутымі туркамі, якія прыязджалі ў Карс, а таксама заключаны ў рамку, сорак гадоў таму выдадзены першы нумар газэты. На заднім пляне з прыязным шумам працавала электрычная друкарская машына з понажным кіраваньнем, выробленая сто гадоў таму ў Ляйпцыгу фірмай Баўмана, якая цягам чвэрці стагодзьдзя эксплюатавалася ў Гамбургу, за часы свабоды прэсы пасьля пачатку Другога канстытуцыйнага пэрыяду была прададзеная ў Стамбул, пасьля 45-гадовае службы там намаганьнямі Сэрдарбэевага бацькі-нябожчыка выратаваная ад здачы ў мэталалом і прывезеная цягніком у 1955 годзе ў Карс.

Правай рукой, адзін з пальцаў якой ён увільгатняў падушачкай, першы сын Сэрдар-бэя карміў машыну чыстай паперай, а левай умела зьбіраў надрукаваныя асобнікі газэты — бо кантэйнэр для надрукаванай прадукцыі ён зламаў гадоў дзесяць таму ў бойцы з братам — дый нават патрапіў прывітаць Ка рухам вачэй. Другі сын быў падобны не да бацькі, а да маці, якая Ка цяпер помнілася вузкавокай, месяцападобнай, маленькай і тлустай. Ён сядзеў за моцна запэцканым друкарскай фарбай варштатам перад маленькай, падзеленай на сотні ячэек шуфлядай паміж сьвінцовымі літарамі-шрыфтамі рознае велічыні, віньеткамі і клішэ ды ўручную складаў, цярпліва і старанна, нібы каліграф, што адрокся ад гэтага сьвету, абвесткі, што пойдуць у газэту, якая выйдзе праз тры дні.

— Бачыце, у якіх умовах змагаецца за сваё выжываньне прэса Ўсходняй Анатоліі? — сказаў Сэрдар-бэй.

У гэты момант зьнікла электрычнасьць. Калі сьціхла друкарская машына і варштат патануў у таямнічай цемры, Ка заўважыў, наколькі прыгожая бель сьнегу, што падаў на дварэ.

— Колькі ты дагэтуль ужо зрабіў? — спытаўся Сэрдар-бэй. Ён запаліў сьвечку і прапанаваў Ка сесьці на крэсла пры стале ў пярэднім куце пакою.

— 160, тата.

— Калі зноў зьявіцца сьвятло, зрабі 340; сёньня да нас прыяжджае тэатар.

«Газэта памежнага месца» прадавалася ў Карсе толькі ў адным месцы, у аднаго гандляра насупраць Народнага тэатру, у якога яе штодня набывала чалавек дваццаць, але, як з гонарам распавядаў Сэрдар-бэй, дзякуючы падпісцы, прадаваны наклад дасягаў 320 асобнікаў. 200 падпісчыкаў складалі ўстановы і фірмы Карсу, чые посьпехі Сэрдар-бэй мусіў пэрыядычна ўсхваляць. Астатнія 80 падпісчыкаў — гэта былі шанаваныя дзяржавай, «важныя і аўтарытэтныя» асобы, якія зьехалі з Карсу і пасяліліся ў Стамбуле, але не абарвалі сваёй сувязі зь местам.

Электрычнасьць зноў зьявілася, і Ка ўбачыў, што на ілбе Сэрдар-бэя ад гневу выступіла жыла.

— Пасьля таго, як мы сустрэліся, вы размаўлялі з кепскімі людзьмі і сабралі кепскую, няправільную інфармацыю пра нашае памежнае места, — сказаў Сэрдар-бэй.

Ка спытаў:

— Адкуль вы ведаеце, куды я хадзіў?

— Натуральна, за вамі цікавала паліцыя, — патлумачыў журналіст. — А мы з прафэсійных меркаваньняў праслухоўваем пры дапамозе гэтага прымача размовы паліцыянтаў. Дзевяноста адсоткаў навінаў, што зьяўляюцца ў нашай газэце, мы атрымліваем з губэрнатарскай канцылярыі і цэнтральнага пастарунку паліцыі Карсу. Увесь пастарунак ведае, што вы пытаецеся ў кожнага, чаму Карс такі адсталы і бедны і чаму нашыя маладыя дзяўчаты забралі сабе жыцьцё.

Ка выслухаў ужо мноства тлумачэньняў таго, чаму Карс так зьбяднеў. Напрыклад, дзеля зьмяншэньня гандлю з Саветамі ў гады халоднае вайны; закрыцьця мытных пастоў на мяжы; дзеля таго, што камуністычныя банды, якія апанавалі места ў 70-я гады, пагражалі багатым і выгналі іх адсюль; што ўсе заможныя жыхары, якія назьбіралі хоць крыху капіталу, пераехалі ў Стамбул ці Анкару; што дзяржава і Бог забыліся на Карс; што вінаватыя бясконцыя канфлікты паміж Турэччынай і Армэніяй...

— Я вырашыў распавесьці вам, як яно ёсьць, — сказаў Сэрдар-бэй.

Зь яснасьцю розуму і аптымізмам, якіх яму не даводзілася адчуваць ужо шмат гадоў, Ка акуратна зразумеў, што сапраўднай тэмай ёсьць сорам. У Нямеччыне гэта было тэмай на працягу многіх гадоў і для яго самога, але ён хаваў той сорам нават перад самім сабой. Дзякуючы таму, што Ка насіў у сабе цяпер надзею на шчасьце, ён даў рады прызнацца сабе ў гэтым факце.

— Мы ўсе раней былі тут як браты, — вымавіў Сэрдар-бэй так, нібыта выдаваў нейкую таямніцу. — Але ўжо колькі гадоў, як усе пачалі казаць «я — азэрбайджанец», «я — курд», «я — тэрэкемэ». Натуральна, тут жывуць прадстаўнікі ўсіх магчымых народаў. Тэрэкемэ — мы завем іх таксама карапапакамі — браты азэрбайджанцаў. Курды — мы кажам на іх «плямёны» — нічога раней ня ведалі пра сваю курдзкасьць. Той, хто жыве тут з асманскага часу, не выхваляўся: «Я карэнны жыхар!» Туркмэны, лазы з Пасофу, немцы, выгнаныя царом з Расеі, — яны ўсе былі, і ніхто зь іх нічога не выдумляў сабе з сваёй на-







цыянальнасьці. Усю гэтую мудрагель пашырыла камуністычнае радыё «Тбілісі», каб падзяліць і зьнішчыць Турэччыну. Сёньня кожны тут бядней-шы і больш горды, чым раней.

Сэрдар-бэй прыйшоў да высновы, што Ка ўражаны ягонымі словамі, і перайшоў да іншае тэмы.

— Ісламісты ходзяць ад дзьвярэй да дзьвярэй, прыходзяць у хаты да людзей гуртамі, дораць кабетам хатняе начыньне, рондалі, выціскалкі апэльсінавага соку, скрынкі з мылам, пшанічнай сечкай і мыйнымі сродкамі, наладжваюць цесныя кантакты паміж жанчынамі, чапляюць дзецям на плечы зіхоткія манэты. Яны кажуць: «Аддайце вашыя галасы Партыі дабрабыту!», якую яны называюць партыяй Бога, кажуць, што ўся гэтая беднасьць, гэтая нэндза, якая апанавала нас, здарылася таму, што мы збочылі з Божага шляху. З мужчынамі размаўляюць мужчыны, з жанчынамі — жанчыны. Яны ўваходзяць у давер да беспрацоўных сваёй сфабрыкаванай прапагандай, сваім гневам, яны абяцаюць блізкую радасьць жонкам беспрацоўных, якія ня ведаюць, што зварыць дзецям на вячэру, пасьля абяцаюць яшчэ больш падарункаў і бяруць зь людзей слова, што тыя за іх прагаласуюць. Яны заваёўваюць з ранку да вечара павагу ня толькі прыніжаных, самых бедных слаёў насельніцтва, але і студэнтаў, чый страўнік толькі раз на дзень напаўняецца гарачым супам, работнікаў і нават рамесьнікаў ды гандляроў. Бо яны больш старанныя, сумленныя і сьціплыя, чым усе астатнія.

Уладальнік «Газэты памежнага месца» меркаваў, што папярэдні бурмістар, якога забілі, быў зьненавіджаны ўсімі не таму, што хацеў забараніць «несучасныя», на ягоную думку, конныя брычкі (гэты крок папросту не ажыцьцявіўся праз ягонае забойства), але таму, што быў прадажны і карумпаваны. Аднак ніводная з правай і левай рэспубліканскіх партыяў, якія праз старую кроўную помсту, этнічныя падзелы і нацыяналізм разбуральна змагаліся між сабою, не магла выставіць моцнага кандыдата на бурмістарскую пасаду. «Давяраюць толькі сумленнасьці кандыдата Партыі Бога, — цьвердзіў Сэрдар-бэй. — А гэта ніхто іншы, як колішні муж Іпэк-ханым, дачкі Тургут-бэя, гаспадара вашага гатэлю. Ён не вылучаецца вялікім розумам, але ён курд. Курды складаюць тут сорак адсоткаў насельніцтва. Выбары бурмістра выйграе Партыя Бога».

Яшчэ мацнейшы сьнегапад зноў выклікаў у Ка пачуцьцё самоты; і гэтая самота суправаджалася страхам, што прыйшоў канец тым варункам, у якіх ён вырас у Стамбуле, дый наагул вэстэрнізаванаму жыцьцю ў Турэччыне. У Стамбуле ён пабачыў, як замыкаюцца вуліцы, на якіх прайшло ягонае маленства, як зносяцца старыя, элегантныя будынкі пачатку стагодзьдзя, у якіх жылі многія ягоныя сябры, як засыхаюць і высякаюцца дрэвы ягонага маленства, зачыняюцца цягам апошняга дзесяцігодзьдзя кінатэатры, цямнеюць вітрыны крамаў з адзеньнем. Гэта азначала ня толькі канец ўсяго ягонага маленства, але і ягонае мары аднойчы зноў асесьці ў Стамбуле.

Ка глядзеў на зіхоткі ў нэонавым сьвятле шыльды «Газэты памежнага месца», нібы з казкі, сьнег, які паволі падаў вялізнымі сьняжынкамі, і маляваў сабе, як ён з Іпэк вернецца ў Франкфурт. Вось яны разам робяць закупы на другім паверсе, у аддзеле жаночага абутку ўнівэрмагу «Каўфхоф», дзе набыў свой попельна-шэры палітон, у які ён цяпер моцна захутаўся.

— Гэта ўсё частка міжнароднага ісламісцкага руху, які хоча зрабіць з Турэччыны нешта падобнае да Ірану...

— Ці дзяўчаты-самагубцы таксама належаць да яго? — спытаў Ка.

— У нас ёсьць падставы меркаваць, што, на жаль, яны таксама далі зьбіць сябе з панталыку, але мы пра тое ня пішам, бо дзяўчаты зноў будуць тым узрушаныя, і колькасьць самазабойстваў яшчэ больш павялічыцца. Кажуць, у месьце знаходзіцца вядомы ісламісцкі тэрарыст Блакітны. Каб кансультаваць дзяўчат у хіджабах і самагубцаў.

— Хіба ісламісты не выступаюць супраць самагубцаў?

На гэтае пытаньне Сэрдар-бэй ня даў адказу. Калі спынілася друкарская машына і ў пакоі запанавала цішыня, Ка зірнуў на проста неймаверны сьнег, што падаў на дварэ. Клопат аб праблемах Карсу быў вельмі слушным сродкам супраць ягонай занепакоенасьці і страху, якія расьлі, бо неўзабаве ён меў сустрэцца з Іпэк. Але цяпер Ка хацеў думаць толькі пра Іпэк і падрыхтавацца да сустрэчы ў цукерні, бо ўжо было 13.20.

**З турэцкай пераклаў**
**Сяргей Богдан**





WWW.INTERACTINGARTS.ORG





**Стамбул.**

**Раман «Сьнег» быў напісаны ў 2002 годзе. Па-расейску выйшаў тыражом 5000 асобнікаў у 2006 годзе выдавецтвам «Амфора».**

**Па-польску — таксама ў 2006 годзе, у *Wydawnictwo Literackie*.**



# Шматвежавы Крэмль і шматофісная Эўропа

Гульня ў дэмакратызацыю таго самага вартая, што і гульня ў інтэграцыю. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

У інтэрвію агенцыі «МіК» Уладзімер Нісьцюк, адзін зь лідэраў БСДП, прэзэнтуе сваю партыю як найлепшага пасярэдніка ў дыялёгу з уладай — адрозна ад «радыкальнай», «нацыяналістычнай» апазыцыі, зь якой Лукашэнка, маўляў, ніколі за адзін стол ня сядзе.

Адначасна, лічыць сп.Нісьцюк, і Эўропе варта ад пагрозаў перайсьці да пошуку кампрамісу зь Менскам. А на чале далікатнай місіі мог бы стаць, напрыклад, мудры Бразаўскас.

Зазначым: былы кіраўнік Літвы — таксама сацыял-дэмакрат. Увогуле ў згаданым інтэрвію выразна прасочваюцца — і гэта зразумела — партыйныя інтарэсы. Але паспрабуем абстрагавацца ад іх.

Эўропа сапраўды падае прыкметы гатовасьці распачаць нейкі новы тур палітычнага гандлю. Глядзеце, як там адразу ўхапіліся за хісткую нагоду адсунуць пытаньне пра пазбаўленьне Беларусі прэфэрэнцыяў у гандлі! Маўляў, ня варта псаваць маліну акурат тады, калі ў жэнэўскую штаб-кватэру Міжнароднай арганізацыі працы выпраўляецца прадстаўнічая дэлегацыя афіцыйнага Менску.

Можна тое-сёе паабяцаць ня толькі Жэнэве (то бок МАП), але і Брусэлю (ЭЗ), і Страсбуру (Радзе Эўропы), і Вене (АБСЭ). Мала таго, што Крэмль шматвежавы, дык жа і Эўропа шматофісная. Эўрабюракратам, як любым бюракратам, важна імітаваць працэс.

Палітоляг Мікалай Лукша лічыць, што такая гульня выгадная абодвум бакам. Ён нагадаў пра спробы «грамадзка-палітычнага дыялёгу» яшчэ за часам амбасадара Віка на чале місіі АБСЭ. Мой суразмоўца падкрэсьліў: ЭЗ — гэта пярэсты канглямарат з 25 дзяржаў, дзе дасягаецца складаны балянс між інтарэсамі мноства групаў. Прычым лабіраваньнем больш жорсткага падыходу займаюцца найперш праваабаронцы, недзяржаўныя арганізацыі — то бок ня самыя ўплывовыя структуры. Між тым сур’ёзным эканамічным гульцам — абы ціха.

Карацей, Брусэль будзе рабіць выгляд, што працуе над праблемай дэмакратызацыі Беларусі, а Менск — што гатовы на пэўныя саступкі. Палітоляг згаджаецца, што цяперашні газавы ціск Масквы падштурхоўвае беларускае кіраўніцтва да пэўнай «перабалянсоўкі» замежнай палітыкі. Але ж, на думку Мікалая Лукшы, у Эўропы ніколі не было і пакуль што не праглядаецца выразнай стратэгіі ўзьдзеяньня на рэжым.

Дык ці ня выйдзе, што Менск, які дзесяць гадоў тлуміў Крэмль, гуляючы ў братнюю інтэграцыю, цяпер распачне вязкую гульню з



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У нас свая Эўропа. Менск, з новазбудаванага гатэлю «Эўропа» зьнятыя рыштаваньні.**

Захадам у дэмакратызацыю?

Палітоляг Андрэй Фёдараў падкрэсьлівае, што ў меркаваным дыялёгу Эўропа мусіць улічыць ранейшы досьвед. То бок — дамагацца гранічна канкрэтных крокаў у канцэптуальных кірунках. Доступ апазыцыі да электронных мэдыяў? Хай будзе цьвёрдая квота. Зьмякчэньне выбарчага заканадаўства? Таксама — гарантуйце квоты для партыяў у камісіях. І гэтак далей.

Сапраўды, інакш будзе заганнае кола. Выпусьцяць аднаго палітвязьня, а праз месяц пасадзяць трох...

Хаця, згадзіцеся, нават дзеля свабоды аднаго чалавека варта выкарыстоўваць усе дыпляматычныя магчымасьці.



# Як узяць сытуацыю пад жастачайшы кантроль



Адной з адзнакаў стабільнасьці ў краіне ёсьць рэгулярныя заявы фазэра аб тым, што сытуацыя ў той ці іншай галіне пераходзіць пад ягоны асабісты «жастачайшы кантроль». Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

На сёньняшні дзень, нагадаю, жастачайшы кантроль ужо распаўсюджаны на такія грамадзкія зьявы, як: пытаньні занятасьці насельніцтва, выезды дзяцей за межы дзяржавы, гандаль людзьмі, тэндэр на трэцяга апэратара мабільнай сувязі, аўтабізнэс, сацыялягічныя апытанкі, дзейнасьць АБСЭ, сьпіртовая і харчовая кантрабанда, выкананьне загадаў прэзыдэнта, псыхіка Вікці Мароз, дэбюракратызацыя...

Не абышоўся бяз актаў пастаўленьня пад жастачайшы кантроль і мінулы тыдзень: калі верыць навінам БТ, цяпер штодня Ён будзе выклікаць Сідорскага на дыван, каб даведацца аб рацыёне беларускіх курцоў, коштах на будоўлю і тэмпах нараджальнасьці дзяцей у Беларусі.

Аднак ня можа не пужаць колькасьць тэмаў, якую Ён паставіў на ўлік за такі кароткі тэрмін.

Такімі тэмпамі хутка ў краіне не застанецца ніводнай вобласьці, якая ня трапіла б пад ягоны жастачайшы кантроль.

Страшна ўявіць, які хаос і дэстабілізец наступіць у насьледак незвычайнай інфляцыі.

Спачатку людзі будуць проста не пазнаваць выпускі БТ:

— Прыкаліська, жонка, ужо трэці дзень Рыгорыч нічога не бярэ пад жастачайшы кантроль, — скажа абываталь.

Яшчэ праз пару дзён хіханькі і хаханькі саступяць месца падозраньням.

Сайт аб'яднаных грамадзянаў запусьціць вутку аб тым, куды падзеўся прэзыдэнт, а бабкі ў пад'ездах дадуць волю сваім фантазіям:

— Ён, Францаўна, таму нічога не бярэ пад жастачайшы кантроль, што падсеў на лацінаамэрыканскія сэрыялы і зразумеў, што сьветам кіруе каханьне.

Між тым, у Чырвоным доме будзе ісьці нарада за нарадай.

— Ну, што прыдумалі? — сувора пытае ў міністраў гарант паправак у Канстытуцыю.

Міністры ўважліва стэнаграфуюць ягоныя словы.

— С-кі, я ў цябе пытаю!

С-кі ўздымае галаву.

— Можа, заўтра наведаць шапік, зрабіць ім галавамыйку і ўзяць пад жастачайшы кантроль цэны на «Саўбелку»?

— Ужо бралі ў мінулай пяцігодцы, — кажа сакратарка, праглядзеўшы паперы.

— Тады, можа, цэны на Вашыя партрэты?

Яго прарывае.

— Што-о-о?! Кабінэт адпраўлены ў адстаўку!

Нарэшце новы, трэці за тыдзень, кабмін нешта прыдумляе. На наступны дзень, наведаўшы Маскоўскі выканкам, Ён заяўляе аб «ужастачэньні жастачайшага кантролю» за «жастачайшым кантролем» рэалізацыі ў жыцьці прынцыпу «аднаго акна».

Аднак сытуацыю гэта выратоўвае толькі часова.

Ну, як вам такі сцэнар разьвіцьця падзей?

Жах!!!

Таму трэба хутка рэглямэнтаваць парадак рэчаў у гэтай сфэры, прыняўшы закон «Аб пастаноўцы пад жастачайшы кантроль».

Закон дэталёва ўвядзе квоту пастаноўкі колькасьці аб'ектаў на тыдзень і ў месяц. Такім чынам, зможам захаваць грамадзкі парадак як мінімум да 2020 г.

А там новая хваля навукова-тэхнічнага прагрэсу дасьць шмат новых тэмаў. Напрыклад, у 2034 г. пад жастачайшы кантроль можа быць узяты продаж патрыманых касьмічных ракетаў...

## Піша нам «Белпошта»

**Як прапаноўвала газэта, я быў зьвярнуўся ў «Белпошту» з патрабаваньнем уключыць «Нашу Ніву» ў падпісны каталёг на 2007 год.** Так атрымалася, што адаслаў не заказным, а звычайным лістом. Але адказ атрымаў. Падаю цалкам.

**Паўла Донаў**

Шаноўны Павал Пятровіч!

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства паштовай сувязі «Белпошта» (РУП «Белпошта») разгледзела Ваш зварот у пытаньні ўключэньня газэты «Наша Ніва» ў падпісны каталёг на першае паўгодзьдзе 2007 году і тлумачыць наступнае.

Як што РУП «Белпошта» суб'ект гаспадараньня, дык тады мае права ў сваёй камэрцыйнай дзейнасьці кіравацца эканамічнай мэтазгоднасьцю.

Паводле п.1 арт.391 Грамадзянскага кодэксу Рэспублікі Беларусь, «грамадзяне і юрыдычныя асобы вольныя ва ўкладаньні дамовы. Пануджэньне да ўкладаньня дамовы не дапускаецца, за выняткам выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам ці добраахвотна прынятым забавязаньнем».

У адпаведнасьці з вышэйзгаданым, РУП «Белпошта» мае права не ўкладаць на 1 паўгодзьдзе 2007 году дамовы з рэдакцыяй і (выдавецтвам) і не ўключаць іхняга выданьня ў каталёг.

З павагай,

Начальнік выдавецкага цэнтру «Марка» І.В.Астроўская

**Ад Рэдакцыі.** Добра, што «Белпошта» яшчэ перавозіць лісты ўсіх. А то ж магла б перавозіць лісты толькі тых, у каго яны эканамічна мэтазгодныя, а немэтазгодныя няхай носяць самі... Сорамна прызнацца людзям, што яны проста выконваюць, што ім загадаюць «ідэолягі». Так, як аднаму загадваюць у БРСМ заганяць, і ён заганяе, другому — Красоўскага мучыць, і ён зьдзекуецца з хлопца, так трэцця прафэсійна заганяюць беларускую культуру ў рэзэрвацыю. І кожны сабе знойдзе апраўданьне.

Пошта — прадпрыемства агульнаграмадзкае, манапаліст на сваім рынку, і таму абавязаная аказваць паслугі ў роўнай меры ўсім грамадзянам і ўсім установам. Так было і так некалі стане зноў.

## На тым баку Белавежы

**Неспадзяванкі пачынаюцца яшчэ ў польскім консульстве: замест эўрапейскага «спадарства» на стэндах для атрыманьня візы, што год таму выдавалася за тры дні, маем азіяцкае «господа» і месяц чаканьня.**

На мяжы пад Берасьцем чарга шалёная — тутэйшыя маюць някепскі бізнэс на бэнзіне — тысяча «зялёных» у месяц нікому не замінала. Падобна на тое, што ў нас вырасла цэлае пакаленьне такіх спрытнюг.

На мой погляд, нам трэба пакінуць думкі, што ў Беластоцкім ваяводзтве квітнее беларушчына — адна афіша на тумбе з прапановай паглядзець ды паслухаць тамтэйшыя беларускамоўныя гурты, адна нашая песьня на вясельлі, дзе маладая была зь беларусаў, ды адзін беларускамоўны паліцыянт у Бельску Падляскім — ці не замала за чатыры дні?

Але сапраўдныя «капыткі» на стале побач з традыцыйнымі польскімі стравамі, мэнтальнасьць і гасьцінасьць «людзей крэсовых», навакольныя краявіды падказваюць: мы тут ёсьць.

Абсалютна відавочна, што большая частка праваслаўных храмаў мае занадта добры выгляд для размовы пра ціск з боку дзяржавы. Але мова служак — расейская ды польская. Можа, таму ўсё так і добра звонку. Супрасьлеўскі базылянскі кляштар адноўлены цалкам, вельмі прыгожы і вельмі праваслаўны.

З навакольных мястэчак ці ня самае цікавае для вандроўніка — Дарагічын — тры кляштары над Бугам, фартэцыі былога ўмацаванага раёну «Беластоцкага выступу», файны гатэльчык з добрай кухняй — ці не раскоша?

Увогуле, адпачыць у блізкім замежжы можна з усёй шчырасьцю — дзякуй Богу, зь пяці суседзяў чацьвёра знаходзяцца ў Эўропе. Толькі знайсьці крыху вольнага часу.

**Валер Міцкевіч, Берасьце**

## Дажыліся

**Улада лезе ў кішэні грамадзянаў і прымушае іх выдаткоўваць заробленыя сваёй працай грошы на падпіску на дзяржаўныя газэты.** Докшыцкаму вузлу паштовай сувязі давялі «зьверху» плян падпіскі, які яны выканалі на 100 працэнтаў (добра, што хоць перавыкананьнем не заняліся). Начальнік пошты Р.Каралевіч у сваім інтэрвію раённай газэце «Родныя вытокі» нават не хавае прычын, чаму так вырасла падпіска. «Дзякуючы кіраўнікам арганізацый і іхнім намесьнікам у ідэалягічнай рабоце, цяпер і ў горадзе павялічылася колькасьць чытачоў. Ёсьць станоўчы прыклад у цэнтралізаваным вырашэньні пытаньняў індывідуальнай падпіскі ў некаторых арганізацыях».

Вось дык дажыліся! Мала таго, што ўлады прымушаюць, дык яшчэ і не хаваюць гэтага і называюць прымус «станоўчым прыкладам». Аўтарытэту ўладзе гэта не дадае, але ўсе ў нас прывыклі да дэбілізму.

**Янка Зуброўскі, в.Лапуты Докшыцкага раёну**

## ЖАРТ



## Застаюся пры сваім

**Шчыры, шчыры-шчыры дзякуй Вам за друкаванае беларускае слова!** Гэта велькая-велькая падтрымка для мяне, бо я цяпер знаходжуся ў расейскамоўным асяродзьдзі; штодзённая рэчаісныя размовы — на мяжы з вар'яцтвам: да мяне зьвяртаюца па-расейску, а я адказваю па-беларуску, ці наадварот. Дастала ўжо! А як прыемна чуць беларускую мову! А калі здараецца што-небудзь беларускамоўнае па тэлебачаньні, радыё, дык там такія «пэрлы» праскоквюць — барані Божа! Аж, прабачце, ванітуе ад усялякіх там «канфэт» (меліся на ўвазе цукеркі) ды «флагаў» (на ўласныя вочы бачыла малюнак сьцяга «захад над багнай», пад якім было напісана «дзяржаўны флаг»). Бр-р! Жахліва!

Ведаеце, а я ж сама параўнальна нядаўна стала беларускамоўнай. Раней час ад часу набягалі імпэтныя хвалі беларускае мовы-думкі, але аднойчы прачнулася і зразумела, што больш не магу гвалтаваць сябе, свае думкі, свае вусны расейскай мовай і што мне насамрэч пляваць на тых, якія кажуць мне аб «калгаснасьці» (гэтае слова чамусьці пагардлівым тонам) беларускае мовы. Я застаюся пры сваім меркаваньні на сваёй мове.

Мне здаецца, што я ня майстар пісаць лісты, але тут ужо сэрца загаманіла.

Ноч. Дождж. Бессань. «Наша Ніва».

Думкі розныя...

Вырашала вось даслаць Вам акрамя сардэчнай падзякі яшчэ некалькі сваіх вершаў і кавалачак прозы-роздуму.

Бясконцыя думкі бязьлітасным ранкам...  
Усё, безумоўна, пачнецца спачатку  
І скончыцца ноччу: пампэ, затаіцца,  
Крыху пачакае, крыху загаіцца,  
А потым, узмацніўшыся новай крывёю,  
Прыцісьне да долу, накорміць зямлёю,  
Якая трывала цярпела бясконца  
Пякучае, бруднае, воўчае сонца.

**Ліда N з гораду М**

**Запрашаем усіх, хто ведае Зьмітра Дашкевіча й «Малады фронт», стаць сьведкамі салідарнасьці ў судзе. Будзь разам з намі.**

**Павал Севярынец, Малое Сітна**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

**ЯНКА ЗАПРУДНІК**

# І сказаў Бог беларусу... (1)

1. І сказаў Бог беларусу: Я стварыў цябе паводле вобразу і падабенства Майго, удыхнуў у цябе дыханьне жыцьця і зрабіў цябе душою жывою.

2. Я даў табе розум, і волю, і працавітасьць, каб ты карыстаўся імі дзеля дабра бліжніх сваіх.

3. Прыглядайся да наваколься. Бач, як стварэньні Мае множацца паводле роду іхняга: усякае быльлё, кустоўе, дрэвы, усякая рыба, жывёла й птушка крылатая, і плямёны людзкія — усё працягваецца паводле роду іхняга.

4. У разнастайнасьці прыроды — Мая сутнасьць. Будзь верны ёй, стварай паводле роду свайго і будзеш дабраславёны за гэта.

5. Я ўдыхнуў у цябе здольнасьць называць рэчы й зьявы сваімі імёнамі, каб захоўвалася повязь паміж табой і тваімі нашчадкамі.

6. Нашчадкі будуць тваім замагільным жыцьцём, будуць перахоўваць тваю вечнасьць.

7. Рух і тварэньне — існасьць усяго жывога. У руху і тварэньні ты будзеш апраўдваць сваё існаваньне, свой боскі пачатак.

8. Я даў табе жанчыну як спадарожніцу на тваім зямным шляху.

9. Вы й дзеці вашы будзеце працягваць Маю працу — тварыць паводле вобразу і падабенства вашага. І зямля ваша будзе ў дастатку.

10. Тое, што вы створыце, будзе вашым Эдэмам, у якім Я пастаўлю дрэва жыцьця, каб квітнеў і ня зьвёўся род ваш.

11. Закладаю ў вас энэргію і творчы талент, каб вы ўзбагачалі Маё тварэньне. Вы будзеце ўнікальныя ў Маім шматстайным сьвеце і будзеце адказныя за захаваньне шматстайнасьці.

12. Узнагародай вам за вернасьць Маім запаветам будзе радасьць творчай працы і быцьцё працягам Мяне Самога.

*Вычытана зь Бібліі*
*ў верасьні лета Божага 2006*

# І сказаў Бог беларусу... (2)

Да 100-годзьдзя «Нашай Нівы»

1. І сказаў Бог беларусу: дзьве рэальнасьці пакладзены ў аснову Майго сьвету — чалавек і народ. Імі вымяраецца Мой лад на зямлі.

2. На шырокіх прасторах Майго валадарства Я стварыў мноства языкоў, і ніводзін зь іх ня лішні.

3. Гукі розных моваў мілыя Мне. Яны зьмяшчаюць у сабе сутнасьць Майго творчага акту, існасьць Мае творчае *Свабоды.*

4. Мова твая — паказальнік Мае прыхільнасьці да цябе. Шануй яе, як Мой сьвяты дар табе.

5. У мове тваёй закладзены гукі і хварбы зямлі, на якой ты жывеш. Мова твая — голас Мае прыроды.

6. Мовай сваёю ты будзеш услаўляць Мяне, каб прымальнай была твая ўдзячнасьць Мне.

7. У аснову запавету пра шанаваньне прародзічаў Я паклаў перахоўваньне мовы продкаў, каб душы іхнія маглі спачываць спакойна.

8. Праз мову ты будзеш трымаць лучнасьць з прашчурамі да саракавога калена і глыбей у вякі. У мове — твая і тваіх нашчадкаў вечнасьць. Памятай пра гэта, узгадоўваючы дзяцей сваіх.

9. У цябе будуць цэлыя пакаленьні тварцоў мовы, ахоўнікаў Маёй духовасьці. Гукамі мовы ты перадасі самыя глыбінныя пачуцьці свае несьмяротнае душы, самыя высокія ўзьлёты творчае думкі.

10. Па мове тваёй будуць пазнаваць цябе іншыя народы.

11. Творчасьць словамі, якія Я даю табе на зямны шлях, будзе сьведчаньнем твае вернасьці Мне. За гэта Я ўзнагароджу цябе квітненьнем культуры і духовай сілаю ды павагай сярод усіх языкоў Маіх.

12. Як прадаўжальніку вечнасьці аднаго з Маіх народаў Я закладаю ў тваю душу адчуваньне волі, каб ты ніколі не забываўся, што *мова — Свабоды аснова.*

*Вычытана зь Бібліі ў кастрычніку лета Божага 2006*



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

апавяданьне

# Не мычыце, Францаўна!

**ПАВАЛ КАСЬЦЮКЕВІЧ**



FESTIVAL–GOOD–BY.WEBSPRUCH.DE

Вы гатовыя?

Ну, тоді, поєхали, друзі!

Усё гэта адбылося, скажам, у Італіі. Італія месьціцца на Апэнінскай паўвысьпе, асноўныя галіны прамысловасьці: станковае і машынабудаваньне, вінаробства. ВУП — 140 млрд эўра, насельніцтва — 50 млн дуп.

Флярэнцыя — дурны горад, свавольная какетніца: то весяліцца бяз дай прычыны, то б’е парцалян і кідаецца на маладых людзей з нажом для рэзкі памідораў. Гэта калі ў гуморы, але толькі паспрабуйце заляцацца ў іншы час, адразу надзявае глыбінныя строі, нават не пурытанскія, глыбей, глыбей. Паказвае трупна-зялёныя фарбы жонка гандляра, нябожчыка: «Мы такія жалобныя, мы такія, як вы можаце да нас, такой небаракі, удавы, заляцацца?» Гляньце на мапу Італіі: Італія як Італія, бот ботам, а Флярэнцыя — не разьбяры-бяры што, чорная дзірка Галівуду.

На флярэнтыйскім карнавале ўсе нажлукціліся, і п’яныя кітайцы стралялі ў конскі зад сьвятога Вацлава з пэтардаў. Прага — сталіца Італіі, а Флярэнцыя — хрэнь нейкая.

Яна прыехала на ровары і сказала: «Дай, дай мне ўкалоцца». Жартую, яна сказала: «У вас мыла ня знойдзецца?» Ехала на ровары, уся такая, ва ўсім такім, спалучэньне «паркаль-вэльвэт», такога за грошы ня купіш, на ровары, але з абцасамі і парасонам, заходзіць у краму і кажа. Ну, вядома, у краму, і ні ў які не «магазын». Бабуля мая казала — «магазын». Ды яшчэ з націскам на другое «а». Аднак «магазын» — гэта частка аўтамата ў такой далёкай, няіснай, але суседняй Югаславіі. Інфармацыя для развагі: жаўнеры войска італьянскага ваююць зробленай у форме «М-16» піццай. Генэралам лічыцца той, хто зьеў тры пачкі равіёляў.

Пытаньне, канечне, бязглуздае. Крама ж спэцыя-лі-за-ва-ная. Мыла ў краме ёсьць, якое хочаце, процьма. Заварное, у кружочак, безалькагольнае, кашміравае, расклёшанае, з турбанаддзіманьнем.

І ніхто, ніхто ня ведае, што ў гэтыя хвіліны ў Мазыры на лаўцы ў парчыку выпіваюць два чалавекі: адзін лысы, другі прагуляцца выйшаў, і размаўляюць аб тым, ня ведаю аб чым, ну, скажам, аб тым, як у горадзе Флярэнцыя на паўпатаемным зборышчы мылаедаў, якое абавязкова адбудзецца неўзабаве на адной віле, будуць гаманіць Фабіё, Рабэрта і Джанлюка. Фабіё на рэдкасьць бялявы, што мае радовішча жаночых ботаў на поўначы Італіі. Апошні суразмоўца не такі важны для апавяданьня, таму заўважым, што Джанлюка — ён чарнявы, непаголены мачоіст, і ягоная роля будзе заключацца ў тым, што пры канцы ён правалiцца ў люк. Усе трое багемяцца з калыскі. Але, увага! Памылкаю будзе лічыць, што яны і тут таксама сабраліся адно патусавацца. Сьпяшаемся паведаміць, што яны ды іншыя сябры клюбу зьбіраюцца штосерады і штопятніцы з мэтаю добра прабавіць час і зьесьці па кавалачку духмянага — уй, матачкі, духі займае, — чароўнага — ніхто не ўратуецца — валіся адразу, — мыла. Вечарына на віле будзе: пер’е й бліскаўкі, кока й гера, Буда й Пэшту.

Выйшаў я ў лазьню памыцца. Натуральна, ручнік, мыла кавалак у руцэ трымаю. Кацька дала са старых яшчэ запасаў. Італьянец па горадзе ідзе. Як убачыў, дык кажу — італьянец. Адразу італьянец і ўсё.

— А, што й та ў вас, э, тут за краіна? — пытае і на маё мыла касавурыцца.

— А вы па справе па якой ці проста цікавіцеся? — кажу.

— А я, гэта, тут бізнэс круціць хачу, — пастаўляць вам грошы, а вы мне — гаспадарчыя тавары на мільёны рублёў у буйных памерах. А што гэта ёсьць у вас за мыльца?

Я ня сьцяміў усяго (чалавек я такі), а ён — хоп, схапіў маё мыла і ўцякае.

— Ах, ты, — кажу яму ўвасьлед, — сволач, прасьцітут! Зла на цябе не

хапае.

Хлопчік-схопчик, де ти був?
Зновку сливку з косткай ів?

Маска, маска, я цябе ведаю. Ты — Віцебская вобласьць.

З купленым мылам яна паехала на сустрэчу з каханым, які яго зацяты фэн. І перад гэтай сустрэчай на чыгуначным пераезьдзе яна сустрэла сустрэчны цягнік. Але нічога зь ёй ня здарылася — абтрэсла вэльвэт ад пылу і паехала далей, а вось цягнік па кавалках зьбіралі. Не падкручвайся пад ногі закаханым дзяўчатам, скажам мы. Абтрэсла вэльвэт і паехала прайсьці інструктаж ад любага перад наведваньнем клюбу аматараў мыла.

«Са старшынём клюбу размаўляй разьняволена, хлопец ён наскі. Але, любая, трэба зьесьці мыла. Прынамсі раз на сустрэчу. Танчы, весяліся, і потым неназойліва, але каб усе пабачылі, зьясі адзін шматочак. І можна адразу прагнаць тонікам, тэкілай. Асабіста я рэкамэндую гарэлку з «Рэд булам». Торкне як мае. Давай, любая, усьміхніся».

— Так, так, спадарства, такая цяпер дарагоўля! Абмыляльныя рэчывы шалёных грошай каштуюць. І як вынік — звычайны брусок «дэлюкс» — пяцьдзясят эўра. Пяцьдзясят! Моцарт.

— Ня можа быць, ваў! Што вы кажаце, гэта ж нейкая жуда! Штраўс.

— Фі, поскудзь! Паганіні.

— Быў я тут у адным месцы. Там адзін мужык выйшаў у лазьню памыцца. Натуральна, ручнік, брусок у руцэ трымаў. Гаспадарчага мылца. Ну, я яго і таго. Вівальдзі.

— А што думаеш ты, любая? Шубэрт.

І тут яна кажа, божа ты мой, і тут яна кажа, кажа, кажа:

— Не падабаецца, не падабаецца, не падабаецца! Сэктанты клятыя! Ненавіджу!

Я хачу па-сапраўднаму. Каб бяз мыла. Рабэрта, колькі можна яго есьці? Смактаць, лізаць, садзіць у першых шэрагах, распавядаць яму пра ВКЛ, перашываць для яго сапраўдную вопратку ад Барбі, запіхваць у брусок сім-картку, крывіць зь сябе Маўглі, езьдзіць у апраметную на мэтро. Хто вы такія тут? Лейтэнанты трускалачных палёў? Во дзе вы ў мяне! Абрыдлі!

Трах-бах, яна абмылкам старшыні ў скронь, ён плясь на зямлю — імгненная сьмерць. Крыкі, амбулянсы. Працяг нецікавы. Прыязджаюць карабінэры — выхопліваюць з кабуры свае выштукаваныя са спагецьці пісталеты, і абгавораны Джанлюка, згодна са зробленай вышэй заяўкай на правядзеньне санкцыяванага калецтва, пасьпяхова правальваецца ў люк. Каханьне трыюмфуе. Мілянскія каты ў захапленьні.

Тым часам у Маладэчна, на вуліцы Савецкай, былой Віленскай, а яшчэ раней Савецкай, а яшчэ раней Віленскай, у доме нумар 3, на трэцім паверсе, яшчэ да таго, як яна адтуль гахнулася і зламала сябе аўтамабіль, але ўжо пасьля таго, як пасьпела ажаніцца з маім татам,

мама
мыла
раму.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Расейска-беларускі размоўнік** / Склад. А.І.Лазаравай. Масква: Астрэль—Транзыткніга, 2006. — 192 с.

У сэрыі расейска-іншамоўных размоўнікаў, укладзеных А.Лазаравай і выдаваных у Маскве, зьявіліся й дзьве вэрсіі (у цьвёрдай і мяккай вокладцы) «Расейска-беларускага размоўніка».

Літарамі расейскага альфабэту падаецца вымаўленьне беларускіх адпаведнікаў расейскіх фразаў і словаў. Паказальна, што выпушчаны ў Расеі размоўнік арыентуецца не на лексычны запас крапівоўскіх слоўнікаў, а на той, якім рэальна карыстаюцца цяпер беларускамоўныя грамадзяне: «спадар», «паважанае спадарства», «напоі», «вайсковец», «гатоўка», «гарбата», «расійская мова», «ангельская мова». Праўда, у размоўніку сустракаюцца трасяначныя рэцыдывы: «гавядзіна», «водка», «ледзянцы», «у банке», «**тарговы** комплекс», «ва ўнівэрмаге», «разьмер», «напячатаць», «камэра для хаваньня багажу», «расстройства жывата», «недамаганьне».

Але, як кажуць, і за гэта дзякуй, бо на тле сёньняшняй моўнай палітыкі беларускага кіраўніцтва маскоўскае выданьне расейска-беларускага размоўніка наагул выглядае як ледзьве ня выклік. Апошняе ж выданьне гэткага кшталту кніжкі ў беларускім дзяржаўным выдавецтве («Русско-белорусский разговорник» Арнольда Міхневіча) было ажыцьцяўлёнае на самым пачатку 1990-х.

**Лявон Баршчэўскі**

**Касьцёл Маці Божай Нястомнай Дапамогі. Двор Шэметава.** — Менск: Про Хрысто, 2004. — 32 с.

Дзьвюхмоўная (беларуска-польская) кніжка, фактычна буклет, прысьвечаная парафіі і касьцёлу ў Шэметаве на Мядзельшчыне. Гістарычныя зьвесткі паводле матэрыялаў, сабраных Канстанцінам Іватовічам, апрацавала Барбара Аршэўская. Публікуюцца вельмі цікавыя фатаздымкі з архіву парафіі. Маю ўвагу прыцягнуў даволі незвычайны здымак 1960—1970-х г.: ксёндз Станіслаў Кучынскі зьбіраецца наведаць хворых — ён апрануў на галаву шлем, пачапіў ахоўныя акуляры ды сядае на матацыкл (і гэта ўсё ў сьвятарскім адзеньні).

Можна сьцьвярджаць, што цяпер ў Беларусі разьвіваецца ня толькі традыцыйнае краязнаўства, але таксама краязнаўства царкоўнае (парафіяльнае і прыхадзкое).

**ADz**

**Белорусы смеются: карикатуры, юмор** / Авт.-сост. Елена Клименко, Вячеслав Клименко. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2006. — 407 с. 2000 ас.

Выхад зборніка засьведчыў існаваньне беларускай школы карыкатуры, адсутнасьць якой гняла рэдактара «Вожыка» на пачатку 1990-х. У таўшчэзным томе ўкладальнікі прэзэнтуюць работы двух тузінаў сьмехачоў: А.Гармазы, А.Карповіча, П.Козіча, А.Папова і інш., а таксама дасьціпныя інтэрвію з карыкатурыстамі. На жаль, не знайшлося месца для такіх майстроў, як У.Чуглазаў і Я.Царкоў. Гумар у зборніку — цалкам на дух часу — дамінуе над сатырай, і дэвізам бальшыні малюнкаў маглі б стаць грыбаедаўскія «памяркоўнасьць і акуратнасьць». У менскіх кнігарнях каштуе каля 40 тыс.

**ВР**

У полацкім выдавецтве Аляксандра Судніка выйшла чарговая, чацьвертая, кніга з сэрыі «Спадчына Полацкай зямлі». Гэтым разам за аснову кнігі ўзяты «Путеводитель по городу Полоцку», які быў надрукаваны ў 1910 годзе ў Полацку да ўрачыстасьцяў пераносу мошчаў сьвятой Еўфрасіньні, патронкі зямлі беларускай, з Кіева ў родны горад. Менавіта гэты даведнік, дзе нават пазначаныя кошты на харчы, тавары і паслугі, дапамог свойчас Уладзімеру Арлову ў напісаньні аднаго з разьдзелаў знакамітай кнігі «Таямніцы полацкай гісторыі». Унікальнасьць новага выданьня ў тым, што ўкладальнікі з дапамогаю супрацоўнікаў полацкага краязнаўчага музэю зьдзейсьнілі вялікую, можна сказаць навуковую, працу. Яны напісалі шматлікія камэнтары, у якіх апісваецца тагачасная прамысловасьць гораду, манастыры, суднаходзтва, прыведзены біяграфічныя зьвесткі асобных палачан, у тым ліку і Хаіма Клячка, уладальніка полацкай друкарні, дзе быў надрукаваны даведнік. Кніга прыгожа выдадзеная, мае шмат фотаілюстрацыяў. Прычым шэраг зь іх надзвычай унікальныя і друкуюцца ў беларускіх выданьнях упершыню. Бадай, самыя адметныя — каляровыя здымкі пачатку XX ст. славутага расейскага фатографа Сяргея Пракудзіна-Горскага, які сярод першых у Расеі праводзіў экспэрымэнты з каляровай фатаграфіяй. Амаль увесь яго архіў сёньня захоўваецца ў бібліятэцы Кангрэсу ЗША. Нейк незвычайна бачыць на каляровых здымках страчаныя архітэктурныя помнікі гораду, у тым ліку касьцёл Сьвятога Стэфана, драўляны млын на Палаце або бедныя полацкія раёны прыватнай забудовы ў цэнтры гораду. Што ні кажы, а XIX ст. было для Полацку, бадай, самым змрочным, бедным і глухім.

**Васіль Кроква**

# Беларусы разьнесьлі славенцаў у другой палове гульні



Рана радаваліся.





Зборная Беларусі правальна пачала адборачную кампанію да Эўра-2008. У трох матчах нашы гульцы змаглі ўзяць толькі адзін пункт, згуляўшы дома ўнічыю з альбанцамі і без варыянтаў саступіўшы ў гасьцёх яўным фаварытам групы галяндцам і румынам. Славенцы таксама пачалі не ахвоцi, прайграўшы баўгарам і пераадолеўшы нямоглых люксэмбуржцаў.

На сёньняшні дзень абедзьве зборныя прыкладна аднаго ўзроўню. У сваёй гісторыі беларусы і славенцы сустракаліся двойчы, і абодва разы была зафіксаваная нічыя 1:1. Беларусам, каб працягнуць барацьбу за пуцёўку ў Швайцарыю і Аўстрыю, трэба было тэрмінова перамагаць футбалістаў з балканскай краіны. І нашы хлопцы, да іхняга гонару, справіліся з гэтай задачай.

На сямнаццатай хвіліне гульні лік адкрыў Дзяніс Коўба, які літаральна прапіхнуў мяч у сетку зь лічаных мэтраў ад варот, але не пасьпелі беларусы як сьлед адзначыць гол, як Бошцян Цэсар ударам галавой выраўноўвае лік. Беларусы відавочна саступалі ў барацьбе з супернікам на другім паверсе. На перадапошняй хвіліне першага тайму Клемен Лаўрыч таксама галавой выводзіць гасьцей наперад.

У перапынку Юры Пунтус, відаць, змог знайсьці патрэбныя словы для сваіх гульцоў. Яны выйшлі на другі тайм, зарыентаваныя на барацьбу. Асабліва гэта было заўважна на прыкладзе Сяргея Карніленкі. Форвард днепрапятроўскага «Дняпра» цягам пятнаццаці хвілінаў аформіў дубль. Беларусь пачала выйграваць 3:2.

Апошнія хвіліны гульні былі падобныя да арэляў, калі перавага магла схіліцца ў любы бок. Славенцы трапілі ў штангу. А беларусы забілі. На 85 хвіліне ўдар Уладзімера Карыцькі са штрафнога быў трапны. 4:2 — такі вынік зафіксаваў сьвісток галоўнага судзьдзі матчу. Беларусы сёлета атрымалі першую перамогу.

**Зьміцер Панкавец**



**Браток, нашы забілі!**



**Саму гульню я таксама здымала :)**

**Працяг на старонцы 32.**



Больш за ўсё ў футболе люблю перапынкі :)



Гоооол!!! (Сяргей Карніленка)



Усё. Перамога. (Уладзімер Карыцька).



Трэнэр Пунтус. Перамаглі 4:2 (калі я, канечне, нічога не пераблытала)

Здымкі Юліі Дарашкевіч



## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

### ЦУНАМІ

Восень… яшчэ адна восень, шаблённа
Лістота кружляе на банэрах сайтаў.
Ты ў Менску ў футры, я ў Вашынгтоне
Ў кашулі, шортах, красоўках ад Nike.

Сяджу ў кавярні. Гляджу, як нясьпешна
Ты пішаш мне весткі з Радзімы ў «асьцы»,
Жартую, хачу, каб было табе сьмешна,
А мо не даю ў дэпрэсію ўпасьці.

Нас падзяліла сьцяна альбо сьцены,
Мэрыдыяны, часовыя пасы.
Сустрэліся мы з табой на імгненьне
І разышліся, бы карціны Пікаса,

Што былі раскуплены на аўкцыёне,
Ў калекцыі зьвезены ці на выставы.
Ты ў Менску стаіш, я — у Вашынгтоне.
Мы экспанаты — для кагосьці забава.

Восень шаблённа плача дажджамі,
Кроплі цытатамі падаюць долу.
І мы іх хапаем, і дасылаем лістамі
Адно аднаму, і нашыя ролі

Належаць ня нам, а тым, што над намі,
Хто ставіў нас ў рамкі, ў музэй пад ахову.
Але прыйдзе час, калі мы цунамі
Змыем зь сябе ўмоўнасьцяў колы.

### МАЎНТ МІТЧЭЛ

ветру амаль няма толькі неба
і parkway зьліваецца ў далечы з сонцам
мёртвыя дрэвы колеру срэбра
унізе а ўверсе абрысы бога
здаецца бліжэй да свабоды да сэнсу
здаецца што веры болей і праўды
здаецца што можна даскочыць далезьці
ухапіўшыся за сакральныя ляўры
ці церні ці аўру ці проста здаецца
што ўсё што ўнізе больш неістотна
і ёсьць толькі ты ў цэлым сусьвеце
маленькі маленечкі самалёцік

*Апалачы, ЗША*

# Кожнаму свая цыбуліна

Пра Аляксандра Фядуту, Васіля Быкава, генэрала Сівакова і маральны рэлятывізм. Піша **Пётра Садоўскі**.

Час зьмяняе людзей. Рамантыкі становяцца прагматыкамі, баязьліўцы — героямі, сьляпыя становяцца відушчымі. Улюбёныя вучні могуць неаднойчы здрадзіць, а потым даць грунт іншым для выратаваньня душы. Іншыя, паводле загаду настаўніка ды абставінаў, становяцца шамшурамі. Пасьля іх апраўдваюць у апокрыфах. Такое бывае ня толькі ў Эвангельлі, але і ў жыцьці. Далёкія падзеі больш-менш аб'ектыўна асэнсоўваюцца праз гады і эпохі. Актуаліі ж пякуць балюча. Ці можа творчая ды жыцьцёва актыўная асоба быць беззаганай ва ўспрыманьні сучасьнікаў? Дзе мяжа маральнай прыстойнасьці?

Я, напрыклад, прыблізна ўяўляючы склад чытацкай аўдыторыі «Нашай Нівы», быў усё ж зьдзіўлены вынікамі першага апытаньня чытачоў, каму б яны сёньня надалі годнасьць «народнага пісьменьніка». Што гэта за дрэйф эстэтыкі прыгожага ды нацыянальнай этыкі ў бок чыстага эмацыйнага драйву? Магчыма, тут паўплываў папсовы расейскі праект «народны артыст»? Але ж дзіўна, калі побач з Генадзем Бураўкіным стаіць Адам Глёбус? Я ня думаю, што, гледзячы на зорнае неба або застаючыся сам-насам з сабою ўначы, сп.Глёбус адчувае так, як піша. Какецтва зь літаратурным вуаерызмам і шоў-прыёмы на мяжы маральна-эстэтычнага фолу існуюць ўжо дзясяткі гадоў там, дзе ёсьць рынак. Людзі з талентам мастака і мэнэджэра слушна робяць, што раскручваюць самі сябе. Няма ж цяпер таварыства «Веды» ды пуцёвак з Саюзу пісьменьнікаў. Можна зразумець тых пісьменьнікаў, што друкаваліся яшчэ на савецкія грошы, калі іх часам бянтэжыць дынамізм Андрэя Хадановіча ці Ўладзімера Арлова. Аднак нельга ўсур'ёз сьцьвярджаць, што літаратурныя застыглыя пэрформансы трыццацігадовых а ля «Бум-бам-літ» — сапраўдная літаратура.

Карыстаючыся мэтафарай нобэлеўскага ляўрэата Гюнтэра Граса, можна сказаць, што кожны творца па-свойму лупіць сваю цыбуліну і кожнаму па-свойму яна шчыпіць пры жыцьці вочы. На жаль, у нас дыскусіі пра эстэтыку і мараль ня вельмі папулярныя. На апошні значны твор Граса (цэлых 477 старонак) *Beim Häuten der Zwiebel* («Лупячы цыбулю»), паводле падлікаў *Frankfurter Allgemeine Zeitung*, у Эўропе адгукнуліся 42 вядомыя інтэлектуалы і 159 мэдыйных рэдакцыяў. Прадметам абмеркаваньня стала не сама асоба Гюнтэра Граса — эстэта і мараліста, які прыгадаў, між іншым, што ў юначым узросьце перад амэрыканскім палонам і раненьнем зь лістапада 1944 г. ён добраахвотна служыў у СС (тут шмат розных спэкуляцый), — а больш шырокае пытаньне: ці можа эстэт быць маралістам і наадварот? Ці можа эстэтыка і паэзія ў шырокім сэнсе (Dichtung) быць вышэйшай за мараль?

У згаданай кнізе ды шматлікіх інтэрвію апошніх гадоў Гюнтэр Грас, гаворачы пра свае этычныя і эстэтычныя пошукі і разрыў з каталіцкай царквою ў 1974 годзе, пазыцыянуе сябе побач з сучаснымі бліскучымі інтэлектуаламі Пэтэрам Гандке ды Карлгайнцам Дэшнэрам, якіх параўноўваюць з Гайнэ і Заля, і прызнаецца, што ў эпоху Адэнаўэра, які прывёў пасьляваенную Нямеччыну да дэмакратыі, свабоднага рынку і росквіту, для яго, некалі рамантычнага юнака 1940-х гадоў, эстэтыка нацыянал-сацыялізму была больш гарманічная і прывабная, чым сьмярдзючае шпісьбюргерства і фарысэйства высокага каталіцкага асяродзьдзя ў сталым веку. (Тут неяк адразу ўзьнікае рэфлексія пра эстэтыку і маральнасьць РПЦ на беларускіх абшарах ды пра дачыненьні нашых інтэлектуалаў з царквой як грамадзкім інстытутам.)

Дарэчы, выдатны аўтар, але небездакорны сацыяльна-грамадзкі эстэт Эміль Заля быў выдатным маралістам, калі пісаў сваё вядомае эсэ *J'accuse* («Я абвінавачваю») падчас афэры Дрэйфуса. Выкшталцоны мараліст і эстэт Сартр, які ў свой час адмовіўся ад Нобэлеўскай прэміі, гістарычна вінаваціў Флябэра і братоў Ганкураў за залішні эстэтызм і грамадзянскае маўчаньне, хаця, паводле сьведчаньня сучасьнікаў, пасьля вяртаньня зь нямецкага палону ўвосень 1941 г. сам ахвотна заняў месца гвалтоўна адпраўленага на пэнсію свайго калегі-габрэя.

Публічна распранаюць сябе ў той ці іншай ступені людзі з мастацкім бачаньнем сьвету, падпітыя, хворыя на галаву ды хітраватыя прагматыкі для піяру, толькі імітуючы тое «лупленьне цыбуліны». Разважаючы пра жыцьцё, пішучы ўспаміны ды малюючы партрэты сучасьнікаў, аўтары малююць адначасна і свой партрэт. Гермэтычных аўтараў вельмі мала. З нашых я ведаю хіба Сьвятлану Алексіевіч. Ейныя партрэты сучасьнікаў вельмі мала гавораць пра ейны ўласны ўнутраны сьвет. Псыхааналіз тут не дапаможа. Іншая рэч — дзе аўтар шукае гармонію, калі проста жыве, а ня творыць. Пачытайце тэксты даўняй сяброўкі Сьвятланы — Марыі Вайцяшонак, і шмат што стане ясна.

Зьвернемся больш прадметна да нашых беларускіх прыкладаў, больш дробнага ці больш значнага маштабу. Зразумела, я тут не прэтэндую на абагульненьне, а

**Пётра Садоўскі** — Пасол Беларусі ў Нямеччыне (1992—1994), дэпутат Вярхоўнага Савету XII скліканьня.



выкладаю толькі свае ўражаньні. І сутнасьць не ў імёнах, якія я буду згадваць. Хацелася б наблізіцца да спэцыфікі беларускай нацыянальнай эстэтыкі ды этыкі прыгожага. Заганнасьць яе чысьціні — у сузіральнасьці, імкненьні да хрысьціянскага ідэалізму, можна сказаць нават — ленасьці, недынамічнай тугі па сьветлым заўтра. Сутнасьць у эстэтычным ды маральным камфорце, які мы адчуваем, успрымаючы тую ці іншую падзею. Ёсьць такое беларускае слова «вінаваціцца». Пра яго некалі вельмі добра пісаў Віктар Казько, узгадваючы сваю маці. Так яна казала, калі ёй цяжка было чуць і бачыць злое. Яна шкадавала нават пустадомкаў і жадала таму, хто чыніў зло, разуменьня сваёй слабасьці чыніць іншым благое. Яна «вінавацілася» за чужое зло, за чужы грэх. На нашай сацыяльна-гістарычнай сцэне часта граюць далёка ня лепшыя асобы. Але гэта зазвычай людзі бяз комплексаў, незалежна ад таго, ці гэта геаграфічная набрыдзь, ці дамарослыя пустадомкі, якія ня лічаць, што культурная аселасьць ды магілы продкаў — гэта маральнасьць. Для сучасных пушкіністаў Пушкін састарэў. Узгадайце ягоныя «два чувства дивно близких нам». Мы разам, добрыя, разумныя, адукаваныя, з нашай талерантнай этыкай, схільныя блізу «вінаваціцца» як бы за нашых (але па сутнасьці чужых нам) амаральных герольдаў.

Уявіце сябе ў глядзельнай залі, дзе на сцэне ваш знаёмец бярэ фальшывыя ноты. Вы апускаеце галаву ад сораму. Назаўтра у вас могуць разбалецца галасавыя зьвязкі. Я вельмі разумею прафэсара Юр’я Хадыку, калі ён піша пра свой эстэтычны дыскамфорт, калі бачыць, як ужо немалады грузнаваты прэзыдэнт зь вельмі пасрэднай тэхнікай бегу перамагае на ролікавых лыжах маладых прафэсійных спартоўцаў. Гэта гаворыць пра стан грамадзтва ня менш, чым зьбіцьцё АМОНам дэманстрантаў.

Вось я атрымліваю запрашэньне Беларускага ПЭН-Цэнтру на прэзэнтацыю кнігі А.Фядуты «Партрэты сучасьнікаў»… з нагоды 100-гадовага юбілею «Нашай Нівы». Тры кропкі тут перадаюць фігуру нечаканасьці. Якое дачыненьне мае Фядута да 100-годзьдзя «НН»? Для мяне гэта — архетып, антыпод гістарычнага праекту «НН». Я ня маю на мэце збэсьціць Фядуту. Ён мае права быць тым, чым ёсьць. Ён ня можа быць іншым. «Наша Ніва», кажучы каструбавата-патасна, перадусім — гістарычны маральна-этычны праект беларускай нацыі. Цяпер ён паступова набірае вагу і з гледзішча мадэрновай эстэтыкі. Нехта назваў Аляксандра аднойчы нашым эстэтам ад эсэістыкі. Ён — нястомнае пяро. Ён ня можа не

**Працяг на старонцы 36.**



# Кожнаму свая цыбуліна

Працяг са старонкі 35.

пісаць. Выпісаўшыся на апазыцыі ды «аляксандрыках» (мой наватвор па аналёгіі зь «піліпікамі»), ён пайшоў па галоўных рэдактарах недзяржаўных СМІ ды ўсё пытаўся: «Пра што пісаць?» Фядуту часам цікава чытаць. Чытаючы рубрыку «НН» «Піша Адяксандар Фядута», сапраўды можна знайсьці шмат цікавага. Хто б яшчэ з нашых эсэістаў мог бы зьмясьціць Макаёнка ў мадэрновы эўрапейскі кантэкст або знайсьці ў Быкава нешта такое, пра што ён сам і ня сьніў. (Увогуле такое ў мастацтве здараецца. Бродзкі называе гэта спантанным прароцтвам паэзіі.) Я амаль не жартую. Фядута спрыяе ператварэньню «НН» і ў эстэтычны праект, пазбаўляе яе сялянскага флёру і прастаты пачатку мінулага стагодзьдзя, нават робіць зьлёгку глямурнай. Ён ня скажа, напрыклад, што аўтарка (ці аўтар) нешта сплягіяцілі. Ён скажа пра абазнанасьць ды начытанасьць.

Падобна, моцныя асобы заўсёды фасцынавалі Аляксанда Фядуту. У сваім эсэ ў часопісе «ARCHE» ён узгадвае, што некалі, у Ленінградзе, пачуўшы ў гатэлі ад буфэтчыцы пра сьмерць генсека Юр'я Андропава, чуйны юнак не экзальтавана-публічна, а сам сабе расплакаўся: «Сьмерць Андропава ў вачох дваццацігадовага гарадзенскага студэнта — падзея сур'ёзная. Менавіта пры ім на вуліцах гораду, дзе адбыўся апошні сойм Рэчы Паспалітай, перасталі трапляцца п'яныя, а на прылаўках зьявілася кілбаса. Пры думцы аб тым, што п'яныя ізноў зьявяцца, а кілбаса зьнікне, сьлёзы жалобы самі наварочваліся на вочы. Я падняўся ў нумар, выплакаўся…»

Наступным аб'ектам захапленьня дынамічнага моладзевага лідэра Аляксандра Фядуты стаў Аляксандар Лукашэнка, які абяцаў дбаць пра кілбасу і чыстыя вуліцы ў беларускіх гарадох. У коле «маладых ваўкоў» Аляксандар быў, несумненна, самы таленавіты эстэт. Цяпер ужо эвалюцыянаваны ў апазыцыянэра «малады воўк» Анатоль Лябедзька, у 1994 г. толькі лубочна-папулісцкі эсэіст, згадвае — сёньня ўжо іранічна — зарыфмаваную эстэтычна-маральную ляўдацыю Пераможцу, якую склаў Аляксандар Фядута: *«Лукашенко с гением природным / Смело гневом овладел народным / Дай нам Бог, чтоб этот смелый лев / Усмирял и впредь народный гнев… »* (цытую паводле «Народнага тэлевізара» У.Падгола «Дуэль Лябедзька—Лукашэнка»). Мая «начытанасьць» ніяк не дае мне пазбавіцца ад паралельнай асацыяцыі зь вітальным тостам «Многія лета» вялікага расейскага паэта-дэмакрата Мікалая Аляксеевіча Някрасава, які ён рыфмавана выказаў генэрал-губэрнатару Паўночна-Заходняга краю Міхаілу Мураўёву, які з дыктатарскімі паўнамоцтвамі задушыў антырасейскае паўстаньне 1861 г.: *«Бокал заздравный поднимая, / Еще раз выпить нам пора / Здоровье миротворца края! / Так много ж лет ему, — Ура!»*

Ужо сталым маладзёнам і ўбурэлым журналістам, напісаўшы дома ўжо не адну піліпіку на адрас колішняга куміра (я ўжо прапаноўваў нэалягізм «аляксандрыка», паводле аналёгіі з Дэмасфэнам і Піліпам Македонскім), Аляксандар Фядута зьехаў ва Ўкраіну і ўжо адтуль вітаў як знакавая фігура беларускай дэмакратыі моладзевы намётавы гарадок на Кастрычніцкай плошчы: целам я ад вас далёка, але душа мая — з вамі. І пазьней разумна і лягічна пакрытыкаваў лідэраў беларускай апазыцыі. Я ня ведаю, як каму, але мне няёмка чытаць. Нешта тут ёсьць бясстыжае, як бы сказалі на полацкай трасянцы. Хаця Фядута часам шмат што слушна піша пра апазыцыю. Рэч тут пра сумленьне, сьціпласьць ды маральнае права павучаць. Як бы ня страціць катэгорыю сораму. «А ў мяне эвалюцыя поглядаў!» — скажа элястычны хуткі розум.

Перабіраем мы часта і ў адваротным: эстэтычных ацэнках нашых знакамітых дзеячаў-творцаў. Назваўшы іх клясыкамі ды апосталамі, дзякуючы іх бездакорным маральным якасьцям, мы часта хвалім тое, што яны самі лічылі праходным і ня вартым увагі ці нават недасканалым з гледзішча эстэтыкі. Мне давялося аднойчы больш за тыдзень правесьці з Васілём Быкавым у Нямеччыне ў якасьці дэпутата парлямэнту і перакладчыка. Так патрапіла. Васіль Уладзімеравіч вельмі крытычна ставіўся да некаторых сваіх надрукаваных выступаў, асабліва экспромтаў на прэсавых канфэрэнцыях. Чытаючы цяпер, напрыклад, быкаўскую «Доўгую дарогу дадому», я быў эстэтычна захоплены толькі ў тых месцах, дзе згадваецца пачатак вайны. Астатняе набывала маштабы маральнай значнасьці толькі дзякуючы ўсьведамленьню таго, што гэта Васіль Быкаў. Гэта як пры чытаньні псальмаў — важная, так бы мовіць, «прэсупазыцыя». Дарэчы, барадулінскае «паэтычнае пашырэньне» псальмаў мяне захоплівае больш, чым яны самі. Я, канечне, разумею, што гэта ад майго гнастыцызму і таго, што барадулінская мова — амаль мая родная. Тут ёсьць і свой мінус. Уладзімер Някляеў эстэтычна захоплена піша, што некалі з слоўніка Барадуліна нехта дазнаецца, што «ўручча» — не адно мікраараён Менску, дзе чамусьці няма ручаёў. Для мяне тут захапленьне толькі ў тым, калі аўтар напіша нешта накшталт «Нябачны Валадар Сьвету знойдзе карнае ўручча для хцівых прыхадняў», узвысіўшы радасна па-купалаўску «простае» слова. Для мяне «ўручча» — усё тое, што трапіць пад руку і прыдасца да моманту: ці сабаку адагнаць, ці воз падсьверыць. Пры жаданьні паэтычны вобраз можна пашырыць у другі бок аж да фрывольнага. Радаснае валоданьне словам часта сьцірае межы паміж эстэтычным і маральным. Тады губляецца шмат ад таго і другога. Такое назіраем у барадулінскай

«Дуліне», якая пісалася, між іншым, як на канвэеры.

Для мяне найвялікшая асалода і камфорт — чытаць Янку Брыля ці Марыю Вайцяшонак. Тут заўсёды час, прастора, мараль, эстэтыка, неба, трава, людзі — усё нясьпешна і на месцы. Купаесься ў мове і чыстых пачуцьцях. Аднак я цалкам згодны з Андрэем Федарэнкам, што трэба адрозьніваць «сачыніцельства» ад эстэтыкі мастацкага назіраньня. Змалку я чуў, як пасьля вайны (гэта год 1947—1948) даяркі чыталі ўслых у нашай хаце — у працоўных перапынках! — «Глыбокую плынь» Івана Шамякіна (цяпер бы сказаў «сачыніцеля»). Тады дзяўчаты бачылі фатаграфічна перад сабою сваіх Маеўскіх і Жэньку Лубяна і пры пазнаваньні былі эстэтычна шчасьлівыя…

Чаму ў нас ніхто ня зробіць фільму ці пастаноўкі паводле вельмі сучаснага «сачыніцеля» Юр'я Станкевіча? Як на мяне, дык гэта адзін з найлепшых сучасных аўтараў. У яго і эстэтыка пісаньня ў сваім жанры нашмат лепшая, чым у некаторых раскручаных аўтараў. Не гаворачы ўжо пра інтрыгу. Калі б каму недасьведчанаму сказалі, што гэта знойдзены Караткевічаў твор, — якая б была рэакцыя? Караткевіча мы пакрылі бронзай. Аднак эстэтыка ягонай мовы няроўная. Калі «Леаніды» чытаеш, як пад гіпнозам, дык некаторыя сынтагмы ў іншых творах проста ня лезуць у горла, як сухі хлеб без малака. І гэта — не Майсеева ці Салжаніцынава каструбаватасьць. Гэта проста недапрацоўка аўтара ды рэдактара.

Часам я чую, як маладым прачнутым беларусам для засваеньня мовы раяць чытаць Караткевіча ды Ластоўскага. Гэта трэба чытаць пазьней, калі прачытаеш Кузьму Чорнага, Брыля ці таго ж закрытыкаванага ўшчэнт Кандрата Крапіву. Разгарніце ягоны раман «Мядзьведзічы», вазьміце асадку, нататнік ды выпішыце тое, што б вы самі так не сказалі. Вось гэта і ёсьць сухі астатак, які трэба засвоіць. Тут і сынтаксіс словазлучэньняў (самая неапісаная частка нашай мовы), і лексыка, і яшчэ шмат чаго беларускага. Крапіва як укладальнік слоўніка і акадэмік-сакратар АН БССР — адно, а Крапіва ў мастацкім слове — зусім іншае.




FESTIVAL-GOOD-BY.WEBSPRUCH.DE

Нядаўна ўся Беларусь пачула пра масавыя бойкі моладзі пасьля «Сьвята гораду» ў электрычцы Менск—Пухавічы. Нічога дзіўнага. Культ прымітыўных спартовых захапленьняў, пячорнага геданізму з паглынаньнем таннага пойла, рэкордаў у падняцьці піўных барылак на «Дажынках», эстэтыкі спэцназу ні да чаго іншага прывесьці ня можа.

Генэрал-лейтэнант Сівакоў, наша спэцназаўская Лені Рыфэншталь, з флёрам эстэта, прапагандуючы гітлераўскі кодэкс гонару афіцэра ў «Журнале специального назначения» (так чытаецца на вокладцы) № 4 за 2006 г., не дасягнуў імплікаванага эстэтычна эфэкту сваёй папярэдніцы, а прамалінейна працытаваў чыста маральна-дыдактычную максыму пра вернасьць фюрэру ды крымінальную пагрозу тым, хто стаіць у баку ад выбранага фюрэрам шляху і барацьбы. Тут сканчаецца эстэтыка і пачынаецца чыстая мараль, пра што гаворыць ужо сама назва аб'екту абмеркаваньня — маральны кодэкс. А гэта можа быць ацэненае адпаведна катэгорыямі іншага кодэксу — крымінальнага.

Лені Рыфэншталь, апостал эстэтыкі Адольфа Гітлера, не падлягала Нюрнбэрскаму суду як крымінальніца, бо дзейнічала сродкамі прыгожага і эстэтычна прывабнага. Крэматоры гітлераўскіх канцлягераў былі таксама своеасаблівымі шэдэўрамі канструктарскай думкі. Ці ўзгадайце «Ў штрафной калёніі» Франца Кафкі. Як прафэсійна і руцінна тлумачыць кат мэханізм дзеяньня спаруды для выкананьня сьмяротнага выраку! Таксама — чыстая эстэтыка. Глямурны часопіс для байцоў спэцназу з эстэтыкай Лені Рыфэншталь фармуе душы тых, хто прысьвячае сваё жыцьцё служэньню Айчыне. Такі дэвіз пазначаны на вокладцы часопісу.

Няўжо мы праглынем і гэта, рэжучыся аб калючыя грані гвалтоўнай эстэтыкі таталітарызму? Тады ўжо, прымаючы часова вымушаную рынкавую эстэтыку за сапраўднасьць, а кодэкс гонару гітлераўскага афіцэра — за максыму паводзінаў, мы пасьпяхова ператворымся ў радасных шчасьлівых пакемонаў ды кібаргаў. І паедзем з шампанскім да цыганоў, як сапраўдныя гусары. Ня варта журыцца паэтцы, якую цытуе генэрал Сівакоў. Хапае ў нас выпіўкі, хапае і цыганоў. Не было ў нас яшчэ свайго сапраўднага Гітлера. Мы толькі вучымся.

Магчыма, нехта палічыць мае нататкі ня вельмі далікатнымі. Можа быць. Але гэта адпавядае ступені майго рэлятывізму. Адно шкадую: не атрымліваецца ў мяне нічога з эвалюцыяй. З чым у люльку, з тым і ў магілку.

*Загаловак ад рэдакцыі. Аўтарскі загаловак — «Эстэтычны і маральны рэлятывізм: беларускія грані». Друкуецца зь невялікімі скаротамі.*

СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ

# Як беларусы пра кактэйль Молатава даведаліся

Суседзкі дзядзька Іван, які прайшоў з баямі да самага Бэрліна і скончыў сваю асабістую вайну проста ля Брандэнбурскай брамы, называў «сумесьсю Молатава» зьлітыя ў адную пляшку ці ў кантовую малянкоўскую шклянку рэшткі напояў. Звычайна гэта здаралася пасьля вясельля, памінак ці любой іншай пагулянкі — карацей, калі нараніцу карцела пахмяліцца, а не было чым. Я цяпер падазраю, што і зь недапітых кілішкаў туды трапляла, у той «кактэйль». Ну, але дзядзька такога слова ня ведаў і адно часам называў сваю грымучую вадкасьць «наркамаўскім напоем», маючы на ўвазе ўсё таго ж таварыша Молатава.

Рэцэпт гэтага «напою» бязь цяжкасьці можна знайсьці ў Інтэрнэце, нават сайт адмысловы існуе. (Тс-с, але ён дагэтуль — дзяржаўная таямніца, і називаць складнікі — небясьпечна.) Адзінае бяз рызыкі можна сказаць, што робяць яго пры дапамозе бутэлькі, кноту і корка. Гарыць надзвычай зыркім і гарачым полымем. Тысячаградусным. Пагасіць вадою немагчыма. Сумесь для бранятанкавай тэхнікі. Сёньня адкрыта гавораць, што гэта быў савецкі напалм. Адзін мой знаёмец анархіст на памяць ведае рэцэпты розных гатункаў кактэйлю Молатава, ён яшчэ альхіміяй цікавіцца і прыгатаваньнем віна ў хатніх умовах.

А мне з маленства запомнілася з экскурсіі ў сталічны музэй вайны і на «курган славы», што ўпершыню бутэлькі з запальнай сумесьсю выкарысталі ў 1941 годзе байцы 100-й (запомнілася, што менавіта з круглай лічбай) дывізіі генэрала Русіянава (прозьвішча таксама запамінальнае), калі спрабавалі абараняць Менск ад немцаў. Гаварылі, што бутэлькі гэтыя моцна прыдаліся б абаронцам Берасьцейскай «крэпасьці-героя», але іх не пасьпелі давезьці з «гораду-героя» Масквы. Аказалася, што 100-я дывізія ўдзельнічала і ў «вызваленчым паходзе», гнала польскіх памежнікаў ад беларускай савецкай мяжы да літоўскай, яшчэ буржуазнай.

Значна пазьней даведаўся я, што ў тыя дні нібыта байцы «любоўна» назвалі «гаручку» якраз гэтым самым «кактэйлем Молатава». Хаця мне цяжка ўявіць, каб нехта наважыўся гэтак фамільярна абысьціся з прозьвішчам адной зь «сьвяшчэнных кароў» тадышняга палітбюро. Назва гучала, можна нават сказаць, абразьліва. Дый хто зь іх мог ведаць, што такое «кактэйль»? Іншая рэч — самагон.

Дый сэнс, бадай, даруйце за калямбур, двухсэнсоўны. Атрымліваецца, што гэта «кактэйль», які Молатаў прыгатаваў для Рыбэнтропа, які аказаўся гэткім падступным ды няшчырым і не забясьпечыў выкананьня такога выдатнага пакту — дамовы аб мяжы і сяброўстве. Занадта складана, як на чырвонаармейца ў акопе, за 15—20 мэтраў ад злавеснага, жудаснага нямецкага танка. Нейкі чамадан з падвойным сподам. А камісары? Агітатары і прапагандысты? Палітуправа РККА? А сакрэтныя аддзелы розных НКВД? Яны што — мышэй не лавілі? Штосьці ня верыцца.

А можа, НКВД было не да таго: у першыя дні вайны расстрэльвалі вязьняў сьпешліва, палілі дакумэнты, вывозілі скарб. Нямецкія танкі ды авіяцыя не давалі спаць у шапку. Дзесь праз тыдзень пасьля захопу Менску «дзяржкамітэт абароны» выдаў пастанову: змагацца з бранятанкавымі сіламі бутэлькамі з запальнай сумесьсю і дзеля гэтага павялічыць значна іх вытворчасьць. Гэтак адбыліся афіцыйныя народзіны кактэйлю Молатава.

Усё ж, думаецца мне, для чырвонаармейцаў слова «кактэйль» безумоўна магло гучаць абракадабрай у лепшым разе і адмоўным буржуазным слоўцам з прысмакам заганнасьці — у горшым. Значна больш праўдзіва выглядае фінскае тлумачэньне — адкуль узяўся славуты «кактэйль». Молатаў абвесьціў савецкаму народу аб пачатку вайны зь Фінляндыяй. А фіны пачалі паліць бутэлькамі з запальнай сумесьсю лёгкія савецкія танкі, якія выдатна гарэлі. Сьмешную назву для шкляных гранат прыдумалі заходнія журналісты, якія пісалі рэпартажы пра вайсковыя дзеяньні, седзячы у хэльсынскіх барах.

Для беларусаў прозьвішча наркама Молатава зрабілася найбольш вядомым у 1939 годзе, які стаў для іх ураджайным на падзеі. Спачатку ў Беларусі Ўсходняй гвалтам сталі зьнішчаць хутары, перасяляць гаспадароў у вёскі, каб выцкоўваць у іх гаспадарлівасьць. Хаты развальвалі энкавэдысты, камсамольцы ды іншыя актывісты, а складаць сьцены на новым месцы ніхто не сьпяшаўся. І каля нашай вёскі, дзе мае дзяды жылі, таксама некалькі чалавек пацярпелі. А тут яшчэ неўзабаве мабілізацыя пачалася. Патлумачу: я пра тое, як у Саветах забаяліся, што немцы раптам рушаць на Польшчу і да самых Стоўпцаў дойдуць. Потым, праўда, зь імі дамовіліся, пакт Молатава—Рыбэнтропа падпісалі ды ўздыхнулі з палёгкай.

Але народ тады зьлякаўся: з хатаў павыганялі, а зараз яшчэ вайна пачнецца — бо навошта тады мабілізацыя? Прапаганда адносна немцаў і Гітлера была напярэдадні рэзка адмоўнай. Праўда, потым раптам за дзень усё зьмянілася, паведамленьні пра Нямеччыну напоўніліся саладжавасьцю і амаль замілаваньнем. Маўляў, Адольф Гітлер вельмі шмат зрабіў для нямецкага народу і навёў паўсюль парадак, а парадак павінен быць перш за ўсё. Дысцыпліна і парадак, як у дырэктыве нумар адзін. Простыя людзі вельмі ўдзячныя свайму правадыру.

Дзядзька Міхей набаляваўся, праспаў доўга, захацелася апахмяліцца. А ў карчме пачаў лаяць, па завядзёнцы, фашыстаў, што не даюць спакойна выпіць, трымаюць у напрузе. Да яго кінуліся некалькі сексотаў адразу: «Ты што пляўузгаеш? Адольф Гітлер — найлепшы наш сябра. Ён — правадыр Вялікай Нямеччыны! Газэт не чытаеш?! Боўдзіла!» Вось так і заляцеў наш дзядзька Міхей, жартаў не пазнаўшы. Так, здаецца, зь Сібіры і не вярнуўся. Хаця хтосьці казаў, нібыта ён трапіў у штрафбат і крОўю змываў сваю няўдалую памылку ў баях з войскамі СС. Дайшоў да радзімы фюрэра, да Аўстрыі, заўзята лаяў яго, а наконт самой Аўстрыі лічыў найлепш памаўчаць, надта ж яму там спадабалася.

Другі дзядзька — Аркадзь — настаўнічаў пасьля Аршанскага пэдтэхнікуму. Настаўнікаў падчас мабілізацыі пачалі шмат забіраць да войска, на камандзірскія пасады. Камандзіраў моцна не хапала, шмат перастралялі ў 1937-м. Ну і яго ўзялі ды — адразу — у вызваленчы паход. Тамака, у Заходняй Беларусі, ён і пазнаёміўся з будучай жонкай. Так што ня будзь 17 верасьня, не стварылася б яшчэ адной беларускай сям'і. У гэтым факце шмат глыбокага сэнсу, сымбалічнасьці. Хай мне даруюць нашыя нігілісты. І такіх сем'яў я ведаю нямала. Яны, можна сказаць, змацавалі бела-



**22 чэрвеня 2006 г. Перамога «нашых» на «лініі Сталіна».**

рускі народ у адзіны, не задумваючыся над тым, што выканалі гістарычную справу. Перамаглі, уласна кажучы, комплекс шасьціпавятовай Беларусі.

А потым дзядзька ўдзельнічаў у тым знакамітым парадзе ў Менску, які ня вельмі даўно зноўку стаў Мінскам. А пасьля параду ўлады наладзілі статысячную дэманстрацыю працоўных. Столькі ж тады жыло ў самой сталіцы, дакладна сто тысяч жыхароў. А затым як «вопытнага» камандзіра дзядзьку Аркадзя перакінулі на Ленінградзкі фронт. Іх усіх паслалі на фінскую вайну. Маўляў, «абстраляныя» часткі, пораху нюхнулі, стрэльбы ў руках патрымалі. Так ён і застаўся у войску. Вярнуўся назад (пашанцавала, не загінуў і нават не абмарозіўся), ажаніўся. Яшчэ потым дзяцей панараджаў і ўнукаў дачакаўся.

Паўтаруся: гэны іхні шлюб для мяне асабіста вельмі сымбалічны. Зьядналі дзьве часткі, якія наўрад ці пры іншых абставінах сталі б адзінай краінай. Нібы сшылі суворай хірургічнай ніткай глыбокую рану. Праўда, мяжу трымалі да самае вайны. Дзоты, калючы дрот, памежныя заставы, вышкі, жаўнеры са стрэльбамі, прапускны рэжым, падазронасьць. Змацавалі шлюбнымі, сямейніцкімі повязямі. Зрэшты, масава адбылося гэта не адразу. Недавер, нават падазронасьць, дый як праз калючы дрот цалавацца, браць шлюб?

Чым не пазьнейшы Бэрлін, падзелены бэтонным плотам? Трапіць у другую частку можна было толькі са спэцдазволам, з запрашэньнем зь пячаткай. Як мы потым доўга і вельмі рэдка наведвалі закалючадротныя, хоць і братэрска-сацыялістычная краіны.

Аднойчы дзядзька Аркадзь бацьку майму ў лесе ў грыбах, ня вытрываў, расказаў, як фіны спрытна палілі чырвонаармейскія танкі бутэлькамі з запальнай сумесьсю, як яны гарэлі разам з танкістамі. Ды як камісары мацавалі на соснах партрэты Ёсіфа Вісарыёнавіча, каб байцы не маглі ўцячы і па-здрадніцку кінуць правадыра белафінскай ваеншчыне.

Пра такое пры Саветах толькі ў лесе і можна было пагаварыць. Ясна, што пра «кактэйль» ён тады нічога ня чуў, бо ня бачыў ніколі заходніх газэт на свае вочы. І добра, што ня бачыў, бо адразу заляцеў бы «за шпіянаж на карысьць буржуазных дзяржаваў». Падазрона ставіліся да тых, хто ведаў замежныя мовы, а нават калі сваёй роднай беларускай карыстаўся, ведаць дзеля добранадзейнасьці варта было адну. Як часам жартавалі тады — «мацерную».

Адзін мой знаёмы гісторык вельмі цікавіцца тымі гадамі і любіць распавядаць, як на мяжу зь Фінляндыяй паслалі будучага маршала Куліка, ён кіраваў артылерыяй, якая мусіла была абстраляць чырвонаармейцаў нібы зь фінскай тэрыторыі. Асабліва любіць гісторык нагадаць, як адна разумная кніга, названая «беларускай энцыкляпэдыяй», нядаўна напісала, што маршал Кулік «вызначыўся ў савецка-фінскую вайну». Маршала атрымаў Кулік за абстрэл сваіх памежнікаў, так бы мовіць, ад імя фінскай ваеншчыны, і за гібель пяцёх чырвонаармейцаў. Але ўедлівыя фіны занатавалі ў журнале памежнай варты дакладны час, хуткасьць распаўсюджваньня стрэлаў, вугал стральбы вылічылі, вызначылі адлегласьць, кірунак і нават прыблізнае месца, адкуль стралялі гарматы маршала Куліка. Фіны нават афіцыйна паспачувалі чырвоным артылерыстам. Гэта разьятрыла наркама Молатава.

Саветы зусім не чакалі, што у фінаў надзейныя жалезабэтонныя ўмацаваньні, непрыступная лінія Манэргейма, аб якую абламалі зубы чырвоныя дывізіі.

Лінію абарончых умацаваньняў, накшталт фінскай, Саветам заманулася пабудаваць на захадзе новай беларускай тэрыторыі — прыблізна паводле прызабытай лініі Керзона. Але ні пораху не хапіла, ні часу — нямецкія танкі 22 чэрвеня прайшлі наскрозь гэтак званую «лінію Молатава», абараняць якую даручылі Куліку. Але маршалу наканавана было застацца аўтарам адзінай, так бы мовіць, удалай апэрацыі, ён апынуўся ў танкавым акружэньні пад Беластокам і з зайздрасьцю ўспамінаў фінскія «шкляныя гранаты».

Шчыра кажучы, я і сам канчаткова не разабраўся: ці сутыкнуліся з назвай кактэйлю Молатава нашыя людзі дзякуючы кіно, ці ведалі яе заўсёды, умелі тым кактэйлем карыстацца і даволі спрытна гэта рабілі? Каб адчуць хоць прыблізна кактэйльны смак ды паставіць кропку ў гэтым эсэ, я пайшоў у краму, памятаючы назольную газэтную рэкляму пра алькагольны напой з назвай «Кактэйль Молатава». «Няма больш», — адказвалі ва ўсіх крамах. «Фіны за аўтарскія правы нібыта засудзілі вінзавод і болей вашага «кактэйлю» ня будзе», — здолелі патлумачыць у адной гарэлачнай крамцы.

**Сяргей Астравец у Менску**

**27 кастрычніка ў Беларускім ПЭН–цэнтры (вул.Казлова, 7–101) адбудзецца прэзэнтацыя кніжкі Сяргея Астраўца «Кактэйль Молатава». Удзел бяруць: аўтар, Уладзімер Арлоў, Адам Глёбус, Барыс Пятровіч і іншыя. Пачатак у 18.30. Уваход вольны.**

## Юзік Дзенісюк

І «БУМЭР» СЫНУ

Не адно я дрэва пасадзіў,
Не адзін я выкапаў калодзеж,
Зь любай жонкай сына нарадзіў.
Толькі вось адно мяне трывожыць.

Сваёй хаты я не збудаваў.
А ў кватэры, што ў чужым этэры,
дзісь «Магутны Божа» засьпяваў,
Як суседка грукае ў дзьверы.

Захацеў паслухаць палянэз —
Чую голас: «Захаду прадаўся!
Да музыкаў маеш інтарэс —
Слухай Лучанка, не вычварайся!»

Я кватэру ў горадзе прадам.
Пераеду з жонкаю да цёшчы.
Хата ў вёсцы — продкаў барада,
Ды ніхто мазгі там не спалошча.

Купім сыну «бумэр» дарагі —
Можна нават бел-чырвона-белы.
Хай ад злосьці сохнуць варагі
І грызуць рудовыя «саўбелы».
*Абухава, Гарадзеншчына*

## А.Блёк-Бастэр

«НОЧ. ПА ВУЛІЦЫ ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ...»

Ноч.
Па вуліцы Чырвонаармейскай
паўз аптэку,
гістфак
і бібліятэку
іду...
Зноўку мяне папракнуць,
што бяз рыфмы,
што лёгка пісаць безь яе.
А я ўлагоджу
(зусім няцяжка)
тых,
хто бяз рыфмы
баіцца жыць:
ля рэзыдэнцыі прэзыдэнта
агідныя крыкі варон.
Нібыта ведаюць прэтэндэнта,
па якога едзе Харон...

## Алесь Макрацоў

***

Культура…
Гумусны слой
пясчанай глебы
айчыны…

***

Выгнаных з раю
нашчадкі…
Зямля —
папраўчая калёнія.

## Зьміцер Панкавец

СЯБРУ

Маладая кроў
На вясеньнім асфальце
Усьміхаецца

## Васіліна Летняя

«Я ЗЬНІЧКАЙ У БЯЗЬМЕЖНАСЬЦІ СУСЬВЕТУ...»

Я зьнічкай у бязьмежнасьці Сусьвету,
Галяктыкай у бездані вякоў
Задумалася ад стварэньня сьвету…
Я сёньня нарадзілася наноў.

Жыцьця майго палотнішча саткана
Зь сьвятой крыві і памяці дзядоў.
Я гонар іх… і іхняя загана,
Калі змарную прадзіва гадоў.

Дзяды на сьвет маймі глядзяць вачыма,
Я — іх рукамі мацаю зямлю.
Ідзём за родам род, пляччо ў плячыма,
Бо нельга быць бяз парастка камлю.

І дрэву не узьняцца без карэньня,
Бо песень без гартані не сьпяваць!
Ды толькі зьнічка я ад сатварэньня,
Мне, падаючы, зьзяць і дагараць.

## Анатоль Трафімчык

З ВАСІЛЯ СІМАНЕНКІ

***

Ты ніколі ня блісьнеш вачыма
У мой адрас з-пад мілых броў,
Бо цябе я згубіў, магчыма,
Шчэ да тога, калі знайшоў.

Ты ніколі мяне не абдымеш
І ня зможаш мяне адштурхнуць,
Растварыўшыся ў летнім дыме,
Апячэш навальніцай чуць-чуць.

Па лагодных кілімах-травах
Павядзе цябе шлях праз гады,
А за мной застанецца права
Быць у сэрцы з табою заўжды,

Дні і ночы думаць упарта,
На сустрэчу ня страчваць надзей —
Дзеля гэтага толькі варта,
Тройчы варта прыйсьці да людзей.
*Баранавічы*

## Рыгор Латышэвіч

«СЬПІ. ПРЫСТАЛА ЗРЭНКА БАЧЫЦЬ...»

Сьпі. Прыстала зрэнка бачыць,
Вушы — чуць, язык — тлумачыць,
Думкі — ў галаве блудзіць,
Рукі — мацаць, цела — жыць.

Трэба, трэба адпачыць.
Вочкі моцна зачыніць.
У бездань галавы тваёй
Хай прытуліцца спакой.

Усё стамілася йснаваць:
Сумаваць, жадаць, кахаць.
Змрочны вэлюм сутарэньня
Замалюе аздабленьне.

Потым, мабыць, будзе рай.
Сьпі, каханка, баю-бай...

***

Усё абрыдла.
Поўны даўн.
Прыемна раніцой
гучыць Джэймз Браўн.
На гаўбцы палю,
А ў нізе нехта
Калоціць у дыван,
І гэта сьмешна.
Куляю вокам у нябёсны даль
І разумею:
Усё — д'ябэльскі баль.
*Асіповічы*

## Сяржук Жыцень

«ПЕХАТОЮ З ТАБОЮ МЫ ПОЙДЗЕМ У ВЫРАЙ...»

пехатою
з табою
мы пойдзем у вырай
несучы на далонях
уласныя сэрцы
пад косамі сонца

даджжом вясновым
сагрэем
абмыем
каб потым ізноў
вярнуцца
ў сябе
ад мрояў ды сноў

будзе
сьветла й цёпла
Там
дзе сканае
Душа Сьвету
разальецца Сьвятло
прывітаньне Дзядам
скажам
даючы нырца
ў Лету

цела
хоча быць душою
цэлай
белай са смалою
поўнай
добрага настрою
роўнай
кроўнай са сьлязою

пешай
вольнаю хадою
сьвежай
смачнаю травою
цішай
гоманам тугою
іншай
толькі не сабою

## Мікола Бусел

АХВЯРЫ І КАТЫ

Зь іх ніхто не усьсеў
На падсудную лаву.
Кагэбісты вандруюць
Па мясцох сваёй славы.

Баль сягоньня балююць
(Прэч адкіньце ўсе жарты!)
Капітаны, маёры,
Не як колісь — сяржанты.

Вызіраюць з «казлоў»
Кагэбіцкія твары
Яны тутака зноў,
Як тады, гаспадараць
(Пазнаеш, Ізя Харык?).

На праспэкт Пераможцаў
З вокан носа ня сунь.
«Мэрсэдэс»... Пераможны
Ў ім Самсон Самасуй.

Не пяюць, не галосяць
Над табою валторны.
Залюляны чэкістам,
Сьпіш ты, Тодар Кляшторны.

Дзе твае «Залмяняне»?
Што зрабіў ты ня так?
Ўжо няма... пазьнішчалі
Як цябе іх, Кульбак.

Лыжны віск на праспэкце,
Па плячах — мурашы.
Янка Нёманскі, чуеш?
Дзе цяпер ты ляжыш?

Устаюць з-пад зямлі
Продкаў змучаных душы...
*Дуброва (Сьветлагоршчына)*

## Сяргей Макарэвіч

АХВЯРА

Стрэл у лесе...
Адказ — цішыня...
Паляўнічы шукае ахвяру.
А тыя ляжаць забітыя
Недзе ў хмызьняку,
У гушчары.

Паляўнічы адзін
(ён ня любіць сабак)...
Усё адзін блукае па лесе.
Кожны шоргат —
Падняты кулак.
Ён гатовы дабіць зьвера.

Ён слухае шолах ветру.
І ловіць кожны пах.
Толькі ад мёртвай ахвяры
Не зыходзіць сьмярдзючы жах.

І ён блукае да заходу сонца,
Ён крычыць нібыта вар'ят.
Праклінае ў выніку бога,
Што зноўку застаўся ў дурнях.
*Вялейка*



FESTIVAL-GOOD-BY.WEBSPRUCH.DE

## Таямніцы дзясятае плянэты

**Гэта фотапраект Андрэя Логінава і Валера Савульчыка, прэзэнтаваны на фэстывалі беларускай культуры ў Нямеччыне GOOD-BY. Аўтары «інсцэнуюць сябе ў якасьці карыкатурных прадстаўнікоў пэўных сацыяльных тыпаў. Гратэскныя выявы стаюцца нэабарочнымі алегорыямі глупства, абмежаванасьці й безвыходнай няздольнасьці да сацыяльнай рэфлексіі, якія прыводзяць да пазнавальных палітычных наступстваў». Болей пра фэстываль GOOD-BY на сайце nn.by. Іншыя таямніцы дзясятае плянэты — на розных старонках Літаратурнага сшытку «НН».**

# ААН: Ніякіх больш Byelorussia-ў

Назва нашай краіны мусіць быць на ўсіх мапах Belarus', а геаграфічныя аб'екты мусяць падавацца ў транскрыпцыі зь беларускай мовы, вырашылі экспэрты ААН у тапаніміцы.




9—13 кастрычніка ў Таліне адбылася канфэрэнцыя, якая сабрала разам экспэртаў ААН у тапаніміцы з Эстоніі, Латвіі, Літвы, Расеі, Альжыру, Ізраілю, Францыі, Вялікабрытаніі і ЗША. Па выніках канфэрэнцыі было прынятае рашэньне аб тым, што беларускія тапонімы лацінскім шрыфтам будуць захоўваць асаблівасьці беларускай артаэпіі.

Галоўны спэцыяліст сэктару картаграфіі Белдзяржкаммаёмасьці Натальля Аўраменка паведаміла, што інструкцыю па трансьлітарацыі стварылі на аснове беларускай лацінкі, распрацаванай Тарашкевічам. Паводле яе словаў, цяпер на міжнародных мапах ня будзе больш Byelorussia'ў ды Weisrussland'аў, а толькі Belarus'.

Мовазнаўца Зьміцер Саўка выказвае аптымізм з нагоды рашэньня. Праблему ён бачыць у першую чаргу ў саміх беларусах: «На форуме сайту «Камсамолкі» разгарэлася сур'ёзная спрэчка. Самае прыкрае, што многія нашыя грамадзяне ня бачаць розьніцы між сапраўдай назвай і каляніяльным назовам савецкіх часоў». Сп.Саўка ўзгадвае, як праз называньне нашай краіны White Russia многія людзі на Захадзе доўгі час думалі, што Беларусь — гэта дзяржава на захадзе Расеі, утвораная белагвардзейцамі.

Яшчэ ў 2000 г. Савет Міністраў прыняў інструкцыю па трансьлітарацыі геаграфічных назоваў Беларусі лацінкай. Аднак шырока пра гэта не паведамлялася.

Аляксандар Навіцкі, адзін з каардынатараў сайту Lacinka.org, бачыць пазытыўны момант у тым, што на міжнародным форуме зацьверджаная беларускамоўная вэрсія геаграфічных назваў. Аднак лацінку, распрацаваную для ААНаўскіх мапаў, ён лічыць непасьлядоўнай. На ягоную думку, няма сэнсу пераконваць замежнікаў вымаўляць назву краіны згодна зь яе беларускім гучаньнем. «Гэта як у пачатку 90-х палякам прапаноўвалі казаць не Białoruś, a Biełaruś. І чым гэта скончылася? Нічым». Гэта тое самае, каб ад беларусаў патрабаваць называць Нямеччыну Deutschland'ам, кажа сп.Навіцкі.

Сп. Навіцкі выказвае зьдзіўленьне адсутнасьцю ў новай лацінцы u нескладовага, а таксама прысутнасьцю апострафных **s'** і **c'** замест **ś** і **ć**. Напрыканцы свайго камэнтару ён падсумоўвае: «Яны вынайшлі ровар. Ім прыемна. Але наш аптымізм дастаткова стрыманы».

Сапраўды, лацінка, зацьверджаная тапанімістамі, не да канца пасьлядоўная. Тым ня менш, калі яна паслужыцца да таго, каб нашу краіну пачалі ўспрымаць як цалкам самастойную, а ня нейкую там «Белую Расею», гэта ўжо будзе мець сэнс.

**Сямён Печанко**

**Цалкам камэнтар мовазнаўцаў глядзеце тут: http://lacinka.org/?p=102**

# Беларускамоўны Windows чакайце ў чэрвені

Microsoft шукае выканаўцаў беларускамоўнай вэрсіі.

Пры канцы верасьня новы афіцыйны прадстаўнік кампаніі *Microsoft* у Беларусі Андрэй Баюшчанка паведаміў аб праекце стварэньня беларускамоўнай вэрсіі *Windows*. Адказваючы на пытаньні *IT.TUT.BY*, ён паведаміў, што пакуль гаворка вядзецца пра стварэньне беларускай вэрсіі *LIP* (*Language Interface Pack*), якая будзе працаваць з *XP* і *Vista*. Стварэньне цалкам лякалізаванага прадукту будзе наступным крокам.

Паводле словаў А. Баюшчанкі, на гэты момант зроблена галоўнае: зацьверджаны бюджэт праекту стварэньня беларускай вэрсіі *Windows*. Ён адмовіўся назваць памер бюджэту, спаслаўшыся на сакрэтнасьць гэтай інфармацыі.

На пытаньне, хто будзе займацца перакладам на беларускую мову, сп. Баюшчанка адказаў наступнае: «Увесь праект знаходзіцца на стадыі падрыхтоўкі да рэалізацыі. Шукаюцца як выканаўцы тэхнічнай часткі стварэньня беларускамоўнай вэрсіі *Windows*, так і арганізацыі, што будуць займацца стварэньнем і пацьверджаньнем валіднасьці слоўніка». Пакуль не вядома, хто мае заняцца перакладам.

Старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў выказаў гатовасьць да супрацы з *Microsoft*: «Мы два гады вядзем перамовы з маскоўскай філіяй гэтай кампаніі, і вельмі добра, што цяпер у Беларусі ёсьць свой прадстаўнік. Мы заўсёды гатовыя аказаць паслугі».

Беларускамоўная вэрсія *Windows* мусіць зьявіцца ў чэрвені 2007 г.

**СП**

# Аніса плюс «Аліса» мінус палітыка

Сёлета ў шаснаццаты раз Полацкай зямлёй пракоціцца «Рок-кола». З дырэктарам фэстывалю **Сяргеем «Анісам» Анішчанкам** гутарыць **Воля Няволя**.

«Рок-кола» прысьвечана 20-годзьдзю легендарнага «Мясцовага часу», і кожны гурт, што ўдзельнічае ў конкурснай праграме, выканае кавэр-вэрсію песьні «МЧ». А ў якасьці гэдлайнэру запрошаны расейскі гурт «Аліса».

— Дзьве мэга-зоркі Беларусі — гэта «N.R.M.» і «Мясцовы час», — кажа С.Анішчанка. — Мы намагаемся запрасіць на фэстываль Сашу Алуфа (вакаліста «Мясцовага часу»), але ён жыве ў Нямеччыне... Вельмі хацелася б пачуць на «Рок-коле» гэты голас.

**— Якія гурты зайграюць у конкурсе?**

— Нам даслалі 84 дыскі, мы адабралі 25. Будуць маладыя гурты з Полацку, Наваполацку, Менску, Магілева, Віцебску, Бабруйску, Лагойску, Баранавіч. Але сёлета маглі прыехаць адны расейцы: нам дасылалі заяўкі зь Пензы, Казані, Якуціі, Татарстану! Далёкія-далёкія расейскія гурты хочуць ехаць за свой кошт на «Рок-кола» і граць тры песьні! Прыедзе добрая смаленская каманда *Deimos*. Яны прасьпявалі «МЧ» так — дай Божа, каб беларускія гурты так сьпявалі!

**— А госьці фэстывалю?**

— Тая ж «Крама» пытаецца: «Чаму мы ня граем у вас сёлета?» Аднак «Крама» ў нас ужо была, і «Indiga» была. А не былі «Куклы», ня быў Кулінковіч. Не было «Алісы» — мэга-зоркі постсавецкай прасторы.

**— Як удалося запрасіць Кінчава?**

— Рабіць гэта праз канцэртныя агенцтвы было фінансава немагчыма. І мы проста напісалі ліст. Людзі разумныя, улюбёныя ў рок-музыку, яны згадзіліся. Кінчаў казаў, што пагадзіўся і таму, што хоча наведаць сьвятыя месцы Полаччыны.

Добра, што сёлета фэст праводзіцца ў Вялікай зале Палацу культуры «Полацак-Шкловалакно», а не ў маленечкай залі на 350 чалавек. Квіткі каштуюць 25 тыс. рублёў. Зразумейце, нам трэба разьлічыцца з «Алісай».

Дзякуй, што мэр Полацку разумее нас і не цураецца выйсьці і адкрыць фэстываль. Зразумейце і вы нас. Нам хацелася б як мага менш закранаць палітыку. Мы хочам аднаго: каб у Беларусі гучала рок-музыка. Нам не хацелася б, каб здарылася, як на «Рок-каранацыі», калі «J:МОРС» ня выйшаў на сцэну за ўзнагародай. Ёсьць жа проста музыка, ёсьць проста словы — без усякай палітыкі...




**24 кастрычніка**

16:00 — Конкурсная праграма: VODAR SUSVIET (Магілёў), Denial of life (Наваполацак), JENOWA (Віцебск), INDRA (Полацак), INVASION (Наваполацак), Lilith (Менск), Портал (Наваполацак), S.D.M. (Менск), Squier (Віцебск), SKYNET (Бабруйск), Тихий час (Наваполацак), The Perfect Life (Наваполацак). **Госьці фэстывалю** — «Восьмы дзень», «Куклы».

20:00 — Конкурсная праграма: Абшар (Лагойск), Амальгама (Наваполацак), Deimos (Смаленск), Касса (Менск), Красный дождь (Полацак), Натюрморт (Менск), Независимая страна (Віцебск), Призrock (Баранавічы), Primus inter Pares (Наваполацак), RU.ST (Бабруйск), Такси (Наваполацак), Фу (Віцебск). **Госьць фэстывалю** — «Neuro Dubel».

23:00 – Абвяшчэньне вынікаў конкурсу.

**25 кастрычніка**

19:00 — Гала-канцэрт пераможцаў. **Госьць фэстывалю** — Канстанцін Кінчаў і гурт «Аліса» (Расея).

# Заля Славука



ВАЛЕРЫ СЛАВУК

6 кастрычніка ў Полацкай карціннай галерэі адкрылася выстава графікі Валер’я Славука. У Полацку яго найбольш ведаюць дзякуючы ілюстрацыям да першага выданьня кнігі Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня» па-беларуску. Падчас прэзэнтацыі пісьменьнік Уладзімер Ягоўдзік прапанаваў палачанам зрабіць у Карціннай галерэі адмысловую залю Славука, творы якога арганічна ўпісваюцца ў інтэр’еры старога корпусу езуіцкага калегіюму. Па завяршэньні прэзэнтацыі мастак даваў аўтографы на кнігах, якія ілюстраваў.

**Васіль Кроква**

## Сьпявайма 100 песень Свабоды

Лэйбл «VoliaMusic» пачынае працу над выданьнем першага КАРАОКЕ-ДЫСКУ беларускіх песень. Плянуецца разьмясьціць на CD калекцыю з сотняй самых папулярных айчынных шлягераў. «VoliaMusic» прапануе чытачам «НН» узяць удзел у складаньні ўнікальнай 100-песеннай праграмы.

Першыя 1000 чалавек, якія дашлюць свае прапановы, змогуць стаць уладальнікамі гэтага дыску бясплатна. Трэба толькі выканаць дзьве ўмовы:

1. Даслаць сьпіс з 20 улюбёных песень на адрасы: а/с 5, 220085 Менск, «Караоке-100»; альбо электронай поштай — pesni2006@tut.by.
2. Пакінуць свае каардынаты, на якія будзе скіраваны прызавы дыск.

Адначасова «VoliaMusic» зьвяртаецца да тых, хто можа дапамагчы ў тэхнічным забесьпячэньні гэтага праекту. Просім адгукнуцца і музыкаў, якія жадалі б прапанаваць свае творы.

# Фармат 4х4, 19—22 кастрычніка

**«Сусьветны гандлёвы цэнтар»** (World Trade Center, 2006, ЗША).

Ад рэжысэра такога ўзроўню, як Олівэр Стоўн («Ніксан», «Дж.Ф.К. Стрэлы ў Даласе», «Аляксандар»), чакаюць многага, ад стужкі пра падзеі кшталту тых, што адбыліся 11 верасьня, чакаюць яшчэ большага, ад сцэнара, які грунтуецца цалкам на сапраўдных падзеях, чакаюць праўды, ад твору зь вялікай літары чакаюць новага позірку і пераасэнсаваньня. Ці спраўджваюцца гэтыя чаканьні ў дачыненьні да амэрыканскай стужкі пра тэракт у Нью-Ёрку?

Бадай што не, бо ў ім няма ні адкрыцьцяў, ні сэнсацыяў, ні разуменьня, ні пошуку адказаў ці аналізу. У ім — тэракт вачыма двох звычайных нью-ёрскіх паліцэйскіх Джона Маклокліна і Ўільяма Гімэна, ролі якіх выконвалі Нікалас Кейдж («8 мм», «Бяз твару») і Майкл Пэнья. Яны ішлі на дапамогу пацярпелым ад тэракту і трапілі пад руіны другой вежы. З гэтых разваліна ў выратуюць усяго 20 чалавек, у тым ліку і галоўных герояў. Стужка зьнятая проста і стэрыльна — і ніякіх пытаньняў да стваральнікаў не ўзьнікае. Галоўныя героі — бязьвінныя ахвяры страшных падзеяў, як і тысячы іншых людзей, як і ахвяры іншых тэрактаў, якія адбываюцца ва ўсім сьвеце. Яны маглі б быць ахвярамі стыхіі, і ў стужцы гэта б нічога не зьмяніла.

Але фільм усё ж варты прагляду хаця б таму, што нагадвае пра страшныя і сумныя падзеі нядаўняга мінулага, а ўсе героі, якіх мы бачым на экране — маюць рэальных прататыпаў.

**«69»** (2004, Японія).

Рэжысэра гэтай стужкі называюць тайскім Тарантына, і для гэтага ёсьць падставы: такі ж напружаны сюжэт, крымінал, вялікая колькасьць трупаў на адзін мэтар стужкі. А пачалося ўсё з таго, што нумар на кватэры галоўнай гераіні перакульнуўся і стаў 9 замест 6, а пасьля ейны лёс ужо не залежаў ад яе.

**«Такешыз»** (Takeshis, 2005, Японія).

Калі рэжысэрам не хапае сцэнароў і ім няма пра што здымаць, яны пачынаюць здымаць пра сябе, а калі ім і гэтага мала, то пра падваеньне сябе. Прыйшоў такі час і для вядомага Такешы Кітана. У стужцы многа стрэлаў, жорсткасьці, але многа і эстэтыкі, і сузіраньня. Стужка для тых, каму аднаго Такешы мала.

**«Пекла»** (L'Enfer, 2005, Францыя—Італія—Бэльгія—Японія).

Гэта другая частка трылёгіі, сцэнар да якой сварыў польскі кінаклясык Кшыштаф Кесьлеўскі («Тры колеры», «Дэкалёг»), першую частку — «Вырай» — паставіў нямецкі рэжысэр Том Тыквэр некалькі год таму, трэцяя частка — «Чысьцец» — яшчэ ў праекце. Рэжысэру стужкі басьнійцу Данісу Тановічу («Нічыйная зямля») бракуе выкшталцонасьці Кесьлеўскага, які быў здольны раскрыць рэлігійна-філязофскія тэмы на матэрыяле жыцьця простых людзей, але ён дадаў у стужку свой стыль пастаноўкі, сваё бачаньне сюжэту пра трох сёстраў, жыцьцё якіх праходзіць пад ценем сямейнай трагедыі, якая адбылася ў дзяцінстве. Гісторыю ён адкрывае пакрысе, урыўкамі, надаючы фільму дэтэктыўны характар.

І «Вырай», зьняты нямецкім рэжысэрам з удзелам ангельскамоўных актораў, і «Пекла», зьнятае басьнійскім рэжысэрам з удзелам францускіх акторак (Эмануэль Бэар, Мары Жылен, Карын Віяр, Кароль Букэ) ёсьць праектамі мультыкультурнымі, агульнаэўрапейскімі, таму яны могуць быць цікавыя яшчэ і як прыклады гэтай, іншай, генэрацыі кіно.

«Пекла» — адзін з тых рэдкіх фільмаў, што можа падацца і шэдэўрам, і проста сумнай, непрыкметнай стужкай. Лепш вырашаць самому.

**Ганна Каморнік**

## НАШЫ ШАШКІ

# Прынцып Плакхіна

Паўтара году таму менчуку Аркадзю Плакхіну (дарэчы, націск у прозьвішчы — на апошнім складзе) надалі годнасьць заслужанага майстра спорту. Кажуць, Лукашэнка паглядзеў у паперы, пакладзенай яму Саюзам спартоўцаў, і засумняваўся: «Нешта дужа стары!» Яму патлумачылі, што экс-чэмпіён сьвету па шашках-64 чакаў афіцыйнага прызнаньня больш за 15 год... Тады прэзыдэнт НАК літасьціва падпісаў указ. А неўзабаве заслужаныя майстры пазбавіліся ільгот на праезд і аплату жытла.

Зрэшты, сп.Аркадзь аптымізму ня траціць. Выступае ва ўсіх спаборніцтвах, куды запрашаюць; надоечы езьдзіў на шашачныя фэсты ў Барысаў і Пухавічы, хоць гэта не зусім гросмайстарскі ўзровень: «Зьбіраецца шмат аматараў, гуляюць партыі па 15 хвілін, каб скончыць 9 тураў за пару дзён...» Наведвае букмэйкерскія канторы, спрабуючы канвэртаваць сваю цікавасьць да спартовых навінаў у грашовыя знакі, балазе, знаецца на футболе, заўзее за менскае «Дынама»...

Тытуляваны шашыст сочыць і за шахматнымі падзеямі. Яго меркаваньне пра матч на першынство сьвету істотна розьніцца ад пагляду расейскіх СМІ: «Мала што там Тапалаў заявіў, Крамнік мусіў быў прыйсьці на 5-ю партыю. Гэта ж яго ная праца!» Здаровы клёк сьлесара-пэнсіянэра прасочваецца і ў плакхінскім пасланьні, адрасаваным шашачным аглядальнікам: «Усё, што датыкае шашак, — усё добра, усё на карысьць». Ягоны прынцып надзіва сугучны з сурвіллаўскім: «І ён беларус, і яна беларуска».

**ВР**

## Ваш ход

Плакхін—Сакалоў. Першынство СССР празь ліставаньне, 1957. Знайдзеце за белых шматхадовую камбінацыю (шашка h6 абягае ўсю дошку).



**Адказ:** 1. hg5! eg3 2. cd4 ce3 3. ab4 ac3 4. cb2 ca1 5. gf6 ag7 6. hh4X.

**Шашечный вестник № 5** / Авт.-сост. Василий Нагурный.— Дрогичин, 2006. — 52 с.

Выпуск, якога доўга чакалі (№4 выйшаў у 2004 г.). Гісторыя шашак, нарыс пра гросмайстра Георгія Пятровіча, чэмпіянаты Беларусі і сьвету — усяго ў карпатыўным часопісе патроху. Не абышлося без палемікі з украінскімі калегамі. Галоўны прыз конкурсу рашэньня задач, абвешчанага пінскім майстрам Аляксандрам Кагоцькам, — дармовая паездка ў Драгічын на фэст «Етвызь-2007».

Замовіць выданьне можна праз тэл. (8-01644) 2-04-99.

## СТАГОДЗЬДЗЕ «НАШАЙ НІВЫ»

**Выстава Міколы Купавы**

Запрашаем на выставу Міколы Купавы, прысьвечаную 100-годзьдзю беларускіх газэт «Нашай Долі» і «Нашай Нівы» ў Літаратурным музэі Максіма Багдановіча (вул.М.Багдановіча, 7а). Адкрыцьцё выставы — **20 кастрычніка а 18-й**.

## КАНЦЭРТ

**Тройца**

**29 кастрычніка** ў к/з «Менск» «Баброў» рэпрэзэнтуе вялікі сольны канцэрт легендарнага этна-трыё «Тройца». Пачатак а 19-й. Цана квіткоў ад 8 000 да 25 000. Даведкі: 649-08-88, 766-24-25.

## ВЫСТАВА

**Майстар празрыстасьці**

У Палацы мастатцва (вул.Казлова, 3) **да 29 кастрычніка** працуе выстава расейскага мастака Барыса Сьмірнова-Русецкага «Майстар празрыстасьці».

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

**Патаранскі прэзэнтуе кнігу**

**20 кастрычніка** на Сядзібе БНФ (вул. Машэрава, 8) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі вершаў Сяргея Патаранскага «Сэрца Бога — Беларусь». Удзел возьмуць бардэса Валерыя Кустава, паэты Алесь Сьпіцын, Наталя Кучмель, Галіна Дубянецкая.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**22 (ндз)** — «Паўлінка».
**25 (ндз)** — «Маэстра».
**23 (пн)** — «Чорная панна Нясьвіжу».
**26 (чц)** — «Смак яблыка».
**27 (пт)** — «Чычыкаў».
**28 (сб)** — «Таполевая завея».
**29 (ндз)** — «Дзіўная місіс Сэвідж».
*Малая сцэна*
**20 (пт), 21 (сб)** — «Варшаўская мэлёдыя».
**23 (пн)** — «Востраў Сахалін».
**26 (чц)** — «Саламея».
**28 (сб)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».




## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 21 кастрычніка

**«Лад», 09.00**

«Садко».

Расея (СССР), 1952, рэж. Аляксандар Птушко.

Казка паводле матываў анескіх былінаў.

Наўгародзец Садко вандруе па сьвеце, трапляе ў падводнае царства…

Казачны дыямэнт Аляксандра Птушко. Малады Фрэнсіс Форд Копала перамантажаваў фільм для амэрыканскага пракату.

«Срэбны леў сьв.Марка» на МКФ у Вэнэцыі.

Музыка Мікалая Рымскага-Корсакава.

**СТВ, 21.20**

«Малышка на міліён».

ЗША, 2004, рэж. Клінт Іствуд.

Драма.

Да старога трэнэра па боксе прыходзіць 30-гадовая жанчына. Яна жадае навучыцца трымаць удар…

Ролі выконваюць: Клінт Іствуд, Хілары Сўонк.

4 прэміі «Оскар», 2 «Залатыя глёбусы».

**БТ, 21.45**

«Анёл А».

Францыя, 2002, чорна-белы, рэж. Люк Бэсон.

Недарэка Андрэ, які ня ведае, куды падзецца ад крэдытораў-бандытаў, знаёміцца зь пекнаю бляндынкаю. Бляндыка па сумяшчальніцтве зьяўляецца анёлам-псыхааналітыкам.

Удалыя чорна-белыя кадры.

Ролі выконваюць: Жамэль Дэбуз, Ры Расмусэн.

**НТВ, 23.00**

«Гадзіны роспачы».

ЗША, 19990, рэж. Майкл Чыміна.

Трымценьнік.

Паўтор клясычнай стужкі 1955 году У.Уайлера, пастаўлены годным амэрыканскім рэжысэрам («Паляўнічы на аленяў», «Год цмока»).

Псыхапат уцёк з турмы — і з таварышамі атабарыўся ў звычайным доме. Гэта сталася кашмарам для гаспадароў.

**СТВ, 00.15**

«Баляда пра Джэка і Роўз».

ЗША, 2005, рэж. Рэбэка Мілер.

Псыхалягічная драма.

Пасьля сьмерці жонкі Джэк жыве з 16-гадовай дачкой. Ён усяляк адгароджвае дзяўчынку ад вонкавага сьвету. Аднойчы герой даведваецца, што сьмяротна хворы. Час навучыць дачку кантактаваць са сьветам. Але дзяўчына прагне помсты…

### Нядзеля, 22 кастрычніка

**НТВ, 17.05**

«Паляваньне на лісаў».

Расея (СССР), 1980, рэж. Вадзім Абдрашытаў.

Працоўны Віктар Бялоў жыве па завядзёнцы: праца, матацыкл, піўная, вайскова-спартовая гульня паляваньне на лісаў. Ён сутыкаецца з маладым пакаленьнем — і разумее, што яно не жадае жыць паводле ягоных правілаў. Гэта прыводзіць яго да духоўнага пералому.

Карціна пра магчымасьці асобы ў сытуацыі сацыяльнага прэсінгу.

Ролі выконваюць: Уладзімер Гасьцюхін, Ірына Мураўёва, Ігар Няфёдаў.

**«Лад», 21.20**

«Прынцэса і ваяр».

Нямеччына, 2000, рэж. Томас Тыквэр.

Мэлядрама.

Былы вайсковец, а цяпер злодзей, Бадо і мэдсястра з вар'ятні Сісі знайшлі адно аднаго….

Ролі выконваюць: Франка Патэнтэ, Бэна Фурман.

**АНТ, 21.35**

«Цяжкасьці перакладу».

ЗША, 2003, рэж. Сафія Копала.

Мэлядрама.

Боб і Шарлота ўпершыню сустрэліся ў Токіё. Яны ўцякаюць з гатэлю — і вандруюць па горадзе. Але ні ён, ні яна ня ведаюць японскай мовы…

Ролі выконваюць: Скарлет Ёхансан, Біл Мюрэй.

Прыз Вэнэцыянскага кінафэсту.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**АПОШНІ АДПАЧЫНАК**

Камэдыйная драма, ЗША, 2006, рэж. Ўэйн Ванг.

У ролях: **Кўін Лаціфа, Жэрар Дэпард'ё, ЛЛ Кул Джэй.**

Сьціплая гандлярка з Новага Арлеану даведваецца, што жыць ёй застаецца зусім ня шмат. Яна прыязджае ў Эўропу — і «ставіць на вушы» ўвесь пэрсанал гатэлю, дзе зьбірацца пражыць цэлае жыцьцё.

**Менск, Кісялёва 12, т.: 643-21-08**

# Дзякуй

**Уладзіславу В., Лявону Л.** зь Менскага раёну.

**Я.Ш., А.Х., Сяргею М., Зоі М., Леаніду А., Лявону Ц., Віктару М., Яўгену К.** з Маладачаншчыны.

**Барысу Я.** зь Нясьвіскага р-ну.

**Яўгену Б., Івану Х.** з Глыбоцкага р-ну.

**Ігару П., Уладзімеру М., Барысу Ф., Віктару А.** з Гомелю.

**А.К., Н.К., Дзьмітрыю С., Натальлі М., Андрусю Ш., Г.К., Канстанціну Ж., Аляксандру С., А.К.** з Горадні.

**Віталю Ц., Мікалаю П.** з Жлобіна.

**Анатолю П., Я.Т.** з Жодзіна.

**А.А., Настасьсі С., Вользе П., Алене С., С.А.** з Магілёва.

**Фёдару Г.** з Мазыра.

**Д.Н.** зь Мядзельскага раёну.

**Зоі К.** зь Менскай вобласьці.

**Уладзімеру В.** з Кобрынскага раёну.

**Анатолю П.** з Салігорску.

**Аляксандру Н.** з Слуцкага раёну.

**Юр'ю М., Ігару Л.** з Стаўпецкага р-ну.

**Віктару А., Вадзіму Б.** зь Сьветлагорску.

**Тамары К.** зь Бешанковіцкага раёну.

**Аляксандру Г., Уладзімеру Ц.** з Лагойскага раёну.

**Андрэю Г., Сяргею Т., С.Д.** зь Лідзкага раёну.

**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.

**П.Г.** з Мастоўскага раёну.

**Зьмітру Ш., Уладзімеру Г., М.К., Андрэю Б., Алесю Р.** з Наваполацку.

**Сяргею У.** з Бабруйску.

**Алесю Б., Руслану Г., Сяргею С.** з Баранавічаў.

**Галіне Г., Сяргею С.** з Барысава.

**Мікалаю В., С.Р., Т.Ш.** зь Бярозаўскага раёну.

**Сяргею Л., Віктару Ф., Тамары Ф.** зь Берасьця.

**Арсеню Д.** зь Берасьцейскага раёну.

**А.К.** з Воршы.

**Андрэю Н., Міхаілу Б., Лявонцію А.** з Полацку й раёну.

**Уладзімеру З.** зь Пінску.

**І.Г.** з Смалявіцкага раёну.

**Вікенцію С., Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёну.

**Канстанціну К., Восіпу К.** з Шаркаўшчынскага раёну.

**А.Б., Аляксандру П., Максіму П., Алене Д., В.Ю., Ахісу З., А.В., Аляксандру Б., Аляксандру Г., Аляксандру Ф., Валерыі Ч., Натальлі Л., Уладзімеру К., Лідзіі І., Рыце Н., Віктару К., Сяргею Ф., Людміле Ц., Натальлі А., К.З., Уладзімеру Н., Эле С., К.М., В.К., Віталю К., Паўлу Ч., Кацярыне Дз., Івану К., Якубу Л., Людміле І., А.К., Сяргею Ш., Але Т., Ігару Д., Міхалу К., Сяргею Б., В.Я., Леаніду Л., Міхалу Л., Валянціне П., Тамары П., З.А., Валянціне Л., С.В., Натальлі Д., Вадзіму Г., Юр'ю Л., Віталю Ч., Віталю С., А.Ц., Л.Б., Юр'ю М., Паўлу Л., Віктару К., Уладзімеру К., Натальлі К., А.Л., Аляксандру М., Галіне Р., Міхалу Б., Алене К., Юр'ю Я., Ільлі Ч., Уладзімеру Г., Аляксандру Е., Уладзімеру К., Ігару Б., Уладзімеру Б., М.А.** зь Менску.

---

Дыяна Леанідаўна зь Менску, паведаміце, калі ласка, нумар сваёй кватэры.

М.В.Е. з вуліцы 17 верасьня, удакладніце адрас.

С.В.А. з Радашкавічаў, дашліце дакладны адрас.

---

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3015 212 000 012 Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3015 212 000 012 Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

---

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18000 рублёў за раз, забясьпе-чаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 36000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

**...Садружнасьць незалежных дзяржаваў была рэфармаваная паводле мадэлі Асацыяцыі ананімных алькаголікаў...**

— Калегі прэзыдэнты, я інтэграцыйны алькаголік, я хранічна інтэгруюся з 38 гадоў і ня ведаю, як пазбавіцца ад гэтай хваробы...






**...Сідорскага зашугалі словы АРЛ аб тым, што яго ўрад можа пайсьці ў адстаўку, калі беларускія курцы не пачнуць аддаваць перавагу айчыннаму вырабніку тытунёвай прадукцыі...**

**...Цэны на будоўлі былі ўзятыя пад жастачайшы кантроль...**

— У мэтах памяншэньня цэнаў на жытло як афіцыйная асоба патрабую, каб гэтую скрыню скрадзеных з будоўлі цьвікоў прадалі прыватніку не за дзьве, а за адну пляшку «Асеньняга букету».



МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

# літаратурНы сшытак «НН»

кастрычнік 2006


Архан Памук. Сьнег ........ 16

Барыс Дубін. Раман-цывілізацыя, або Вернутае мастацтва Шахеразады ........ 18

«Беларус ня можа атрымаць Нобэля, бо нашыя пісьменьнікі адсталі ад рэальнасьці». Апытаньне «НН» ... 19

Ян Запруднік. І сказаў Бог беларусу… ........ 27

Не мычыце, Францаўна. Апавяданьне Паўла Касьцюкевіча ........ 28

Мужчынскі футбол жаночымі вачыма. Фотарэпартаж Юліі Дарашкевіч з матчу Беларусь—Славенія ........ 30

Цунамі. Вершы Андруся Храпавіцкага ........ 32

Кожнаму свая цыбуліна. Эсэ Пётры Садоўскага ........ 34

Кактэйль Молатава. Эсэ Сяргея Астраўца ........ 38

Старонкі вершаванага радка. Юзік Дзенісюк, Алесь Макрацоў, Зьміцер Панкавец ды іншыя ........ 40


## Сабачыя гісторыі

Аднаму Сабаку і сёлета не далі Нобэля. Граждан, даведаўшыся пра гэта, сказаў: «А ўсё-ткі не дарэмна я пісаў у органы на гэтага аплода капіталу...»

***

Адзін Сабака, даведаўшыся, што Шніп выдаў новую кнігу, пайшоў у кнігарню. А Граждан заплакаў: «А быў жа такі харошы пацан! Прадаўся, як дзевачка...»

***

Адзін Сабака ўступіў у СБП, другі Сабака — у СПБ. А Граждан, ідучы на працу, уступіў у фэкаліі невядомай вытворчасьці.

***

Адзін Сабака ахвяраваў грошы на выданьне «НН». Граждан прыйшоў да Сабакі і сказаў: «Я столька лет страдаю ад савецкай уласьці, а мне толькі мэдалі даюць...»

***

Адзін Сабака ў Фядуты ўзяў аўтограф. А Граждан украў шапку.

***

Адзін Сабака прыйшоў на магілку і паклаў кветкі на магілу Быкава. Граждан прыйшоў п’яны і сказаў: «Судар, вы маё места занялі...»

**ВА**

# А ты падпішыся!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 46.**

## ПАШТ. СКРЫНКА

**Віктару В-ку, Зьмітру Ж-ку.** Вершаў друкаваць ня будзем. Пры моцным пачуцьці, укладзеным у іх, яны тэхнічна слабыя.

**Хведару С-му, Сыну Беларускаму.** А ну дашлеце яшчэ жменю вершаў, мо тамака што будзе вартае паперы. Толькі каб без выкрунтасаў дзеля выкрунтасаў.

**Аляксею Ш. зь Менску.** Калі ў Рэдакцыю трапляе якое выданьне мінулых гадоў, пра якое ніхто ніколі ў «НН» не пісаў, дык мы лічым вартым хоць параю радочкаў яго згадаць.


ТДА «Юніёнлайн» і Антось Астаповіч запрашаюць у вандроўку 04.11 — 06.11. Коўна — Кейданы — Вільня. Выезд 4.11.2006 у 23.30, вяртаньне 6.11.2006 у 24.00. Кошт: 45 эўра + 30 000 беларускіх рублёў разам зь візамі, экскурсійным суправаджэньнем, музеем Чурлёніса, пражываньнем і сьняданкам.

Ліц.№02310/0277540 ад 24.02.2006



ТДА «Юніёнлайн» і Антось Астаповіч запрашаюць у вандроўку 29.10.2006. **Блонь — Сьвіслач — Бабруйск — Жылічы — Красны Бераг.** Працягласьць вандроўкі — 14 гадзін (з 8-й па 22-ю). Кошт: 30 000 беларускіх рублёў

Ліц. №02310/0277540, выдадзеная 24.02.2006


Шчыра смуткуем з прычыны сьмерці нашага заўсёднага чытача **Адольфа Суботы** (1925—2006), які жыў у ЗША, штат Нью-Джэрзі. Зямля яму пухам.

Рэдакцыя

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Двор Дольцы, Мінск. губэрні Барысаўск. пав.** 29 сернпя (аўгуста) у нашай капліцы на Яна Калільніка быў хвэст. Сабралося многа народу — шляхты і сялян з усей ваколіцы. Пад вечар тутэйшы паніч Эдвард Сушчынскі ўстроіў у двары Дольцах беларускі тэатар. Ігралі камэдыю «Міхалка». Выйшла яна надта спрытна, бо сыграла яе зь вялікім жыцьцём тутэйшая маладзеж. Затым сыгралі яшчэ і «Моднага Шляхцюка», надта пацешную камэдыю. Гаспадара Яна іграў Эдвард Сушчыншчык, асабліва гасьцям спадабалася, як Ян палажыўся быццам спаць, прыкрыўшыся кажухом, і захрапеў, з прасоньня скрэбаўся ад блох.

**«Наша Ніва». 1911. №37-38**


# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, аднооўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2721. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 18.10.2006.
Замова № 5835.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.